# Пытаньні талерантнасьці:

**гісторыя, сучаснасьць, персьпектывы**

# ТОМАШУ ВАЦКУ ПРЫСЬВЯЧАЕЦЦА

Томаш Вацка, сябра Нарвежскага Хельсінкскага камітэту, актыўна супрацоўнічаў і сябраваў з Праваабарончым цэнтрам “Вясна”. 1-3 траўня 2003 году ён прыязджаў у Беларусь і браў удзел у міжнароднай канферэнцыі “Пытаньні забесьпячэьння роўнасьці этнічных, культурных і іншых меншасьцяў у краінах Еўропы”. Гэта быў апошні раз, калі мы з ім бачыліся.

Праз месяц, у пачатку чэрвеня, Томаша Вацкі ня стала…

Вестка пра сьмерць нас балюча ўразіла. Няшмат такіх людзей на Захадзе, як Томак, шчырых, адкрытых, сапраўды хвараючых за дэмакратыю ў Беларусі. Разуменьню ім сітуацыі ў Беларусі спрыяла тое, што і сам ён яшчэ ў 80-я гады, жывучы ў Польшчы, браў актыўны ўдзел у “Салідарнасьці” і агулам адседзеў за сваю палітычную дзейнасьць за кратамі больш за два гады.

Пераехаўшы на пачатку 90-х з сям’ёю ў Нарвегію, ён дапамагаў, а часта і абараняў там інтарэсы дзьвюх пакрыўджаных нацыяў былога Савецкага Саюзу – беларусаў і чачэнцаў. З яго ініцыятывы ў 2001 годзе ў Осла былі арганізаваныя дзьве канферэнцыі па Беларусі, на якіх прысутнічалі прадстаўнікі беларускіх апазіцыйных дэмакратычных партыяў і няўрадавых арганізацыяў. Ён выступаў у ролі эксперта па беларускіх справах у нарвежскіх СМІ, а таксама перад нарвежскім урадам. Такі ягоны інтарэс да Беларусі тлумачыўся яшчэ тым, што маці ягоная паходзіла з Гродна.

Будучы гісторыкам па адукацыі, ён цікавіўся гісторыяй і культурай Беларусі, добра разумеючы постсавецкія праблемы ў нацыянальным разьвіцьці. Кожны раз, бываючы ў Беларусі, ён адведваў Курапаты.

Гэтая кніжка – нашая даніна памяці Томашу Вацку.

Фрагмент выступу Томаша Вацкі падчас міжнароднай канферэнцыі “Пытаньні забесьпячэньня роўнасьці этнічных, культурных і іншых меншасьцяў у краінах Еўропы”:

“На працягу 20-га стагодзьдзя стаўленьне да нацыянальных меншасьцяў у Нарвегіі мянялася. Цяпер у Нарвегіі ўсе нацыянальныя меншасьці атрымліваюць грошы на падтрымку сваёй культуры. Але так было не заўсёды. Яшчэ да 70-х гадоў 20-га стагодзьдзя ўрад Нарвегіі веў жорсткую палітыку ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў. Напрыклад, існаваў закон, што арэндаваць зямлю маглі толькі людзі, якія размаўляюць па-нарвежску. Праводзілася дзяржаўная палітыка, накіраваная на асіміляцыю, -- прадстаўнікам нацыянальных меншасьцяў не дазвалялі размаўляць

на роднай мове, стваралі школы, дзе дзяцей навучалі выключна на нарвежскай мове.

Адной з нацыянальных меншасьцяў, якая падвяргалася дыскрымінацыі, зьяўляліся цыганы. Яны вандравалі па ўсёй краіне. Былі прынятыя дзяржаўныя праграмы, якія былі накірваныя на тое, каб прымусіць цыганоў весьці аседлы лад жыцьця. Іх лічылі непаўнавартаснымі людзьмі. Да тых, хто не хацеў падпарадкоўвацца законам і жыць у адным месцы, уводзіліся асабліва жорсткія меры. Так, у трыццатыя гады Нарвежскі парламент прыняў закон аб стэрылізацыі. Рэальнасьцю сталі факты, калі стэрылізацыі падвяргаліся жанчыны. Да некаторых, каго лічылі крымінальнымі элементамі, ужывалі іншыя метады медыцынскага ўмяшальніцтва – лабатамію. І гэтая практыка, на жаль, працягвалася да 70-х гадоў 20-га стагодзьдзя. У 1951 годзе ўрад прыняў рашэньне, паводле якога цыганам забаранялася мець коней і вандраваць. Мэтай гэтага было заснаваньне “прыстойнага, чыстага грамадзтва”, у якім усе былі б “аднолькава добрыя”. Варта падкрэсьліць, што гэтая палітыка скончылася ў канцы 70-х гадоў. Цяпер урад Нарвегіі ўсьвядоміў свае памылкі і зьмяніў палітыку. І ўсе гэтыя людзі, якія пацярпелі ў тыя гады, могуць атрымаць матэрыяльную кампенсацыю ад дзяржавы. Але ніякіх грошай ня хопіць, каб кампенсаваць тое, што ў іх няма дзяцей”.

# УСТУП

Гэтая кніжка зьяўляецца вынікам сумеснага праекту “Пытаньні талерантнасьці ў беларускім грамадзтве і сьвеце”, над якім на працягу 2003-2004 гадоў працавалі Швецкая арганізацыя Міру і Арбітражу (Svenska Freds) і Праваабарончы цэнтр “Вясна” (Беларусь). У межах гэтага праекту прайшлі дзьве канферэнцыі з удзелам як беларускіх, так і замежных экспертаў (швецкіх, нарвежскіх, польскіх і г.д.), і чатыры рэгіянальныя семінары – у Магілёве, Брэсьце, Наваполацку і Гомелі.

Талерантнасьць ва ўсіх яе праявах стала асноўнай тэмай дыскусіяў удзельнікаў сустрэчаў. Абмяркоўвалася, як трэба захоўваць сваю тоеснасьць і паважаць тых, чый лад жыцьця і сьветапогляд адрозьніваюцца ад твайго, якім чынам можна пазьбегнуць нецярпімасьці ў розных яе праявах – гамафобіі, ксенафобіі, вырашыць канфлікты, народжаныя гэтымі адрозьненьнямі.

Чаму менавіта гэтая тэма была абраная для вывучэньня беларускімі праваабаронцамі і швецкімі міратворцамі? Бралася пад увагу, што ў постсавецкіх краінах, да якіх адносіцца і Беларусь, ва ўмовах пераходнага грамадзтва праблема разьвіцьця талерантнасьці як спосабу перадухіленьня канфліктаў даволі вострая. Краіны перажываюць мноства праблемаў, у тым ліку – зьвязаных з неабходнасьцю пераадоленьня стэрэатыпаў сацыяльнай і этнічнай нецярпімасьці, якія існуюць у масавай сьвядомасьці, часта правакуючы вострыя канфлікты.

Улічваўся і той асьпект, што Беларусь стала суседкай Еўрапейскага Союзу, дзе існуюць распрацаваныя і эфектыўна ўжывальныя стандарты правоў нацыянальных, рэлігійных ды іншых меншасьцяў.

Выявілася, што праблемы суіснаваньня ў беларускім грамадзтве розных групаў – нацыянальных, рэлігійных, культурных, сацыяльных і іншых – не вырашаныя, а хутчэй прыглушаныя. Падчас працы над праектам канцэнтравалася ўвага менавіта на гэтых праблемных сітуацыях, якія патэнцыйна могуць быць небясьпечнымі для сацыяльнай стабільнасьці грамадзтва. Каб іх прадухіліць, – гэтыя пагрозы трэба ведаць.

Цікавым аказаўся вопыт дэмакратычных еўрапейскіх краінаў, іх разуменьне талерантнасьці і магчымасьцяў вырашэньня канфліктаў. У гэтым сэнсе прыклад, які прэзентавала Svenska Freds, можа быць для Беларусі павучальным. Па швецкіх законах трэба паважаць тых, чый лад жыцьця і сьветапогляд адрозьніваюцца ад твайго, але, на жаль, у жыцьці не заўсёды так бывае. Таму і для Svenska Freds наш сумесны праект быў вельмі цікавым і карысным. Беларусь павінная прайсьці свой

шлях, але мы павінныя ведаць, што існуюць цывілізаваныя, дэмакратычныя, негвалтоўныя шляхі пераадоленьня нецярпімасьці, вырашэньня канфліктаў, якія існуюць у грамадзтве.

Паўліна Клюге -- Svenska Freds

Тацяна Рэвяка – Праваабарончы цэнтр “Вясна”

P.S. У кнізе зьмешчаныя даклады, якія прагучалі на канферэнцыях і семінарах, інтэрвью з дакладчыкамі, а таксама іншыя матэрыялы на дадзеную тэматыку, падрыхтаваныя Праваабарончым цэнтрам “Вясна”.

# "ЛЮБІШ СВАЁ, ПАВАЖАЙ І ЧУЖОЕ. ЛЮБІШ ЧУЖОЕ, ШАНУЙ І СВАЁ..."

**Валянцін Стэфановіч**, юрыст

Памятаю, як падчас выкладаньня ў Беларускім гуманітарным ліцэі курсу, прысьвечанага правам чалавека, я прапанаваў вучням цікавы эксьпэрымент. Кожны мусіў напісаць на паперцы тое, што ён любіць, і назваць нейкую асаблівасьць сваёй зьнешнасьці. Напрыклад: я руды і я люблю марозіва, а ён чарнявы і любіць катоў. Урэшце, калі ўсе паперкі былі сабраныя, атрымалася, што кожны з нас валодае нейкімі ўласьцівымі толькі яму асаблівасьцямі і прыхільнасьцямі, некаторых было болей, некаторых меней, але ў той самы час кожны ўяўляў пэўную меншасьць. Пры гэтым усе вучні разам суіснавалі ў адным калектыве. У нейкім сэнсе атрымалася міні-мадэль грамадзтва.

На пачатку 90-х гадоў у Беларусі актыўна ўжываўся тэрмін "талерантнасьць". Пры гэтым вельмі часта ў гэты тэрмін укладаўся іншы сэнс. Талерантны беларус – абыякавы да іншых і ў першую чаргу -- да сабе, свайго лёсу, лёсу сваёй нацыянальнай культуры, мовы, краіны. Хаця насамрэч талерантнасьць азначае іншую, актыўную грамадзянскую пазіцыю і, безумоўна, зьяўляецца здабыткам сапраўды дэмакратычнага, адукаванага і высьпелага грамадзтва.

Увогуле талерантнасьць наўпрост зьвязаная з асновамі тэорыі правоў чалавека: усе народжаныя роўнымі і маюць роўныя правы незалежна ад іх нацыянальнай, рэлігійнай ці сацыяльнай прыналежнасьці. Сёньня талерантнасьць – гэта элемент сучаснай культуры, культуры стасункаў паміж людзьмі, паміж грамадзянамі і дзяржавай. Талерантнасьць – гэта каштоўнасьць і сацыяльная норма грамадзянскай супольнасьці, якая праяўляецца ў праве ўсіх грамадзянаў быць рознымі: забесьпячэньні ўстойлівай гармоніі паміж рознымі канфесіямі, палітычнымі, этнічнымі, сацыяльнымі і іншымі групамі; павазе да разнастайнасьці розных сусьветных культураў, цывілізацыяў і народаў; гатоўнасьці да разуменьня і супрацоўніцтва з людзьмі, якія розьняцца зьнешне, мовамі, перакананьнямі, звычаямі і веравызнаньнямі. Менавіта талерантнае грамадзтва – гарантыя ўстойлівага разьвіцьця дзяржавы, гарантыя грамадзянскага кансэнсусу і дыялогу.

Адпаведна, недэмакратычныя краіны культывуюць у грамадзтве ксенафобію, страх перад "іншымі". У такіх краінах улады часта знаходзяць прычыны бедаў і няўдачаў у пошуках унутраных ворагаў, у ролі якіх могуць быць і палітычныя апаненты, і прадстаўнікі пэўных нацыянальных, расавых, рэлігійных ці сацыяльных

групаў. У сувязі з тым, што ў такіх краінах бракуе незалежнай інфармацыі, грамадзкага дыялогу, грамадзкія супольнасьці знаходзяцца пад моцным уплывам самых розных стэрэатыпаў. Рэжымы вельмі актыўна выкарыстоўваюць гэтыя стэрэатыпы ў сваіх карысьлівых мэтах, мэтах утрыманьня бязьмежнай улады.

Тыповым такім грамадзтвам можна назваць СССР — доўгі час зачыненую краіну, з жорсткім таталітарным рэжымам, з адзінай пануючай камуністычнай ідэалогіяй, адзінай палітычнай партыяй -- КПСС. У СССР не было месца для іншадумцаў – усе яны ў розныя часы былі ворагамі народу, “адшчапенцамі”, антысацыяльнымі элементамі. Неталерантнасьць савецкіх людзей да “іншых” была амаль дзяржаўнай ідэалогіяй і глыбока засела ў галовах савецкіх людзей. Памятаеце знакамітае: “Сегодня он играет джаз, а завтра Родину продаст”? А паляваньні камсамольцаў на “валасацікаў” і “стылягаў”? З гэтай нагоды ўзгадваецца выпадак зьбіцьця “афганцамі”, нацкаванымі сьпецслужбамі, беларускамоўнай моладзі, якая праводзіла народнае сьвята “гуканьне вясны” ў цэнтры Менску ў 1985 годзе. Іх жорстка зьбівалі таму, што яны размаўлялі па-беларуску, былі “іншымі”, “нефармаламі”, “нацыяналістамі”.

Перад самым распадам СССР у 1991 годзе нацыянальныя і сацыяльныя супярэчнасьці ў шэрагу рэгіёнаў вялікай краіны прывялі да адкрытых праяваў ксенафобіі, ваяўнічага нацыяналізму, шавінізму. Шмат у чым гэта стала вынікам той нацыянальнай палітыкі, якая доўгія гады праводзілася кіраўніцтвам СССР. Разам усе гэтыя фактары прывялі да ўзброеных канфліктаў на нацыянальнай і рэлігійнай глебе ў некаторых рэгіёнах СССР: Нагорна-Карабахскі канфлікт, Прыднястроўе, Абхазія, праблемы, зьвязаныя з туркамі-месхецінцамі ў краінах Сярэдняй Азіі і інш. Гэтыя канфлікты суправаджаліся людзкімі стратамі, падчас іх актыўна выкарыстоўваліся старыя нацыянальныя стэрэатыпы, чуткі і г.д.

Беларусь на гэтым фоне зьяўляецца краінай, дзе востра не стаяць пытаньні міжнанацыянальных і міжрэлігійных стасункаў. Але ці можна ў сувязі з гэтым сьцьвярджаць, што нашае грамадзтва дужа талерантнае і што ўрад Беларусі праводзіць талерантную палітыку да розных меншасьцяў, прадухіляе праявы дыскрымінацыі ў адносінах да іх, усяляк прапагандуе паважнае стаўленьне да іх з боку іншых грамадзянаў?

Заўсёды сьцвярджалася, што беларусы спрадвеку былі народам талерантным і цярпімым да іншых нацыянальнасьцяў і рэлігійных групаў.

Шмат у чым з гэтым тэзісам можна пагадзіцца: сапраўды, беларусы на працягу стагодзьдзяў суіснавалі з рознымі нацыянальнымі і рэлігійнымі групамі на адной

тэрыторыі, суіснавалі пераважна мірна. І гэта сапраўды вялікі здабытак нашага народу і нашай гісторыі. Аднак былі ў нашай гісторыі і выпадкі супрацьстаяньня каталіцкай і праваслаўнай, а пазьней і ўніяцкай цэркваў, факты антысеміцкага зьместу.

Тыповым прыкладам дзіўнай неталеранцыі беларусаў можна назваць неталерантнасьць “гарадзкіх” беларусаў да беларусаў “калгасьнікаў” – выхадцаў з сельскай мясцовасьці. Безумоўна, гэтая зьява шмат у чым была вынікам палітыкі русіфікацыі беларусаў, якая праводзілася ў БССР, прычым грунтавался яна ня толькі на сацыяльных, а ў большай ступені на моўных адрозьненьнях. Менавіта гэта і прывяло да аднаго з самых асноўных комплексаў непаўнавартасьці сучасных беларусаў – комплексу нацыянальнага самаадмаўленьня, нацыянальнай і моўнай недасканаласьці ў сьвядомасьці большасьці беларусаў. Вось і А.Лукашэнка, зьяўляючыся самым тыповым прадстаўніком генерацыі савецкіх беларусаў, аднойчы сказаў, што ў сьвеце ёсьць толькі дзьве вялікія мовы: руская і англійская, а на беларускай мове нельга выказаць высокіх думак.

Калі вярнуцца да сучаснай сітуацыі ў Беларусі, дык можна прыгадаць даволі частыя за апошня гады выпадкі зьбіцьця замежных студэнтаў, праявы антысемітызму, рэлігійнай нецярпімасьці, нецярпімасьці да пэўных сацыяльных слаёў насельніцтва, да іншадумства.

Безумоўна, на ўзроўні Канстытуцыі Беларусі і іншага нацыянальнага заканадаўства ўсім меншасьцям краіны гарантаваныя роўныя правы. Але што мы бачым на практыцы? Апошнія зьмены ў закон аб рэлігіях прывялі да таго, што некаторыя рэлігійныя плыні падвяргаюцца сур’ёзнай дыскрымінацыі. Атрымліваецца, што адна царква зьяўляецца больш “традыцыйнай” за іншыя. Сьвятароў адной царквы дапускаюць да служэньня ў войска, а іншым не дазваляюць праводзіць набажэнствы нават у прыватных кватэрах, таму што яны “нетрадыцыйныя” і незарэгістраваныя.

У першую чаргу дыскрымінацыя закранула некаторыя групы пратэстанцкіх цэркваў, крышнаітаў, індуістаў. Пры гэтым у грамадзтве трывае сталая думка пра тое, што ўсе яны “сектанты”, якія нясуць шкоду грамадзтву, шмат хто лічыць, што іх наогул трэба забараніць. Фіксуюцца таксама выпадкі антысемітызму, непрыязнага стаўленьня да іншых нацыянальных меншасьцяў. Апошнім часам у Беларусі актывізаваліся групы гэтак званых скінхэдаў — моладзевых груповак, якія прапагандуюць расавую і нацыянальную нецярпімасьць. У Віцебску, Гомелі, Менску былі выпадкі нападаў скінхэдаў на замежных студэнтаў. Кітайскія студэнты нават

былі вымушаныя зьвярнуцца ў амбасаду КНР з просьбай забясьпечыць іх бясьпеку. Студэнты-замежнікі Менскага медінстытуту правялі пікет з нагоды пастаянных нападаў на іх групаў скінхэдаў. У Гомелі на глебе расавай розьні ў адным з інтэрнатаў для замежных студэнтаў быў забіты 18-гадовы жыхар гораду. У Віцебску ўпершыню да крымінальнай адказнасьці за злачынства, зьдзейсьненае на глебе нацыянальнай і расавай варожасьці, былі прыцягнутыя некалькі грамадзянаў Беларусі, удзельнікаў скінхэдаўскіх груповак, якія рэгулярна займаліся зьбіцьцём студэнтаў з краінаў Афрыкі і Азіі.

Вядома, асноўная задача дзяржаўнай улады ў такіх выпадках -- прадухіляць падобныя злачынствы, праводзіць іх своечасовую прафілактыку. Вялікую ролю ў прапагандзе ідэяў талерантнасьці маглі б адыграць няўрадавыя арганізацыі і незалежныя сродкі масавай інфармацыі. Аднак у сёньняшняй сітуацыі, калі большасьць НДА і незалежных СМІ ліквідаваныя ўладамі, праводзіць падобную працу амаль немагчыма.

На жаль, трэба адзначыць, што ў краіне ізноўку шукаюць унутраных ворагаў, навешваюць ярлыкі, ствараюць фальшывыя стэрэатыпы. І гэта тычыцца ня толькі палітычных апанентаў рэжыму. Апошнім часам можна пачуць і негатыўныя выказваньні на адрас некаторых групаў меншасьцяў. Зноўку, як у савецкім мінулым, гучаць словы пра тое, што польская меншасьць зьяўляецца своеасаблівай пятай калонай у Беларусі, а выдавецтва “Праваслаўная кніга” друкуе кнігу “Вайна па законах подласьці”, якая ўтрымлівае адкрытыя антысеміцкія выказваньні. Дзяржава актыўна пачынае ўмешвацца ў дзейнасьць арганізацыяў нацыянальных меншасьцяў, нараджаючы нікому непатрэбныя міжнародныя канфлікты і напружаньне з суседнімі краінамі.

Сітуацыя з “Саюзам палякаў на Беларусі” таму яскравы прыклад. Дзяржава ў асобе Міністэрства юстыцыі спачатку вырашае за сяброў гэтага аб’яднаньня, хто будзе іхнім кіраўніком, не прызнаючы зьезд, на якім было абранае новае кіраўніцтва. Затым па дзяржаўным тэлебачаньні дэманструюць прапагандысцкі фільм “Хто замовіў Саюз палякаў”, у якім “выкрываецца варожая сутнасьць” гэтай арганізацыі. Вядома, што такія дзеяньні ўладаў не ідуць на карысьць польска-беларускім стасункам, ствараюць у грамадзтве вобраз ворага ў выглядзе польскай нацыянальнай меншасьці. У выніку ўрад Польшчы забараняе ўезд у краіну шэрагу чыноўнікаў Беларусі, у тым ліку і міністру юстыцыі Галаванаву.

Роля дзяржавы ў прапагандзе талерантнасьці вельмі вялікая, аднак трэба адзначыць, што шмат у чым гэта залежыць яшчэ і ад элементарнай асабістай

культуры кожнага чалавека. Праявы неталерантнасьці можна сустрэць і ў краінах сталай дэмакратыі. Пераадоленьне стэрэатыпаў залежыць ад цябе самога. Прыгадайце, хіба вы ніколі не адчувалі нічым неабгрунтаваную непрыязнасьць да чалавека толькі таму, што ён “іншы”, не такі як вы, як усе? Магчыма, вы адчувалі непрыязнасьць да пэўнай нацыянальнасьці ці сацыяльнай групы. Упэўнены, што большасьць з вас адкажа: так.

Мы вельмі часта знаходзімся ў палоне распаўсюджаных у грамадзтве стэрэатыпаў і не задумваемся пра тое, што чалавек у залежнасьці толькі ад ягоных асабістых якасьцяў, а не ад ягонай нацыянальнай, рэлігійнай ці сацыяльнай прыналежнасьці, зьяўляецца добрым ці дрэнным. Неталерантнымі, агрэсіўнымі бываюць ня толькі скінхэды, імі могуць быць і хатнія гаспадыні. Колькі разоў даводзілася чуць у прыватных гутарках, у кампаніях, як якое-небудзь дзяўчо ці хлапчук лёгка ўжываюць абразьлівыя словы “хахлы”, “хачыкі” і г.д. Яны не задумваюцца над тым, што гэтым можна пакрыўдзіць чалавека, які будзе побач.

“Любіш сваё, паважай і чужое. Любіш чужое, шануй і сваё” – сьпяваюць у адной з песень украінскі гурт “Скрабін” і беларускі “Крамбамбуля”. І гэта сапраўды добры жыцьцёвы дэвіз, дэвіз талерантнасьці.

# ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ = ЦЯРПІМАСЬЦЬ = ЦЯРПЛІВАСЬЦЬ?

**Кавальчук Тацяна**, юрыст

*У сучасным шматкультурным грамадзтве кафмортна будзе сябе адчуваць толькі чалавек, які не хварэе “герметызмам душы” і гатовы аддаць перавагу невычарпальнай разнастайнасьці перад манатонным паўтарэньнем.*

*Хосэ Артэга-і-Гасэт*

Мэтай гэтага артыкулу не зьяўляецца раскрыцьцё ўсіх магчымых тэарэтычных і практычных праблемаў талерантнасьці ў Беларусі. Гэта -- спроба кінуць грамадзкі позірк на праблему, якая ўяўляецца цікавай і неадназначнай, і дасьледваньне якой, мяркуецца, мае вялікае значэньне для самаідэнтыфікацыі беларусаў і гарманічнага разьвіцьця беларускага грамадзтва.

“Дык якія вы, беларусы? Чым адрозьніваецеся ад іншых?” – на такое пытаньне вялікая колькасьць абывацеляў-беларусаў адказвае: “Мы – людзі талерантныя”. Праўда, ёсьць і іншая частка, якая адказвае аналагічна, аднак дадае да прыметніка “талерантныя” ўдакладненьне “занадта” і выказваецца ўжо з выразам жалю на твары і ўнутраным пачуцьцём сораму, замяшаным на трывалай непрыязнасьці да сябе як прадстаўніка народу.

На першы погляд, так і ёсьць -- талерантныя. Беларускія афіцыйныя СМІ ў адзін голас і пастаянна, неафіцыйныя – паасобку і перыядычна высьвятляюць талерантнасьць беларусаў, прызнаючы наяўнасьць і яркую выразнасьць гэтай рысы ў менталітэце беларусаў за аксіёму. Прычым звычайна ня робіцца спробаў даць азначэньне той талерантнасьці, якую маюць на ўвазе аўтары артыкулаў і інтэрнэтаўскіх постаў, паняцьце вымалёўваецца асацыятыўна і зводзіцца ў станоўчым рэчышчы да цярпімасьці і загадкавай беларускай памяркоўнасьці, а ў негатыўным – да гіпертрафаванай цярплівасьці, абыякавасьці, здольнасьці прыстасоўвацца да любых умоваў, агульнай ці сітуацыйнай канформнасьці. Устойлівая, сканструяваная за доўгія часы ідыялагема пастаянна падтрымліваецца і вельмі рэдка падвяргаецца крытычнаму аналізу.

На сайце www.prezident.gov.by, афіцыйным рупары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь іправадніку ягонага разуменьня асаблівасьцяў і арыентыраў жыцьця краіны, можна знайсьці менавіта такое аксіёматычнае стаўленьне да беларускай талерантнасьці. Так, у сьпісе выступаў кіраўніка дзяржавы за 2003 год знаходзіцца

цікавы дакумент – даклад на семінары кіруючых работнікаў рэспубліканскіх і мясцовых дзяржаўных органаў па пытаньнях удасканаленьня ідэалагічнай працы. У разьдзеле “Беларусь і беларусы ў сучасным сьвеце. Сьветапоглядная аснова беларускай дзяржаўнай ідэалогіі” Аляксандр Лукашэнка, канстатуючы кансерватыўны склад беларускага характару, выказвае такую думку, што “дзякуючы сваім нацыянальным якасьцям, а менавіта талерантнасьці, “памяркоўнасьці”, нясьпешнасьці, асьцярожнасьці, а таксама гістарычнаму досьведу (беларусы, як заходні фарпост Расіі ў выніку кантактаў з Захадам даўно выпрацавалі ў сабе імунітэт супраць іншацывілізацыйнага ўплыву), беларускі народ не дазваляезачараваць сябе прыгожай дэмагогіяй пра ліберальныя каштоўнасьці”. Пры гэтым падкрэсьліваецца, што пазначаныя вышэй рысы ўласьцівыя беларусам ад прыроды. Вызначэньня талерантнасьці аўтарам дакладу не даецца, аднак падкрэсьліваецца пасіўна-абарончае сэнсавае напаўненьне слова, гэтая рыса падаецца як прыродны слушны спосаб мірнай абароны беларусаў ад быццам бы шкодных і небясьпечных іншакультурных узьдзеяньняў.

Як аказваецца, такое разуменьне, за пэўнымі выключэньнямі, пануе фактычна і ў галовах значнай колькасьці шараговых беларусаў.

У якасьці ілюстрацыі можна зьвярнуцца да вынікаў тых нешматлікіх дасьледваньняў праблемаў талерантнасьці, якія праводзіліся ў Беларусі, напрыклад, дасьледваньняў навуковага калектыву “Славяне” Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэту, праведзеных у 1998 годзе і прэзентаваныхна міжнароднай навуковай канферэнцыі “Менталітэт усходніх славянаў: гісторыя, сучаснасьць, персьпектывы” ў 1999 годзе ў Гомелі. Навукоўцы правялі апытаньне беларусаў, украінцаў і расіянаў – жыхароў адпаведна Гомельскай, Чарнігаўскай і Бранскай абласьцей. Усім рэспандэнтам задавалася пытаньне: “Ці лічыце Вы беларусаў талерантнымі?” безякога-небудзь тлумачэньня самога гэтага паняцьця. У выніку аказалася, што талерантнымі беларусаў лічаць 52,9% жыхароў Гомельшчыны, 34,7% апытаных украінцаў і 25% расіянаў.

Зыходзячы з таго, што больш за 50% беларусаў палічылі сябе за талерантную нацыю, можна хаця б прынцыпова, не прэтэндуючы на вялікую дакладнасьць, меркаваць, што пры апытаньні пра найбольш тыповыя рысы беларускага характару беларусы таксама адной з першых узгадаюць славутуюталерантнасьць. Такое дасьледваньне было праведзенае ў канцы 90-х гадоў, і ягоныя вынікі таксама былі прадстаўленыя на пазначанай вышэй канферэнцыі дасьледчыкам Л.А.Агеевай. Пры апытаньні падчас дасьледваньня беларусы адзначылі 115 тыповых рысаў

суграмадзянаў, з іх найбольш часта ўзгадваліся (прывядзем 9 самых папулярных): цярплівасьць, гасьціннасьць, спакой, дабрыня, працалюбівасьць, розум, маруднасьць, нерашучасьць, пасіўнасьць.

Можна працягваць і далей, але талерантнасьць беларусаў не ўзгадаў, зыходзячы з вынікаў, практычна ніхто. Уьзнікае абгрунтаванае пытаньне: а чаму? Мяркуецца, што насамрэч рэспандэнты яе ўзгадалі, але – не вызначаючы асобна, а звычайна асацыюючы, у першую чаргу, з пасіўнай цярплівасьцю. Магчыма, менавіта таму, што цярплівасьць – не ва ўсіх выпадках добрая якасьць, апытаныя ўзгаданым вышэй навуковым калектывам "Славяне" беларусы паставілі талерантнасьць = цярплівасьць у сьпісе пазітыўных рысаў менталітэту толькі на 16-е месца з 20-ці першых (за кошт таго, што як пазітыўную якасьць талерантнасьць адзначыў толькі 51,9% беларусаў, як нейтральную – 12,5% апытаных, а як негатыўную – 29,9%).

Аднак талерантнасьць – ні ў якім разе не сінонім цярплівасьці і нават не сінонім цярпімасьці. І добра тое, што трапляецца ў публічных выказваньнях разуменьне гэтага паняцьця ў значна больш шырокім сэнсе.

Так, у адным з нумароў часопісу "Беларусь" за 1994 год аўтар артыкулу "Высакародныя рысы талерантнасьці" сп. М.Касьцюк, разглядаючы асаблівасьці менталітэту беларуса, хоць не падвяргаў сумневам існаваньне такой адметнай яго характарыстыкі і суадносіў яе ў першую чаргу з цярпімасьцю, заўважаў, што талерантнасьць трэба зьвязваць яшчэ і з разьвітым пачуцьцём годнасьці, уменьнем пастаяць за свае нацыянальныя, агульнанародныя і дзяржаўныя інтарэсы.

На неадэкватнасьць падыходаў да талерантнасьці як да цярплівасьці ці цярпімасьці, шырока пашыраных у беларускай грамадзкай думцы і пабытовых развагах, зьвяртаюць увагу і стваральнікі беларускага інтэрнэт-часопісу "Наша меркаваньне". У артыкуле, прысьвечаным талерантнай палітыцы, адзін з аўтараў рэсурсу, сп. А. Панькоўскі, слушна заўважае, што з талерантнасьцю ў нашым грамадзтве стала асацыявацца ў асноўным палітычная лаяльнасьць, якая разумееца асаблівым чынам. І гэта сапраўды зьяўляецца праблемай. Бо такое азначэньне ня мае рэальна да талерантнасьці аніякага дачыненьня. І такі падыход да разуменьня талерантнасьці зьяўляецца нават шкодным, бо ён пазбаўляе гэтую рысу той універсальнай грамадзкай каштоўнасьці, якой яна сапраўды валодае ў вачах усёй сусьветнай супольнасьці. Таму, у першую чаргу, неабходна разабрацца ў паняцьці.

Так, гістарычна ў многіх культурах слова "талерантнасьць" склаласяі замацавалася ў мовах як сінонім цярплівасьці і цярпімасьці. Можна ўзгадаць лацінскае tolerantia, якое перакладаецца і як "цярплівасьць", і як "цярпімасьць",

нямецкае die Toleranz, французскае tolerance – усё гэта найперш – сінонімы“цярпімасьці”.

Цярпімасьць, у сваю чаргу – адно з словаў, утворных ад дзеяслова “цярпець”. Вядомы мовазнаўца У. Даль укладаў у гэтае слова пасіўную абарончую накіраванасьць івельмі шырока вызначаў яго сэнс, у прыватнасьці, тлумачыў яго як “выносіць, зносіць, мацавацца, трымацца, чакаць чагосьці лепшага, пакутваць, не сьпяшацъ...” Гэты пасіўны акцэнт укладаецца і ў азначэньні талерантнасьці, якія ўжываюцца ў розных галінах сучаснай навукі.

Так, напрыклад, у эколагаў талерантнасьць – гэта здольнасьць арганізмаў пераносіць пэўную амплітуду хістаньняў фактараў асяродзьдзя ад аптымальных для іх, пры гэтым расьці і памнажацца.

Можна прывесьці таксама прыклад медыкаў, у якіх тэрмін “талерантнасьць” ужываецца ўжо ў іншых, розных значэньнях. У імунолагаў, у прыватнасьці, гэта азначае “цярпімасьць” імуннай сістэмы арганізму да перасаджаных інародных тканак. У таксікалогіі і фармакалогіі тэрмін “талерантнасьць” азначае паніжэньне адчувальнасьці да таксічных і фармацэўтычных прэпаратаў (напрыклад, да наркотыкаў).

Аднак мы разважаем пра грамадзкія адносіны, і нас найперш цікавіць талерантнасьць у сацыяльных стасунках, і вось тут гэтае паняцьце набывае іншае напаўненьне і накірунак.

Згодна з Дэкларацыяй прынцыпаў талерантнасьці, падпісанай 16 лістапада 1995 году ў Парыжы 185 дзяржавамі – сябрамі ЮНЭСКА, сацыяльная талерантнасьць – гэта павага, прыняцьцё і правільнае разуменьне багатай разнастайнасьці культураў нашага сьвету, формаў самавыяўленьня і спосабаў праяўленьня чалавечай індывідуальнасьці.

Менавіта гэтая фармулёўка дае сапраўднае ўяўленне пра талерантнасьць як актыўнае стаўленьне чалавека да шматбаковых праяваў культураў і чалавечых стасункаў, калі чалавек не зьяўляецца абыякавым, цярплівым і раўнадушным, а імкнецца да пазітыўнага ўзаемадзеяньня. Такая талерантнасьць – гэта не індыферэнтнасьць і не ігнараваньне, чалавек уступае ў кантакт з тым, хто не падобны на яго, і пры гэтым не адмаўляецца ад сваіх каштоўнасьцяў. Гэта і ня вымушаная тактыка слабога, не падпарадкаваньне, не цярпеньне ў адсутнасьці іншых варыянтаў – а захаваньне сваіх каштоўнасьцяў і іх узбагачэньне падчас знаёмства з каштоўнасьцямі іншых.

Каб стаць талерантным менавіта ў гэтым глыбокім сэнсе, чалавек:

- вызначае свае каштоўнасьці;
- вызначае тактыку сваіх канструктыўных паводзінаў з іншымі;
- узаемадзейнічае з іншымі і захоўвае пры гэтым сваё “я”;
- здольны аналізаваць вынікі ўзаемадзеяньня і робіць гэта.

Калі ж зыходзіць менавіта з такога, прынятага сусьветнай супольнасьцю, разуменьня талерантнасьці, ці зьяўляюцца беларусы талерантнымі?

Для пачатку трэба адзначыць, што існуе, мяркую, вялікая праблема -- не хапае шырокамаштабных дасьледваньняў у гэтай галіне і недастаткова інфармацыі пра вынікі тых дасьледваньняў, якія праводзяцца. Так, праводзіў на працягу некалькіх гадоў сацыялагічныя замеры палітыка-прававой талерантнасьці і адносінаў насельніцтва да прадпрымальнікаў Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледваньняў (НІСЭПД), спарадычна некаторыя ВНУ ў межах тэрміновых дасьледчых праектаў разьбіраюцца з адносінамі беларусаў да ўцекачоў, прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў, вывучаюць праблемы гендэрнай талерантнасьці. Аднак – дасьледваньні спарадычныя, комплекснага падыходу не назіраецца, пры гэтым навукоўцы часта разглядаюць праблему выключна ў гістарычным разрэзе (гэта датычыцца, напрыклад, падыходу дасьледчыкаў да праблемы міжканфесійных адносінаў).

Прычын такой “абдзеленасьці” ўвагай беларускай навукі тэорыі і практыкі талерантнасьці шмат, і зводзяцца яны, зразумела, не да адсутнасьці ў дзяржаўным бюджэце сродкаў на дасьледваньні, а да іншых абставінаў, а менавіта:

- міф пра талерантнасьць як пасіўна афарбаваную і статычную цярпімасьць/цярплівасьць даволі папулярны ў народзе, ён замацоўваўся працяглы час і зьяўляецца зручнаспажывальнай ідыялагемай. Падтрыманьне гэтага міфу ў дзеяздольным стане правячым рэжымам выкарыстоўваецца як сродак адноснай нейтралізацыі грамадзянскай актыўнасьці насельніцтва, грамадзяніну пастаянна пасылаецца сігнал пра тое, што выбівацца з агульнага натоўпу – гэта не па-беларускі, не натуральна, і дзеяньні ліберальнага характару, напрыклад, па абароне ідэяў і каштоўнасьцяў, загадзя асуджаныя на паразу, бо ня знойдуць падтрымкі іншых грамадзянаў, якія будуць ставіцца пасіўна да праяваў такой актыўнасьці;
- сучасная беларуская дзяржава не арыентаваная на ўлічваньне інтарэсаў розных сацыяльных групаў і фактычна сама дэманструе неталерантнасьць

да сваіх грамадзянаў. Назіраецца агульнае падаўленьне існуючым рэжымам праяваў мультыкультурнасьці, у першую чаргу палітычнай. Дзяржава дае ўстаноўку на "ўраўнілаўку" і прымусовае насаджэньне агульных мінімальных сацыяльных стандартаў, што не садзейнічае разнастайнасьці сацыяльных кантактаў і часова прыглушае праблемы суіснаваньня ў грамадзтве розных групаў;

- існуюць значныя праблемы ў галіне арганізацыі незалежных сацыялагічных дасьледваньняў, у прыватнасьці, існуе неспрыяльны прававы клімат для рэалізацыі падобных ініцыятываў;
- праявы неталерантнасьці ў беларускім соцыўме ў большасьці ігнаруюцца дзяржавай, якая такім чынам, з аднаго боку, дадаткова падтрымлівае карысны для кіраваньня натоўпам міф пра талерантнасьць/цярпімасьць, з другога – прымушае зьмяншаць грамадзянскую актыўнасьць розных групаў, напрыклад, нацыянальных меншасьцяў.

Аднак, нават нягледзячы на гэтыя абставіны, пэўныя дасьледваньні па беларускай талерантнасьці праводзіліся.

Так, у "Навінах НІСЭПД" (№3, 2000 г.) прыведзеныя цікавыя дадзеныя 4-гадовага дасьледваньня стасункаў беларусаў з рознымі сацыяльнымі групамі. Дасьледчыкаў цікавіла, якія віды дзеяньняў абіраюць беларусы ў адносінах да тых групаў насельніцтва, якія выклікаюць непрыязнасьць. Адказы рэспандэнтаў разьмясьціліся наступным чынам:

| ***Варыянт адказу*** | ***Чэрвень 1996 г.*** | ***Верасень 1998 г.*** | ***Чэрвень 1999 г.*** | ***Жнівень 2000 г.*** | ***Лістапад 2000 г.*** |
|---|---|---|---|---|---|
| ***Забараніць дзейнасьць такіх групаў*** | *41,0* | *41,0* | *22,5* | *17,3* | *23,8* |
| ***Абмежаваць для іх магчымасьць прапагандаваць свае перакананьні*** | *16,9* | *19,2* | *10,0* | *8,8* | *9,5* |
| ***Абмежаваць для іх магчымасьць арганізацыі публічных дзеяньняў, мітынгаў, шэсьцяў, дэманстрацыяў*** | *11,3* | *15,4* | *8,9* | *13,1* | *9,3* |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ***Прадставіць магчымасьць ажыцьцяўляць сваю дзейнасьць у межах закону*** | *24,8* | *32,5* | *60,9* | *63,6* | *60,9* |

Натуральна, прадстаўленыя дадзеныя трэба ацэньваць з улікам таго, што яны вельмі залежныя ад сітуацыі, бо на працягу пэўнага часу пасьля таго, як якая-небудзь з такіх групаў праявіць сябе пазітыўна/негатыўна ў сацыяльным полі, лічбы могуць хутка мяняцца, калыхацца. Але ж пэўныя тэндэнцыі заўважныя: з аднаго боку, радуе стабілізацыя на прыкладна 60% колькасьці рэспандэнтаў, выступаючых за прадстаўленьне магчымасьці дзейнічаць “раздражняльнікам” у межах закону, з другога – непакояць прыкладна 40 % тых грамадзянаў, хто выступае за абмежаваньні для выклікаючых непрыязнасьць.

Ня столькі навуковы, колькіпазнавальны інтарэс маюць дадзеныя апытаньняў удзельнікаў семінараў пад агульнай тэмай “Праблемы талерантнасьці ў беларускім грамадзтве і сьвеце”, якія былі арганізаваныя беларускай грамадзкай арганізацыяй Праваабарончы цэнтр “Вясна” і Швецкай арганізацыяй Міру і Арбітражу ў 2003 – 2004 гадах ў шэрагу беларускіх гарадоў – Менску, Брэсьце, Гомелі, Магілёве і Наваполацку. Удзельнікамі апытаньня сталі больш за 100 сяброў грамадзкіх арганізацыяў і грамадзянскіх ініцыятываў з Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай і Віцебскай абласьцей рознага ўзросту, адукацыі, прафесійнай прыналежнасьці пры прыкладна вытрыманым гендэрным балансе кожнай групы. Рэспандэнтам, людзям, якія займаюць актыўную грамадзянскую пазіцыюі ведаюць праблемы сваіх рэгіёнаў, патрэбна было адказаць на адкрытае пытаньне: “Якія катэгорыі насельніцтва, па Вашых назіраньнях, выклікаюць найбольшае раздражненьне беларусаў?”. Удзельнік апытаньня мог не вызначаць такія групы насельніцтва ў тым выпадку, калі не назіраў адпаведных канфліктных сітуацыяў.

Вынікі апытаньняў уразілі ня толькі трэнераў, але і саміх прысутных. Па назіраньнях удзельнікаў, найбольшае раздражненьне ў беларусаў, прычым з вялікім адрывам, выклікалі прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў, асабліва выхадцы з закаўказкіх краінаў, прадстаўнікі дзяржаўных органаў, багатыя/бедныя і людзі ўмоўна асацыяльнага ладу жыцьця (бамжы і алкаголікі):

| *Група насельніцтва* | *агульная колькасьць узгадваньняў якасьці раздражняль-ніка* | *Брэст лістапад 2003* | *Магілёў лістапад 2003* | *Наваполацк красавік 2004* | *Гомель красавік 2004* |
|---|---|---|---|---|---|
| *Прадстаўнікі нацыянальных меншасьцяў (“каўказцы”, цыгане, мурыны, габрэі, расейцы, украінцы)* | 90 | 29 | 21 | 20 | 20 |
| *Прадстаўнікі органаў улады і дзяржаўных установаў (чыноўнікі ўвогуле, міліцыянты, судовыя, медыцынскія работнікі, супрацоўнікі падатковай інсьпекцыі і г.д.)* | 45 | 8 | 25 | 6 | 6 |
| *Бедныя/багатыя* | 7/35 | 1/6 | 1/8 | 4/8 | 1/13 |
| *Людзі ўмоўна асацыяльнага ладу жыцьця (бамжы, алкаголікі)* | 40 | 6 | 8 | 16 | 10 |
| *Носьбіты пэўных палітычных поглядаў –* | 18/9 | 3/3 | 9/2 | 3/2 | 3/2 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ***“апазіцыянеры”/ “прыхільнікі існуючай улады”*** | | | | | |
| ***Прадстаўнікі сексуальных меншасьцяў*** | 20 | 3 | 6 | 7 | 4 |
| ***Людзі адметнага стылю жыцьця (прадстаўнікі моладзевых субкультураў-панкі, рокеры, доўгавалосыя, гопнікі)*** | 14 | 1 | 3 | 9 | 1 |
| ***Прадстаўнікі неправаслаўных канфесіяў*** | 8 | 5 | - | - | 3 |
| ***Старыя людзі/падлеткі*** | 6/2 | 5/1 | 1/1 | - | - |
| ***Выхадцы з сельскай мясцовасьці*** | 2 | 1 | - | 1 | - |
| ***Беларускамоўнае насельніцтва*** | 2 | 2 | - | - | - |
| ***Псіхічна хворыя людзі*** | 1 | - | - | 1 | - |

Негатыўнае ўспрыманьне значнай колькасьцю беларусаў прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў знаходзіць пацьверджаньне і ў выніках сапраўдных сацыялагічных дасьледваньняў. Так, летам 2001 г. зноў жа ў 4-х гарадах Беларусі (Менску, Брэсьце, Гомелі і Магілёве) ГА “Магілёўская гарадзкая асацыяцыя “Гуманітарная ініцыятыва” правяла сацыялагічнае апытаньне для вывучэньня асаблівасьцяў успрыманьня ўцекачоў у Беларусі мясцовым насельніцтвам. Было

апытана 1200 чалавек ва ўзросьце ад 16 да 60 гадоў. Рэспандэнтам задаваўся шэраг пытаньняў, напрыклад: “Ці згодныя Вы з правам уцекачоў на прытулак?”. “Так” – адказала 59% апытаных, “Не” – 40%.

Прадстаўнікі некаторых нацыяў выклікалі абыякавасьць ці апатыю ў 50 – 62% рэспандэнтаў (для параўнаньня, беларусы – толькі ў 10%).

Неўспрыманьне ўцекачоў рэспандэнтамі выклікана ў асноўным тым, што, па іх меркаваньні, іншаземцы:

| | |
|---|---|
| *Зьдзяйсьняюць злачынствы* | *35,2 %* |
| *Ствараюць напружаныя абставіны* | *27%* |
| *Вядуць сябе як гаспадары* | *23,8%* |
| *Імкнуцца падмануць нас* | *20,8%* |
| *Звысоку глядзяць на нашую культуру* | *12,6%* |
| *Маюць нізкі ўзровень культуры* | *12,5%* |
| *Маюць раздражняльнызьнешні выгляд* | *10,2%* |

Белорусский журнал международного права и международных отношений. №4, 2001 г.

Пры гэтым непасрэдна сустракаліся з уцекачамі толькі 24% апытаных, што азначае, што ацэнка прадстаўнікоў іншых культураў робіцца з пункту гледжаньня агульнага меркаваньня і існуючых стэрэатыпаў, а не на падставе асабістага досьведу.

На жаль, якіх-небудзь колькасных дадзеных па адносінах беларусаў да прадстаўнікоў тых ці іншых дзяржаўных установаў знайсьці не ўдалося, што і ня дзіўна, і замеры ўзроўню талерантнасьці грамадзянаў да дзяржслужбоўцаў яшчэ наперадзе.

Стаўленьне ж беларусаў да багатых суайчыньнікаў, як бачна, таксама жадае лепшага. Згодна з вынікамі дасьледваньня НІСЭПД, праведзенага на працягу 1997 – 2000 гадоў, у 2000 годзе з павагай ставілася да грамадзянаў, якія маюць вялікі прыбытак, толькі 27,9% апытаных, 24,4% лічылі іх падманшчыкамі і прахадзімцамі, а 26,7%-- абыякава ігнаравалі. І наўрад ці нешта вельмі значна зьмянілася на

сёньняшні дзень, хаця тэндэнцыя паляпшэньня adносінаў насельніцтва да беларускіх прадпрымальнікаў маецца.

Вось і атрымоўваецца, што беларусы дэманструюць не талерантнасьць у тым сэнсе, які ўкладае ў гэтае словасусьветны досьвед і сама тэорыя талерантнасьці, а хутчэй -- цярпімасьць ці, у лепшым выпадку, --абыякавасьць да іншых.

Калі паспрабаваць абагуліць, не ўдаючыся ў дэталі, якія заслугоўваюць асобнага дасьледваньня, то асноўныя прычыны можна акрэсьліць такім чынам:

1. Беларусы – нашчадкі савецкага мінулага, якія перанесьлі ў сваю сучаснасьць памяць аб правільнасьці і бясьпецы ўсярэдненасьці і адпаведнасьці ўсталяваным мінімальным стандартам “нармальнага” чалавека.

2.Беларусы – прадукт існуючай палітычнай сістэмы, якая не стымулюе шматкультурнасьці і шматвектарнасьці сацыяльнага жыцьця і падаўляе ініцыятыву, і, адпаведна – не стымулюе разьвіцьцё міжкультурных кантактаў, якія зьяўляюцца базай для разьвіцьця сапраўднай актыўнай талерантнасьці.

3. Нашыя суайчыньнікі ў пераважнай большасьці не ўсьведамляюць наяўнасьці ў беларускім грамадзтве праяваў неталерантнасьці, спажываючы прапануемы ўладаю і СМІ міф аб прыроджанай талерантнасьці беларусаў, запраграмавана атаясамліваюць яез пасіўнымі па зьместу цярпімасьцю і цярплівасьцю.

4. Адэкватнае ўспрыманьне каштоўнасьцяў іншых магчыма толькі ў выпадку ўсьведамленьня каштоўнасьцяў сваіх, ідэнтыфікацыі сябе як носьбіта багатай, гістарычна сьцверджанай культуры. Варожасьць да іншамоўя на беларускіх вуліцах, незвычайнага адзеньня, агрэсія ў выпадку публічнай дэманстрацыі асаблівасьцяў іншага культурнага асяродзьдзя-- часта стоеная зайздрасьць да ўпэўненасьці іншага ў сваёй асабістай каштоўнасьці.

5. Нізкі ўзровень прыбыткаў насельніцтва, неразьвітасьць так званага сярэдняга класу, няўпэўненасьць у заўтрашнім дні, немагчымасьць поўнай самарэалізацыі лёгка правакуюць чалавека на агрэсію да тых, хто здолеў дабіцца большага, у прыватнасьці – да прадпрымальных і заможных грамадзянаў.

6. Дзяржаўныя СМІ фармуюць негатыўныя вобразы шэрагу большых ці меншых сацыяльных групаў – прадпрымальнікаў і прадстаўнікоў апазіцыйных палітычных сілаў, актывістаў недзяржаўных грамадзкіх арганізацыяў, неправаслаўных вернікаў... Сьпіс можна працягваць даволі доўга, але галоўнае ў ім адно – дзяржава ўсімі даступнымі сродкамі штучна стварае “ворагаў”, правакуючы беларусаў на

неадэкватнае ўспрыманьне асобных сацыяльных групаў,і, як сьледзтва – на неталерантнасьць да іх. Дыскрымінацыйнае заканадаўства аб рэлігіях, перасьлед за палітычныя погляды ніколі не дадуць грамадзянам магчымасьці практыкаваць актыўную талерантнасьць.

7. Адсутнасьць праўдзівай, поўнай і даступнай інфармацыі пра тых, хто адрозьніваецца ад нас і жыве з намі поруч – яшчэ адзін фактар, які нараджае стэрэатыпы і правакуе на адмоўнае стаўленьне. Непашыранасьць адукацыйных праграмаў у галіне міжкультурнага ўзаемадзеяньня, праблемы з існаваньнем нефармальнай адукацыі ў Беларусі, адсутнасьць так званай кроскультурнай камунікацыі таксама цягнуць за сабой пэўную насьцярожанасьць і варожасьць да непадобнага на сябе, бо не прадстаўляюць магчымасьці чалавеку нават псіхалагічна падрыхтавацца да ўзаемадзеяньня з людзьмі іншай культуры, нацыі, рэлігіі, сацыяльнага асяродзьдзя.

І апошняе. Забыцца зараз на выкладзеныя вышэй праблемы, пакінуць у спакоі ўсталяваную дзяржаўную міфалогію пра талерантнасьць = цярпімасьць = цярплівасьць беларусаў – гэта як не лячыць хваробу адразу пасьля яе выяўленьня і адцягваць час візіту да доктара – лячыцца ўсё адно прыйдзецца, ды толькі за кошт большых сродкаў. Рана ці позна, але дэмакратычныя зьмены ў нашым грамадстве адбудуцца, і ва ўмовах разьвіцьця міжкультурных адносінаў у Беларусі адразу ж паўстане пытаньне пра сапраўдную прыроду і сутнасьць талерантнасьці беларусаў, у першую чаргу – перад імі самімі. Таму неабходна паспрабаваць пачаць з сябе і сёньня падыйсьці да таго, каго мы заўважаем, але не разумеем ці разумеем, але робім выгляд, што не заўважаем, і пачаць нарэшце знаёміцца.

Выкарыстаныя крыніцы:

Выборнов В. Отношение к беженцам в Беларуси. Белорусский журнал международного права и международных отношений. №4, 2001

Доклад А.Г.Лукашенко на семинаре руководящих работников республиканских и местных государственных органов по вопросам усовершенствования идеологической работы. http://president.gov.by/rus/president/speech/2003/seminar/sem2.html

Валетова Р.Р. Толерантность: порок или добродетель? Вестник МУ, серия 7, Философия -- №1, 1996 г. – с. 33-37.

Агеева Л.А. Национальное самосознание белорусов и восприятие ими себя и их другими нациями. Менталитет восточных славян: история, современность, перспективы. Материалы международной научной конференции. Гомель, 1999. -- с. 93.

Кириенко В.В. Менталитет современных белорусов: проблемы индикации. Менталитет восточных славян: история, современность, перспективы. Материалы международной научной конференции. Гомель, 1999. -- с.118 - 122.

Ершов Ю.М. Массовые коммуникационные процессы и проблема толерантности. http://www.newsman.tsu.ru/library/rublic/ershov_6.html

Паньковский А.Г. О толерантной политике. Откуда она берется и как осуществляется.http://www.nmnby.org/pub/050704/toler.html

Касцюк М. Высакародныя рысы талерантнасці. “Беларусь”, 1994 г.

Новости НИСЭПИ. №3, 2000 г.

http://infolio.asf.ru/Sprav/Dal/01/1705.htm

Экалагічны слоўнік -- Экологический словарь: Кніга для вучняў. Мінск: Народная асвета, 1993 г.

Большая советская энциклопедия. http://www.oval.ru/enc/72606.html

Даль В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. http://infolio.asf.ru/Sprav/Dal/01/1705.htm

Погодина А.А. Толерантность: термин, позиция, смысл, программа. http://www.1september.ru/ru/his/2002/11/2.htm

Темичева Е. Толерантность как условие существования. «Интернет и толерантность». http://tolerance.fio.ru/nindex.php?n=143

# ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ БЕЛАРУСАЎ: АБЫЯКАВАСЬЦЬ ЦІ ДУХОЎНАЕ ЗАПАТРАБАВАНЬНЕ?

Інтэрвью з Уладзімірам Мацкевічам,

палітолагам, метадолагам

– Што трэба разумець, калі мы гаворым словы “рэлігійная талерантнасьць”?

– Калі казаць пра асабістыя перакананьні і веру, то размова аб талерантнасьці становіцца даволі складанай. Калі б ніякіх перакананьняў не было – тады б не было і праблемы. Даволі проста быць талерантным чалавеку, які абыякава ставіцца да сваіх перакананьняў. У такім выпадку гэтыя паняцьці нічога ня вартыя. Але калі вера моцная, а перакананьні грунтоўныя, то даволі цяжка пагадзіцца з тым, што побач існуюць людзі з іншымі перакананьнямі і іншай верай. Нездарма людзі абгрунтоўваюць моцнасьць веры гатоўнасьцю чалавека ахвяраваць сваім жыцьцём, сваёй маёмасьцю, сваімі здабыткамі. Заўсёды, калі мы разважаем і гаворым пра моцную веру і ўпэўненасьць у ёй, гэта аргументуецца тым, што вернік за свае перакананьні і веру гатовы чымсьці ахвяраваць. У такім выпадку чалавеку быць талерантным і прыязна ставіцца да перакананьняў і веры іншых значна цяжэй. Таму амбівалентнасьць катэгорыяў талерантнасьці для веруючага ў тым, што з аднаго боку ён мае вельмі моцныя і непахісныя перакананьні, а з іншага боку ён вымушаны цярпіма ставіцца да людзей, якія прытрымліваюцца іншых перакананьняў.

З гэтага вынікае, што рэлігійная талерантнасьць – адна з самых складаных частак талерантнасьці ў цэлым. Але менавіта рэлігійны асьпект гэтай зьявы – ёсьць пачатак любой іншай талерантнасьці. Гэта таксама і тэст-выпрабаваньне для грамадзтва. Спакуса веры і рэлігійнасьці ў тым, што заўсёды сваім полюсам ці накірункам яна мае пэўны “фанатызм”. Фанатызм, які ўжо не дапускае ніякай талерантнасьці. Моцная вера – гэта нешта падобнае да фанатызму. Таму можна лічыць подзьвігам прысутнасьць у рэлігійным жыцьці (а не яго сімуляцыі) сапраўдных праяваў талерантнасьці.

– Што вы маеце на ўвазе, гаворачы пра “рэлігійную сімуляцыю”?

– Бывае, што рэлігію ў грамадзтве замяняе сімуляцыя, – неглыбокая вера, ці “вера пад прымусам”, як, напрыклад, камунізм ці “дзяржаўная рэлігія”. Дзяржаўная рэлігія вымушае людзей прыстасоўвацца да пэўнага культу, але яна ніяк не закранае глыбіні пачуцьцяў і веры чалавека. Такім “вернікам” быць талерантнымі да іншых значна прасьцей. А духоўны ўздым, высокі духоўны ўзровень чалавека дае яму

магчымасьць мець глыбокую веру і быць талерантным і цярпімым да іншых. Таму я сьцьвярджаю, што рэлігійная талерантнасьць – гэта пачатак любой іншай талерантнасьці і выпрабаваньне ці тэст на наяўнасьць талерантнасьці ў грамадзтве.

Сітуацыя з прымусовым хрышчэньнем (гісторыя ведала такія факты) ці існаваньне дзяржаўнай рэлігіі паказвае нам грамадзтва, у якім такая талерантнасьць адсутнічае.

Наяўнасьць талерантнасьці можа адначасова сьведчыць пра дзьве рэчы. З аднаго боку пра тое, што гэтае грамадзтва рэлігійнае толькі павярхоўна, альбо ў ім існуе пэўны этыкет – належаць да пэўнай веры ці царквы, і людзі да гэтага ставяцца неглыбока. Але магчыма, што такое грамадзтва сапраўды мае вельмі высокі ўзровень разьвіцьця.

Зыходзячы з гэтага, мы павінны ставіцца даволі крытычна да гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і беларускага грамадзтва ў цэлым. Калі мы кажам, што ў ВКЛ была высокая верацярпімасьць – гэта праўда, бо пра гэта сьведчаць розныя гістарычныя крыніцы і іншыя гістарычныя факты. Але што гэта значыць на самой справе, як гэта трэба разумець і трактаваць – варта падумаць.

Тая талерантнасьць магла тлумачыцца і тым, што беларускае грамадзтва ў той час было досыць сімулятыўным. Яно не было глыбока веруючым. Былі дзейснымі і жывымі розныя політэістычныя забабоны, якія суіснавалі ў сьвядомасьці тагачасных людзей разам з павярхоўным хрысьціянствам. Таму беларускія праваслаўныя, каталікі і пратэстанты, што зьявіліся ў той час, толькі павярхоўна былі хрысьціянамі, а ў глыбіні сваёй сьвядомасьці засталіся паганцамі. На гэтым паганскім узроўні яны вельмі лёгка знаходзілі прымальныя для сябе спосабы чалавечага суіснаваньня з прадстаўнікамі іншых вераваньняў. Тое, што яны хадзілі ў розныя будынкі для таго, каб маліцца – гэта нікога асабліва не цікавіла.

– Гэта вашая гіпотэза? Ці пацьвярджаецца яна якімі-небудзь крыніцамі? Якія падставы вы маеце дзеля такога меркаваньня?

– Палесьсе да сёньняшняга дня зьяўляецца рэгіёнам, дзе захаваліся розныя рытуалы і паганскія звычкі. Тое, што жамойты, літоўскія плямёны, былі хрышчаныя найпазьней у Еўропе -- факт агульнавядомы. І калі падлічыць час існаваньня хрысьціянства ў нашай краіне, то можна сказаць, што мы яго прынялі адныя з апошніх. У часы ВКЛ сапраўднае хрысьціянства свае карані яшчэ не пусьціла так глыбока, як, напрыклад, у Італіі, дзе яно існавала ўжо больш за тысячу гадоў.

Для Беларусі Рэнесанс ня быў Адраджэньнем, як для ўсёй Еўропы. Для нас гэта было, хутчэй, “запазычаньнем” тых ці іншых культурных і рэлігійных плыняў. Яны суіснавалі разам з паганскім стаўленьнем да жыцьця. З другога боку, Рэфармацыя, якая ахапіла Еўропу ў тыя часы, сапраўды дала такі моцны штуршок да духоўнага разьвіцьця, што людзі, якія прымалі ўсёй душой хрысьціянства і Біблію, падымаліся над сваім часам і над сваёй эпохай і давалі прыклады вельмі ўзьнёслага стану духоўнасьці. Гэты стан закрануў і Беларусь. Напрыклад, у тыя часы зьявілася палемічная літаратура – найвялікшая культурная зьява. Аўтары, мысьляры і філосафы, так упарта змагаліся паміж сабой з-за нейкіх тэарэтычных багаслоўскіх і філасофскіх пытаньняў, але, пры гэтым, яны жылі ў адных і тых жа гарадах. І ня рэзалі адзін аднога, паміж імі не было войнаў, боек і г. д. Яны былі сапраўды талерантнымі. XVI стагодзьдзе – гэта стагодзьдзе росквіту духу.

У Беларусі ўсё гэта было. Такім чынам, з аднаго боку існавала “народная талерантнасьць”, якая ў сваім падмурку мела хутчэй паганскія звычкі і неглыбока закранулае людзей хрысьціянства. Яны ня вельмі разьбіраліся, у чым адрозьненьне паміж каталікамі і праваслаўнымі, каталікамі і рэфарматарамі. Усё хрысьціянскае тады было аднолькава новае. Але былі людзі – Сымон Зак, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі – тыя, каго мы ведаем як эліту нацыі, мысьляроў, сярод якіх існавала сапраўдная талерантнасьць. Беларуская рэлігійная талерантнасьць – шматслойная зьява. Такой яна і працягвала быць на працягу стагодзьдзяў.

– У Беларусі на той час мірна суіснавалі ня толькі прадстаўнікі розных рэлігійных плыняў, але і розных этнасаў…

-- Так, большасьць гарадоў не былі монаэтнічнымі. У іх жылі славяне і балты, габрэі, татары, караімы... Буйныя гарады мелі Магдэбургскае права, зьяўляліся гандлёвымі цэнтрамі, былі зьвязаныя з Захадам. Атрымлівалася вельмі стракатая этнічная карціна. Усе яны добра суіснавалі. Трэба адзначыць, што ў гэтым не было нічога ўнікальнага. Так жылі практычна ўсе гарады Еўропы.

Гэтая зьява таксама выхоўвала талерантнасьць у грамадзтве. Але пазьней мы сустракаемся з антысемітызмам, і ў Беларусі таксама. Мы ня можам сказаць, што Беларусь чымсьці адрозьнівалася. Магчыма, у нас не было такіх моцных пагромаў, як у іншых краінах. Гэтае суіснаваньне праяваў non-талерантнасьці і высокай талерантнасьці паказвае, што сама па сабе зьява талерантнасьці даволі шматслойная. Яна існуе на розных узроўнях культурнага і духоўнага жыцьця людзей. Прычыны і падставы гэтай талерантнасьці на вышэйшым духоўным узроўні адны, а на ніжэйшым – зусім іншыя. Таму і “сасьлізгваньне” на non-талерантнасьць ці на

агрэсію паміж рознымі супольнасьцямі таксама мае розныя падставы. На ніжэйшым узроўні дастаткова, каб хтосьці кагосьці падмануў ці абразіў, і пачынаецца сварка. Гэта амаль немагчыма на больш высокім узроўні, але там non-талерантнасьць прысутнічае ў выглядзе “не магу пастуміцца прынцыпамі”. Калі чалавек настолькі ўпэўнены ў сваіх поглядах, што ня можа адмовіцца ад іх нават у выпадку, калі яго прымушаюць гэта зрабіць.

– Пра што сьведчыць далейшая гісторыя Беларусі?

– XVII стагоддзе для Беларусі зьявілася выбуховым. Высьветлілася, што шырокае распаўсюджаньне Рэфармацыі не набыло ў грамадзтве глыбокіх каранёў. Гэта было зьвязана, хутчэй за ўсё, з тым, што за хуткім распаўсюджаньнем Рэфармацыі не пасьпявалі школа і адукацыя. І тым гігантам багаслоўя, якія працавалі ў 16 стагодзьдзі, не была падрыхтаваная замена ў новым пакаленьні. А запазычваць з Еўропы тэолагаў і філосафаў было складана. Еўропа сама апынулася ў стане рэлігійных войнаў. Там было столькі сваіх уласных праблемаў. У гэты ж час расейскія войскі нахлынулі на нашую зямлю. Тую вайну гісторыя назвала “патопам”. Яна зрабіла вельмі небясьпечным жыцьцё ў краіне, таму беларускія землі ня вабілі да сябе місіянераў. Мы апынуліся ў сітуацыі, калі суіснаваньне розных рэлігіяў і розных этнасаў і высокая талерантнасьць на культурных падставах зьмяніліся. Прывілеі пачалі надавацца адной рэлігіі. Хто супраціўляўся – тых вынішчалі фізічна, палілі літаратуру, руйнавалі пратэстанцкія зборы.

– А ў сучасным беларускім грамадзтве ёсьць талерантнасьць?

– Зараз мы маем усе тыя пласты талерантнасьці, пра якія я казаў вышэй. Самы прымітыўны ўзровень талерантнасьці – гэта абыякавасьць. Абыякавасьць да веры, прынцыпаў, да розных духоўных апірышчаў у жыцьці. Людзі глядзяць на сьвет прыземленымі вачыма.

– Дзе карані гэтай зьявы, на ваш погляд?

– Абыякавасьць паходзіць ад ідэалагічнага прымусу савецкіх часоў. Тады абавязкова трэба было быць атэістам, патрыётам савецкай дзяржавы і перапаўняцца класавай салідарнасьцю з працоўнымі і сялянамі. Усё гэта адбывалася пад прымусам. А прымусовасьць заўсёды нараджае павярхоўнае стаўленьне: “Я скажу тое, што вы ад мяне патрабуеце, толькі не прымушайце мяне ў гэта верыць”. Пад савецкім ідэалагічным прымусам выхоўваліся пакаленьні абыякавых да духоўных каштоўнасьцяў людзей.

З другога боку, спроба савецкіх уладаў кантраляваць рэлігійнае жыцьцё атрутным чынам паўплывала на рэлігію і царкву. Рэлігійнае жыцьцё вельмі моцна рытуалізавалася. Людзі шукалі і прагнулі духоўнасьці, але не маглі знайсьці настаўнікаў у гэтай справе. Яны хісталіся паміж праваслаўнай царквой і райкамам партыі. У тым, што давала партыя і камсамол, многія расчараваліся і, шукаючы духоўнага апірышча, траплялі ў царкву, дзе знаходзілі толькі рытуалы. Гэта нараджала абыякавасьць у грамадзтве.

Такой талерантнасьцю ганарыцца ня варта. Яна азначае, што людзі проста абыякава ставяцца да сваіх уласных перакананьняў і да рэлігійных пачуцьцяў астатніх. Вынік – зьявы кшталту “праваслаўнага атэізму”.

– Талерантнасьць на гэтак званым бытавым узроўні праяўляецца ня менш яскрава?

– Тут і далей мы маем, так бы мовіць, «вымушаную талерантнасьць». Гэта значыць, што людзі, нягледзячы на розныя перакананьні, вымушаныя жыць побач. Напрыклад, у Заходняй Беларусі на ўезьдзе ў некаторыя вёскі стаяць два крыжы – каталіцкі і праваслаўны. Гэта значыць, што там жывуць і каталікі, і праваслаўныя. Яны вымушаныя дамаўляцца і ўзгадняць свае дзеяньні. Усе яны размаўляюць на адной мове, іх дзеці гуляюць разам і ходзяць у адну школу. Гэта значыць, што паміж імі ёсьць добра наладжаныя стасункі. Верагоднымі ў такой сітуацыі становяцца шлюбы паміж моладзьдзю розных канфесіяў, хаця ў сучасным грамадзтве шлюбы ня маюць такой культурнай насычанасьці, як раней. У рознаканфесійнай сям’і людзі вымушаныя дамаўляцца. Гэта значыць, што прымаецца сьвецкая рэгістрацыя шлюбу. Суіснаваньне разам з царкоўным шлюбам сьвецкай рэгістрацыі – гэта таксама вымушаная праява талерантнасьці. Гэтая талерантнасьць “спускаецца на сямейны ўзровень”. На гэтым узроўні пачынаецца барацьба перакананьняў паміж бацькамі за душы дзяцей. Звычайна гэта адбываецца мірна. Калі ёсьць згода і каханьне ў сям’і, то спрэчкі наконт таго, як прамаўляць “Ойча наш” – ці на польскай, ці на старажытнаславянскай – не выклікаюць канфліктаў. Тым ня менш, сям’я становіцца полем змаганьня, але, з іншага боку, у такой сітуацыі выхоўваецца талерантнасьць.

– Вы асабіста сустракаліся з такімі выпадкамі?

– Так, у Гарадзенскай вобласьці падобныя сітуацыі зьяўляюцца даволі распаўсюджанымі. Сярод маіх сваякоў быў такі шлюб – мая сваячка выйшла замуж

за каталіка. Ні яе (праваслаўная) сям’я, ні яго (каталіцкая) не настойвалі на пераходзе маладых у іх веру. Гэта не абыякавасьць, а талерантнасьць.

Дзеці, назіраючы за сваімі бацькамі, ведаюць (але не абавязкова прымаюць) і рэлігійныя перакананьні маці і перакананьні бацькі. У змаганьні за душы дзяцей звычайна перамагае той з бацькоў, хто больш перакананы ў сваёй веры. Звычайна гэта жанчыны і каталікі.

– Чаму так?

– Я думаю, што справа ў моцы жаночага пачатку. Хоць трэба яшчэ дасьледаваць, якую дакладна ролю ў гэтай сітуацыі мае гендэрны фактар, а якую канфесійны. Гэта ня значыць, што беларускія мужчыны больш талерантныя. Яны проста больш абыякавыя.

Non-талерантнасьць у заходніх раёнах Беларусі, там, дзе суіснуюць касьцёл і праваслаўная царква, праяўляецца ў тым, што людзі баяцца незнаёмага, чужога для іх. Праваслаўныя каталікоў разглядаюць як чужых, якія робяць нешта ня тое. Асабліва гэта тычыцца пратэстантаў у вёсках. Калі ў праваслаўнай ці ў каталіцкай вёсцы зьяўляецца баптысцкая сям’я, то ксенафобія праяўляецца нават у стасунках паміж дзецьмі.

– У горадзе праваслаўным, каталікам і пратэстантам дамовіцца прасьцей?

– Тут таксама існуюць праблемы. Гарадзкая праваслаўная ці каталіцкая супольнасьці могуць не перасякацца на пабытовым узроўні, але яны павінны сустракацца, каб вырашаць разам гарадзкія праблемы. Да таго часу, пакуль і праваслаўная, і каталіцкая цэрквы былі аддзеленыя ад дзяржавы аднолькава далёка, ніякіх пытаньняў і перашкодаў у іх стасунках не ўзьнікала. Так было, напрыклад, у апошнія гады існаваньня Савецкага Саюзу. Разгалінаванасьць, вядома, была, але яна была зьвязаная не з талерантнасьцю, а з пэўнай ідэалагічна-палітычнай сітуацыяй. Савецкія кіраўнікі лічылі так: рускія – праваслаўныя, украінцы – праваслаўныя, літоўцы – каталікі, латышы – лютэране і г.д.

– Ці адпавядае гэта рэчаіснасьці?

– Ніяк не адпавядае. Гэта савецкае бачаньне навакольнага сьвету ў адпаведнасьці з ідэалагічнай схемай. Паводле мапаў Карскага, якія паказвалі распаўсюджанасьць беларускай мовы ў Віленскім краі, беларуская мова была распаўсюджаная аж да Вільні. У той жа час літоўскую мову можна было пачуць і каля Маладэчна. Існавала і польская мова. Людзі, якія жылі ў гэтым рэгіёне, называлі

сябе “тутэйшымі”. У 1939 годзе Сталін загадаў людзей запісваць паводле іх нацыянальнай прыналежнасьці. Усіх прыводзілі ў адпаведнасьць з нацыянальнасьцямі, што “былі ў наяўнасьці”. Гэта прывяло да таго, што зьявіліся механічныя межы паміж рознымі нацыянальнасьцямі. Людзей прымушалі забывацца пра іншыя адзнакі самавызначэньня. Тым часам “тутэйшасьць” была вельмі важным прынцыпам у жыцьці паспалітых людзей. “Тутэйшасьць” была на ўзроўні самасьвядомасьці.

Тады і былі пераблытаныя этнічныя прынцыпы з канфесійнымі. Калі чалавек хадзіў у касьцёл, ён не абавязкова быў палякам. Але ўжо зараз у нашай сьвядомасьці замацавалася, што “каталік” – гэта значыць “паляк”. Значная частка беларусаў такім чынам была адарваная. Пасьля вайны людзям польскай нацыянальнасьці было дазволена ехаць жыць на той бок мяжы. Беларусам дазволілі пераехаць у БССР. Калі ў Гарадзенскай вобласьці гэты працэс ішоў больш-менш добраахвотна, то ў Берасьцейскай гэта адбывалася прымусова. У выніку Берасьцейская вобласьць канфесійна стала практычна аднародным рэгіёнам.

– Нядаўна была заключаная дамова паміж праваслаўнай царквой і беларускай дзяржавай. Ці паспрыяе гэта ўсталяваньню талерантнасьці ў нашай краіне?

– Перадусім я хацеў бы зазначыць, што на ўзроўні сьвятароў ці, па-іншаму кажучы, адукаваных кіраўнікоў канфесійнага жыцьця, адбывалася запазычанасьць некаторых прыкладаў стасункаў паміж Царквой і дзяржавай. Праваслаўныя ня тое каб зайздросьцілі каталікам… Яны глядзелі на іх лад, на іх усталяваньне царкоўнага жыцьця і бачылі там тое, што можна было б запазычыць.

У савецкія часы праваслаўных сьвятароў прызначалі да прыходаў. Зараз у праваслаўнай царкве грамадзянін іншай дзяржавы ня можа быць сьвятаром. У савецкія часы было ня так. Тады ў нас не было праваслаўнага патрыярхату. Беларусы ехалі ў Сібір і там працавалі сьвятарамі. Але тыя, хто жылі ў Беларусі, вучыліся ў іншых веруючых і запазычвалі пэўныя формы стасункаў з дзяржавай. Таму не выпадкова, што менавіта ў Беларусі была заключаная гэтая дамова – “Канкардат”. Хоць сапраўдны Канкардат – гэта дамова каталіцкай царквы ў асобе Ватыкану з дзяржавай. Для ўсходняй галіны хрысьціянства ўласьцівая іншая форма супрацоўніцтва з сьвецкімі ўладамі.

Згадаем, як толькі напрацягу XIX-XX стст. утваралася незалежная дзяржава, дык у праваслаўных краінах абавязкова абвяшчалася аўтакефальная праваслаўная царква, зьяўляўся свой патрыярх ці мітрапаліт. Пасьля, нават у некаторых

неправаслаўных краінах, абвяшчалася незалежная праваслаўная царква. Так было, напрыклад, у Польшчы. На пачатку 90-х гг. ва Украіне абвясьцілі аўтакефальную царкву, а ў Беларусі – не. Беларусь у гэтым сэнсе зьяўляецца выключэньнем. Гэта прэцэдэнт. У нас царкоўная незалежнасьць не адбылася, хоць рух у гэтым накірунку быў. Думка аб стварэньні дагэтуль выношваецца ў Беларускім экзархаце. Я мяркую, што пры спрыяльных умовах гэтая аўтакефалія будзе абвешчаная. І гэта цалкам адпавядала б традыцыям праваслаўя.

Сёньняшняя праваслаўная царква ў Беларусі пайшла па іншым накірунку, яна запазычыла стасункі з дзяржавай ад каталіцкай царквы. Гэта стала магчымым менавіта таму, што ў Беларусі суіснавалі гэтыя канфесіі і ўплывалі адна на адну. Каталіцкі касьцёл – гэта адзінае ўтварэньне. Адбываецца наступнае. У Беларусі, дзе няма ўласнай праваслаўнай царквы, дзейнічае Руская праваслаўная царква. Гэта не адпавядае праваслаўнай традыцыі ўсходняга хрысьціянства. Узьнікае праблемная сітуацыя. Яна можа прывесьці да страты незалежнасьці ўсім народам. Бо праваслаўная царква тут заўсёды будзе падпарадкоўвацца Маскве. А маскоўскі патрыярх заўсёды будзе ўзгадняць сваю палітыку адносна Беларусі са сваім сьвецкім кіраўніцтвам, і да таго ж, яму нададзеная магчымасьць кіраваць царквой у іншай дзяржаве.

Другая праблема – гэта спрэчкі паміж праваслаўнымі іншых краінаў. Калі гэты беларускі прэцэдэнт стане прымальным для іншых, напрыклад, для Украіны, там гэта выкліча вялікую напружанасьць. Ва Украіне ёсьць і руская праваслаўная царква, і аўтакефальная ўкраінская. А калі пабудова РПЦ там стане такой, як у Беларусі, тады Руская праваслаўная царква можа абвясьціць сваю прэтэнзію на Канкардат з Украінскай дзяржавай. Гэта дэнансуе аўтакефальную праваслаўную царкву ў гэтай краіне.

– Ці прэтэндуе праваслаўная царква ў Беларусі на вядучую ролю ў грамадзтве? Ці мае яна яе?

– І прэтэндуе, і мае. Нашая размова падыходзіць да праблемы закону аб свабодзе сумленьня і да дзяржаўнай палітыкі ў галіне канфесійных стасункаў. На маю думку, гэтая палітыка цалкам няправільная. Закон няправільны, бо ён робіць няроўнымі розныя канфесіі. А гэта недапушчальна ў нашыя часы. І веруючыя розных канфесіяў павінны быць роўнымі перад законам. Толькі гэта забясьпечвае свабоду веравызнаньня ў краіне. А свабода сумленьня – адна з самых фундаментальных свабодаў у краіне. Чалавек мае права вызнаваць любую рэлігію альбо не вызнаваць ніякай. Рэлігіі становяцца няроўнымі, як толькі адна царква падпісвае Канкардат з

дзяржавай і атрымлівае больш шырокія паўнамоцтвы. Напрыклад, праваслаўная царква мае права працаваць у школах, у месцах зьняволеньня, у войску. Гэтай магчымасьці ня маюць іншыя. Узьнікае напружанасьць.

Такая сітуацыя руйнуе і маральны стан асобных вернікаў, парушае раўнавагу ў грамадзтве. Гэта вельмі ўплывае на маральны стан людзей, якія зьяўляюцца сьвятарамі гэтай рэлігіі. Напрыклад, калі сьвятары могуць разьлічваць на фінансавую дапамогу з боку дзяржавы, ім ня трэба клапаціцца пра вернікаў і пра выхаваньне сваёй паствы. А з іншага боку, адкуль дзяржава мае гэтыя сродкі, каб падтрымліваць царкву? Гэта грошы з падаткаў, якія плацяць усе грамадзяне, у тым ліку і іншыя вернікі. Гэта падрывае давер да дзяржавы.

– Чым гэта пагражае?

– Такая сітуацыя можа кепскім чынам адбіцца на суверэнітэце нашай дзяржавы.

– Якое выйсьце з гэтай сітуацыі вы бачыце?

– Выйсьце звычайнае – зрабіць роўнымі ўсе канфесіі. І захоўваць свабоду сумленьня і веравызнаньня. Ня трэба вышукваць нейкія новыя юрыдычныя формы. Каталіцкі касьцёл павінен таксама заключыць Канкардат з беларускай дзяржавай. Беларуская праваслаўная царква павінна абвясьціць аўтакефалію, згодна з традыцыяй праваслаўя.

– А што рабіць прадстаўнікам пратэстанцкай канфесіі?

– А пратэстантам гэта ўвогуле не патрэбна. Пратэстантам трэба выконваць Канстытуцыю.

– Дык якая ж гэта роўнасьць?

– Канкардат заключаецца Беларускай дзяржавай таксама з дзяржавай Ватыкан. Пратэстанты ня маюць такога цэнтру ці органу, які мог бы выступіць у якасьці “другога боку” для падпісаньня дамовы з дзяржавай.

– Ці не прасьцей скасаваць існуючы дакумент? У выніку ўсе канфесіі ізноў апынуцца ў роўным стане…

– Скасаваць Канкардат паміж РПЦ і нашай дзяржавай ужо немагчыма. Я мяркую, што і ня трэба. Пасьля таго, як дамова заключаная, яна зьяўляецца пэўным юрыдычным прэцэдэнтам, казусам. Выхад з гэтага казусу немагчымы шляхам простага скасаваньня. Існуючую дамову трэба перагледзець ці заключыць новую.

Але хто павінен быць суб’ектам гэтай дамовы? Сёньняшняя дамова паміж РПЦ і Беларускай дзяржавай, якую падпісалі мітрапаліт Філарэт і беларускі прэм’ер-міністр, зьяўляецца юрыдычным нонсэнсам, бо толькі роўныя суб’екты могуць заключыць такую дамову. А пратэстанты павінны проста патрабаваць ад дзяржавы выкананьня Канстытуцыі.

– Які наступны ўзровень талерантнасьці?

– Вышэйшы ўзровень – тэалагічны і багаслоўскі. Гэта калі багасловы розных канфесіяў, кожны абапіраючыся на сваю ўласную традыцыю і разумеючы складаную канфесійную сітуацыю ў сваёй краіне, тым ня менш прызнаюць правы і асаблівасьці іншых вернікаў. Гэта таксама талерантнасьць. І краінаў, дзе такая талерантнасьць існуе, даволі няшмат. Такой талерантнасьці няма ў Расіі, у Польшчы. У Беларусі яна ёсьць, гэтаксама, як у Швейцарыі і Галандыі. Я мяркую, што гэта наш культурны здабытак, які ўзбагачае нашае рэлігійнае жыцьцё.

# ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ У КУЛЬТУРЫ І КУЛЬТУРА ТАЛЕРАНТНАСЬЦІ

Ірына Лаўроўская,

архітэктар, дактарантка Інстытуту Мастацтва Польскай Акадэміі навук (Брэст)

“І ўбачыў Бог, што гэта Добра” (Быцьцё:10,12,17,21,25,31)

У самыя бурлівыя часы разьвіцьця хрысьціянства паўстала большасьць з сучасных еўрапейскіх краінаў, у іх сям’і сфармавалася і нашая Айчына -- Беларусь. Шматнацыянальная культура беларускага народу сфармаваная на ўсьведамленьні супрацьлегласьці Дабра і Зла. Дабро — гэта Любоў, Жыцьцё, Свабода, Прыгажосьць. Дабро стварае, родзіць і адраджае, узносіць, пачынае, узвышае, кахае, адорвае... Зло — гэта Нянавісьць, Сьмерць, Рабства. Зло -- разбурае, прыніжае, ненавідзіць, зьнішчае... Калі ўспомніць прынцыпы Дабра, сфармуляваныя ў Старым і Новым Евангельлі, то лёгка заўважыць, што ўсе яны скіраваныя на адно — мірнае суіснаваньне (талеранцыю) кожнага стварэньня Божага на зямлі.

Стары Запавет засьцерагае: “ …Не зрабі сабе куміра, не забі, не пажадай жонкі, дому і чаго іншага бліжняга твайго”, бо ўсё гэта -- Зло. Разбой і крадзёж (грэх) былі ў тагачасным грамадзтве тым парушэньнем, якое трактавалася з найвялікшай суровасьцю . Новы Запавет навучае Дабру: “...Палюбі бліжняга свайго як сябе самога, любіце ворагаў вашых і блаславяйце зьневажаючых вас...” Хрысьціяне, прыняўшы гэтыя запаветы як каштоўнасьць, зьмяняліся самі і зьмянялі сьвет. Пад ўзьдзеяньнем хрысьціянства ў нашай краіне адбыліся надзвычайныя зьмены ў культурным, грамадзкім і палітычным жыцьці. Эпоха Адраджэньня — залаты век нашай Бацькаўшчыны -- вынікала з глыбокага ўсьведамленьня такіх каштоўнасьцяў, як Любоў і Свабода. Цыпрыян Базылік у 1569 годзе ў прадмове да кнігі, скіраванай Жыгімонту Аўгусту “Żywot Jerzego Kostryota, którego pospolicie Skandenbergom zową”, пісаў: “Калі Бог пажадаў адарыць стварэньне сваё — Чалавека, з найлепшых каштоўнасьцяў сьвету Ён абраў Свабоду” . Гэта сьведчыць, што ў часы Адраджэньня паняцьце Свабоды атаясамліваецца з Божай Міласэрнасьцю.

У той жа час Права, якое замацоўвала свабоды грамадзянаў, станавілася нормай грамадзкага і палітычнага жыцьця краіны. З разьвіцьцём хрысьціянства талерантнасьць замацоўвалася праз рэлігію, падтрымлівалася прававымі актамі. Першыя інстытуты сацыяльнай дапамогі (шпіталі для бедных), адукацыйныя ўстановы (калегіюмы, прыхадзкія школы) і г.д. паўставалі ў нашай краіне ўжо ў XV

стагодзьдзі на падставе галоўнага пастулату Новага Запавету “Палюбі бліжняга свайго як сябе самога” . Найлепшыя мастацкія творы (выяўленчае мастацтва, архітэктура, літаратура, паэзія, тэатр) адлюстроўвалі гісторыю (вопыт) стасункаў паміж асобамі (я — я; я -- ты), асобай (асобамі) і грамадзтвам (я — мы, я — яны, мы -- яны), асобай (асобамі) і Богам. Так, у правілах, распрацаваных у XVI ст. кс. Каралем Барамеўшам, прадпісвалася разьмяшчаць у прасторы храмы такім чынам, “каб кожны разумеў, што трэба Хвалу Богу ўзносіць”. Разнастайныя мастацкія творы перадаюць нам досьвед папярэдніх пакаленьняў, дакладна паказваючы разнастайныя формы Дабра і Зла, што суправаджаюць чалавецтва. Менавіта таму мастацтва зьяўляецца найбольш дзейсным сродкам ўзьдзеяньня на эмацыйную сферу жыцьця чалавека, ягонага выхаваньня.

Візуальная прастора Беларусі, як добра ілюстраваная кніга, багата насычаная мастацкімі творамі, якія самі сталіся сьведкамі барацьбы Дабра і Зла (маючца на ўвазе помнікі архітэктуры XV—XVIII стагодзьдзяў). Захоўваць гэтую “кнігу Ведаў” – справа гонару і годнасьці народу. На жаль, за апошнія 200 гадоў былі зьнішчаныя, зьняважаныя, перабудаваныя для неўласьцівых патрэбаў шмат якія храмы (розных рэлігіяў і канфесіяў), пабудаваныя нашымі продкамі на працягу XIV—XVIII стст . Абмінаючы праблемы палітычныя (падзел Рэчы Паспалітай, зьмены адміністрацыйнай, палітычнай мапы Еўропы ў XX стагодзьдзі і г.д.), адзначу, што адбылося гэта ў выніку падмены стваральнай талеранцыі культывацыяй бездухоўнасьці і нацыянальнай абыякавасьці. З пачатку 90-х, калі пачалося аднаўленьне цэркваў, разьвіваўся працэс глабальнай зьмены візуальнага асяродзьдзя Беларусі. Аднак на месцах разбураных храмаў пачалі будавацца храмы неўласьцівых для беларускай традыцыі формаў і канструкцыяў. Найчасьцей вельмі сімвалічна выкарыстоўваецца архітэктура псеўдарускага стылю, праекты, распрацаваныя ў палове XIX стагодзьдзя для “нованабытых земляў”. Паўстаюць таксама найбольш характэрныя для сярэдняй паласы Расіі. Пры незапоўненасьці рынку беларускімі выданьнямі для праваслаўных вернікаў катастрафічна хутка пашыраецца рынак рускай праваслаўнай літаратуры -- з шыкоўнымі ілюстрацыямі, відэа- і аўдыёдадаткамі. Усё б было добра, калі б гэта не было зьвязана са зьнішчэньнем нашай уласнай традыцыі і культуры. Узоры таго, што паўстала з Любоўю ў Расіі, зьяўляецца Дабром для рускага; але пабудаваныя ў Беларусі, зьвязваюцца ў нашай, беларускай, сьвядомасьці (а часьцей -- падсьвядомасьці са зьнішчэньнем, разбурэньнем) са Злом. Гэтая падмена сімвалаў Прыгажосьці, Дабра, Любові на сімвалы Зла (Нянавісьці, Разбурэньня) сее ў падсьвядомасьці асобы зерне ня творчасьці, а самазьнішчэньня, г.зн. -- Граху...

Талерантнасьць – гэта ўзровень нацыянальнай культуры. На жаль, я не магу канстатаваць, што ў нашай краіне талерантнасьць стала нормай жыцьця, бо талерантнасьць прадугледжвае ў першую чаргу павагу да самога сябе. У Беларусі мы часьцей сутыкаемся з праявамі адваротнымі тым, што занатаваныя ў Евангельлі “Палюбі бліжняга...”. У нашым грамадзтве нелюбоў як да сябе самога, так і да свайго бліжняга набыла самазьнішчальны ўзровень. Дазволю сабе прыпыніцца толькі на адной ілюстрацыі гэтага працэсу.

У 2003 годзе праз консульства Польшчы ў Брэсьце быў перададзены збор кніг у мясцовую бібліятэку. Падабраныя яны былі разам з брэсцкімі краязнаўцамі, гісторыкамі, мастацтвазнаўцамі і прысьвечаныя супольнай гісторыі нашых народаў. Кошт гэтага збору цяжка пераацаніць, калі заўважыць, што апошнім часам з новай літаратурай, тым больш замежнай, у нас цяжка. 500 кніг, грашовы кошт кожнай з якіх ня менш за 30 000 рублёў, на думку “органаў бясьпекі”, аказаліся пагрозай для дзяржавы . Чаму кнігі так ацэненыя, калі зьнішчэньне нацыянальнай спадчыны (як, напрыклад, руінаў кляштару бернардынак ў Брэсьце ці Косаўскага палацу, ці Белавежскай пушчы і г.д.), ліквідацыя беларускіх школаў і г.д да гэтага не прыцягвалі ўвагі КДБ? Таму што гэтая ўстанова запраграмавана для Дабра чужога . У сувязі з гэтым зацікаўленасьць зборам кніг не “на русском языке”, па сутнасьці — лагічная, бо менавіта на лацінскай, польскай, старабеларускай мовах, на ідыш захоўваецца Дабро (Стварэньне, Любоў, Прыгажосьць) для беларуса. На пералічаных вышэй мовах напісаная гісторыя Беларусі, дзе сьведчаць за нашую годнасьць у сьвеце гонар Скарыны, Міколы Гусоўскага, Шлома Лурыя Махаршала, Радзівілаў, Льва Сапегі, Тадэвуша Касьцюшкі... . Нават згадка імёнаў гэтых знакамітых людзей — пагроза для “Дабра чужога”, і таму памяць аб іх вынішчаецца, хаваецца ці разбураецца . Ці не таму ў трохсоттысячным Брэсьце зараз не хапае вуліцаў для ўшанаваньня памяці славутых землякоў, але ўшанаваная памяць дзеячоў рускай культуры, рэвалюцыі, рускіх і савецкіх вайсковых начальнікаў. У выніку — амярцьвеньне культурнага жыцьця, адсутнасьць матывацыі для адукацыі і годнай працы.

# “У ЛЮДЗЕЙ НЯМА ЎПЭЎНЕНАСЬЦІ, ШТО ЗАЎТРА БУДЗЕ СПАКОЙНЫМ…”

Пасьля прыняцьця новага Закону "Аб свабодзе веравызнаньня і рэлігійных арганізацыях" увосень 2002 году рэлігійны сьвет ў Беларусі аказаўся ў напружаньні, тэма свабоды сумленьня паўстала як ніколі востра.

Інтэрвью з Дзіянай Шаўцовай,

эксьпертам па пытаньнях свабоды сумленьня, юрыстам

(запісанае ў сакавіку 2003 году)

-- Спадарыня Дзіяна, скажыце, што адбываецца зараз на месцах? Наколькі зьмянілася апошнім часам жыцьцё памесных цэркваў?

-- Днямі пастар з Лепелю Георгі Салаўёў, былы вайсковец і аўтарытэтны чалавек у горадзе, распавёў мне, што ў іх адбывалася сустрэча ў вёсцы Слабодка Лепельскага раёну. На яе прыйшоў старшыня мясцовага сельскага савету Мікалай Сініца і абвінаваціў людзей, якія сабраліся, у парушэньні закону, і заявіў, што "калі яны прыходзяць у госьці да жанчыны, якой належыць дом, яны парушаюць дзеючае заканадаўства, займаюцца незаконнай прапагандай і агітацыяй, праводзяць багаслужэньні ў неўстаноўленым месцы". Пасьля гэтага ён агітаваў прысутных хадзіць у мясцовую праваслаўную царкву, аргументуючы гэта тым, што культ праваслаўя – ёсьць тое, што яны перанялі ад нашых продкаў, што яны павінны вызнаваць. "Калі будзеце яшчэ зьбірацца, наступным разам прыйду з міліцыяй", – папярэдзіў усіх старшыня і зьнік.

Пастар Георгі Салаўёў не сумняваецца, што гэта была ня проста ініцыятыва старшыні сельсавету, што ён прыходзіў па "наводцы" намесьніка старшыні Лепельскага райвыканкаму Веры Закрэўскай, якая вядомая сваім негатыўным стаўленьнем да вернікаў. Летам яна прыцягнула да адміністратыўнай адказнасьці баптыстаў, якія хадзілі па Лепелі і сьпявалі хрысьціянскія песьні. На адрас пратэстантаў з яе боку быў таксама шэраг вусных пагрозаў.

Практыка сьведчыць, што словы Станіслава Буко, старшыні Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў, у інтэрвью “Народнай газеце” (3 сьнежня 2002 г.), што “данная норма закона не утанавливает каких-либо ограничений для совместного чтения Библии по месту жительства кого-либо из верующих, равно как и для совместной молитвы всех проживающих в жилом помещении либо группы верующих” – папросту няпраўда.

Іншая думка ў старшыні аддзелу Менгарвыканкаму па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Алы Рабіцавай, і яна гэтага не хавае. На маё пытаньне, ці ёсьць абмежаваньне на правядзеньне гэтак званых хатніх групаў, яна сказала, што дзеля таго, каб па месцы жыхарства можна было праводзіць хатнюю групу, трэба атрымаць дазвол у мясцовым выканаўчым органе.

– Як сітуацыя можа разьвівацца далей? Якія пытаньні ў жыцьці цэркваў могуць стаць актуальнымі праз некалькі месяцаў?

– Праз некалькі месяцаў будуць ужо пэўныя першыя вынікі перарэгістрацыі рэлігійных арганізацыяў. У Законе закладзены такі механізм, які дазваляе абмяжоўваць дзейнасьць і рэгістрацыю новых рэлігійных арганізацыяў, а таксама неправамерна парашкаджаць перарэгістрацыі. У прыватнасьці, вялікія праблемы будуць у невялікіх цэркваў у сувязі з юрыдычнымі адрасамі. У мінулым годзе былі выпадкі, калі мясцовыя выканкамы беспадстаўна адмаўляліся ўзгадніць месца знаходжаньня рэлігійнай абшчыны ў жылым доме. Гэта вельмі проста для чыноўнікаў: выканкам вырашыў, і ўсё – у рэгістрацыі адмоўлена. Абскардзіць такое рашэньне практычна немагчыма.

З часам абвастраецца і іншае пытаньне – рэлігіязнаўчая эксьпертыза, якой падлягаюць статутныя дакументы ўсіх абшчынаў, якія рэгіструюцца ўпершыню і не ўваходзяць ні ў адно з зарэгістраваных аб'яднаньняў. Хоць у Законе сказана, што эксьпертыза праводзіцца, толькі калі рэгіструецца аб'яднаньне, якое "раней не было вядомае ў Беларусі". Вынік – тое, чаго дамагаюцца ўлады: адмова ў рэгістрацыі на падставе эксьпертных парадаў і рэкамендацыяў. Закон гэта цалкам санкцыянуе, паколькі ў якасьці прычыны дзеля адмовы ў рэгістрацыі ў ім прадугледжваюцца менавіта вынікі рэлігіязнаўчай эксьпертызы. Абскардзіць заключэньне практычна немагчыма.

Сітуацыя яшчэ ўскладняецца тым, што гэтая эксьпертыза ажыцьцяўляецца эксьпертным саветам пры Камітэце і мае статус дзяржаўнай. Дзеля таго, каб судзьдзі патлумачыць сутнасьць праблемы, трэба прыцягваць незалежных сьпецыялістаў. Але ўсё роўна, калі судзьдзя будзе разглядаць у якасьці доказу заключэньне нейкага асобнага сьпецыяліста – гэта толькі меркаваньне асобнага чалавека. Такое меркаваньне і заключэньне дзяржаўнай камісіі маюць розную вагу, і для суда гэты факт вельмі істотны.

Зараз у судзе Цэнтральнага раёну г.Менску разглядаецца справа Ісьцiннай праваслаўнай царквы і яе прыходу імя Іаана Кранштацкага. Абшчыне

Менаблвыканкам адмовіў ў рэгістрацыі менавіта на падставе заключэньня рэлігіязнаўчай эксьпертызы, якая была зробленая эксьпертным саветам пры Камітэце па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў. Абскардзіць такія рашэньні вельмі складана, бо фактычна эксьпертнае заключэньне непадуладнае нейкаму абскарджваньню і зьмяненьню.

– А "Метадычныя ўказаньні", якія выдадзеныя Камітэтам па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў? Гэты дакумент ня мае юрыдычнай сілы і тым ня менш навязваецца дзеля выкананьня рэлігійным абшчынам...

– Так, "Метадычныя ўказаньні" не абавязковыя да прымяненьня. Аднак, наколькі нам вядома, Камітэт па справах рэлігіяў правёў шэраг семінараў з абласнымі, раённымі выканаўчымі органамі, у чыёй кампетэнцыі будзе правядзеньне перарэгістрацыі на падставе менавіта гэтых метадычных указаньняў. Пра гэта нам сказаў сам начальнік аддзелу па спавах рэлігіяў Камітэту сп. Калінаў.

Аб’яднаньне абшчынаў Поўнага Евангельля падало дзьве скаргі на гэтыя ўказаньні ў Савет міністраў РБ з просьбай адмяніць супярэчныя заканадаўству акты ніжэйстаячых выканаўчых органаў (гаворка ідзе як пра парушэньні ў дзеяньні Камітэту, так і ў дадзеным дакуменце), а таксама заяву ў Пракуратуру рэспублікі з просьбай унесьці пратэст з нагоды незаконных дзеяньняў і супярэчнага закону нарматыўнага акту.

– Цікава, а што кажуць на гэта самі чыноўнікі, як каментуюць яны свае дзеяньні?

– На адной з сустрэчаў я задавала сп.Калінаву пытаньне, як будзе прымяняцца тое ці іншае палажэньне гэтых рэкамендацыяў, і як такое ўвогуле магло атрымацца, што Камітэт выдае і навязвае дзеля выкананьня дакумент, які ня мае юрыдычнай сілы. Зразумелага адказу на гэтае пытаньне не атрымала. Мяне гэта не зьдзіўляе, бо так адбываецца амаль заўсёды. Таксама на адным з паседжаньняў "круглага стала" па праблемах прымяненьня дзеючага заканадаўства РБ аб свабодзе сумленьня прадстаўнік амерыканскай амбасады Ян Тэрнер тройчы ў розных інтэрпрэтацыях задаваў сп.Калінаву пытаньне: "Што плануе рабіць дзяржава дзеля таго, каб захаваць раўнавагу, рэлігійны баланс у Беларусі пасьля падпісаньня пагадненьня з РПЦ?". Адказу прысутныя не атрымалі.

Чыноўнікі баяцца адкрыта казаць пра свае справы, таму што, на мой погляд, самі адчуваюць іх несправядлівасьць і незаконнасьць.

Тым часам пагадненьне паміж праваслаўнай царквой і дзяржавай ужо зараз прыносіць свае вынікі.

Напрыклад, адна з абшчынаў Украінскай рэфарматарскай царквы – абшчына Хрыста Збаўцы – зараз працуе ў Беларусі на ўзроўні хатняй царквы і мае намер рэгістравацца. У сувязі з гэтым сьвятар мяне пытае: “Ці ёсьць хоць нейкая магчымасьць зарэгістравацца як аўтаномная праваслаўная царква, улічваючы апошнія падзеі вакол Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы і заявы прэзідэнта краіны, што ён не дапусьціць падзелу ў праваслаўі?” Гэта значыць, што ў многіх людзей, якія ня маюць сёньня статусу з правамі юрыдычнай асобы і толькі плануюць зарэгістравацца, ёсьць вельмі шмат пытаньняў і сумненьняў.

Размаўляючы са сьвятарамі і прадстаўнікамі розных канфесіяў, адзначаеш, што людзі ў напружаньні з-за праблемаў вакол новага закону пасьля яго прымяненьня. Гэтым выкліканы стан невядомасьці наступстваў і няўпэўненасьці ў будучым. У іх шмат пытаньняў: зарэгіструюць аб'яднаньне ці не. У людзей няма ўпэўненасьці, што заўтра яны атрымаюць рэгістрацыйныя дакументы і будуць спакойна працаваць. Тым больш мы фіксуем шэраг фактаў ціску. На шчасьце, у нашай краіне ёсьць яшчэ судзьдзі, якія здольныя разабрацца ў сітуацыі і прыняць справядлівае рашэньне.

– Няўжо ёсьць выпадкі, калі судзьдзі апраўдвалі вернікаў, асуджаючы пры гэтым дзеяньні выканаўчай улады?

– Тое, якім чынам складаюцца пратаколы аб “правапарушэньнях”, сьведчыць, што міліцыянты абсалютна далёкія ад разуменьня Канстытуцыі і таго, што ў грамадзянаў ёсьць правы для сумеснага вызнаньня рэлігіі. Да таго часу, пакуль грамадзяне сваімі дзеяньнямі не парушаюць Закон, грамадзкі парадак, законныя правы і інтарэсы іншых грамадзянаў, яны могуць сумесна вызнаваць рэлігію, пры гэтым рэалізуючы свае законныя правы. Такога разуменьня ў нашым грамадзтве і ў прадстаўнікоў выканаўчай улады, на жаль, няма.

Яшчэ горш сітуацыя ў рэгіёнах, дзе ўсе адзін аднаго ведаюць, і, напрыклад, калі нейкаму чыноўніку нехта асабіста не падабаецца, ён пачынае свайго кума ці свата травіць на вернікаў. Так адбылося ў Лепельскім раёне, дзе адной супрацоўніцы райвыканкаму вельмі не падабалася, што вернікі зьбіраюцца па хатах. Яе муж-міліцыянт арганізаваў прыезд аператыўнікаў у камуфляжы, у бронежылетах, з аўтаматамі, якія ўварваліся ў кватэру з крыкам: “Каго браць?”.

Нядаўна падобны выпадак адбыўся ў абшчыне саентолагаў у Менску. У вячэрні час дахаты да адной з сяброў абшчыны прыйшлі ўчастковы міліцыянт Аляксандр Алдохін, супрацоўнік аддзелу па справах рэлігіі і нацыянальнасьцяў гарвыканкаму Валянціна Булоўкіна і яшчэ трое "інсьпектараў" – усяго пяць чалавек. На падставе

ўбачанага яны склалі пратакол аб прыцягненьні гаспадыні да адміністратыўнай адказнасьці. На судовым паседжаньні судзьдзя прызнала невінаватай гэтую грамадзянку. Суд адмяніў пастанову адміністратыўнай камісіі Першамайскага раёну, якая прыцягнула яе да адказнасьці па арт. 193 КаАП РБ (і нават выпісала ёй штраф), з-за адсутнасьці складу правапарушэньня, адзначыўшы пры гэтым шэраг працэсуальных парушэньняў у дзеяньнях службовых асобаў.

– Ці праўда, што ў новым школьным падручніку да сектаў залічаныя евангельскія хрысьціяне?

– Першымі “недакладнасьць” у новых падручніках для 11 класу заўважылі баптысты. Хваля паднялася ў Брэсцкай вобласьці. Там вернікі ініцыявалі ледзь не адкліканьне сваіх дзяцей са школы з-за гэтага падручніку, і паднялася моцная пратэстная хваля. Кваліфікавалі гэты факт, цалкам слушна з юрыдычнага пунку гледжаньня, як распальваньне рэлігійнай варожасьці. Зьмест падручніку стаў прадметам абмеркаваньня кіраўнікоў чатырох пратэстанцкіх саюзаў. У аднаго з іх, старшыні саюзу Поўнаевангельскіх цэркваў Аляксандра Саковіча сын вучыцца ў адзінаццатым класе па менавіта гэтым падручніку.

Працытую гэты самы падручнік ("Человек. Общество. Государство", учебное пособие для 11 класса общеобразовательных учреждений с русским языком обучения" ў чатырох кнігах, кніга чацьвёртая "Человек в мире культуры"), дзе на старонцы 111, у разьдзеле, прысьвечаным рэлігіі, у рубрыцы "Полезно знать" аўтар піша: "Хотя любая религия претендует на право обладания истиной, тем не менее особо благоприятные условия для проявления фанатизма создаются в деятельности сект. Секта – религиозная группа, отколовшаяся от того или иного направления и выступающая как оппозиционное течение по отношению к нему. Секты существуют во всех религиозных направлениях. Для сектантов характерны претензии на исключительность своей роли, доктрины идейных принципов, богоизбранность, изоляционизм. В нашей республике наибольшее распространение получили такие секты, как евангельские христиане-баптисты, христиане веры евангельской, пятидесятники, адвентисты седьмого дня, свидетели Иеговы". Далей інфармацыя пра новыя духоўныя аб’яднаньні. І гэта друкуецца пад грыфам: "Допущено Министерством образования РБ". Аўтарам працытаванага зьяўляецца Фонатава Э. А. Падручнік выдадзены пад рэдакцыяй доктара філасофскіх навук, прафесара Ю. А. Харына.

Пратэстанты маюць намер, як мінімум, зьвярнуцца ў Міністэрства адукацыі і ў Камітэт па справах рэлігіяў з нагоды распальваньня рэлігійнай варожасьці.

Наклад гэтай кнігі 147 200 асобнікаў, яна падпісаная ў друк 10 сьнежня 2002 г. Калі такое робіцца з літаратурай, па якой вучацца нашыя дзеці, то сітуацыя з дзяржаўнай прэсай, і як прыклад тут публікацыі Ніны Яновіч, ужо неяк адступае на другі план. Толькі па выпадку ў Старых Дарогах, пра які ўжо неаднаразова пісалася, выйшла 5 артыкулаў – скажоныя факты пра лёс дыякана царквы Ігара Арлоўскага. Пры тым, што ўжо адбыліся судовыя рашэньні, на якіх пацьверджана, што домыслы журналісткі не адпавядаюць рэчаіснасьці. Тым ня менш "факт" дзяржаўныя СМІ працягваюць “абсмоктваць”.

***

Суполкі Сьвядомасьці Крышны апынуліся па-за законам

Прыняты Закон “Аб свабодзе веравызнаньня і рэлігійных арганізацыях” ускладніў дзейнасьць крышнаітаў. Уся статутная дзейнасьць суполак Сьвядомасьці Крышны ў Рэспубліцы Беларусь аказалася па-за законам.

Пасьля прыняцьця Закону “Аб свабодзе веравызнаньня і рэлігійных арганізацыях” узьніклі праблемы пры ажыцьцяўленьні асноўных накірункаў дзейнасьці ўсіх суполак Крышны – па распаўсюду рэлігійнай літаратуры, ухваленьні імёнаў Бога (Хары, Крышна, Рама) і раздачы бясплатнай вегетарыянскай ежы. Вернікі робяць гэта на вуліцах, за гэта іх затрымлівае міліцыя, складае пратаколы аб адміністратыўных правапарушэньнях. Рэгістрацыя ў Беларусі новых супольнасьцяў сутыкаецца з непераадольнымі перашкодамі, вернікам пагражаюць звальненьнем з працы і псіхіятрычным шпіталем. У сувязі з немагчымасьцю рэгістрацыі аб’яднаньня супольнасьцяў узьнікла праблема запрашэньня ў Беларусь духоўных настаўнікаў – грамадзянаў іншых краінаў. У выніку суполкі знаходзяцца пад пагрозаю прыпыненьня дзейнасьці з перспектываю далейшага закрыцьця.

# “ДЗЯРЖАВА ПАРАДЖАЕ НЯРОЎНАСЬЦЬ...”

Беларусь – другая краіна ў СНД, якая заключае дамову з царквой. Першае падобнае пагадненьне было падпісанае ў Грузіі.

Дамову каментуе Дзіяна Шаўцова,

эксьперт па пытаньнях свабоды сумленьня, юрыст

(запісана ў лютым 2003 г.)

Зьмест самога гэтага дакументу не зусім зразумелы. “Хто з кім заключае дамову?” – узьнікае першае пытаньне. Наіўнае пытаньне. Прэзідэнт, як кіраўнік выканаўчай улады, падпісвае пагадненьне – гэта зразумела. Але што ўзначальвае Мітрапаліт Менскі і Слуцкі? У адпаведнасьці з законам, у нас ёсьць розныя віды рэлігійных арганізацыяў – рэлігійныя абшчыны, рэлігійныя аб’яднаньні, манастыры, брацтвы, місіі, духоўна-навучальныя ўстановы... Але падаваць проста, як гэта зроблена ў дакуменце: Беларуская праваслаўная царква – абстрактна і непісьменна. Закон патрабуе поўнай назвы рэлігійнай арганізацыі (від юрыдычнай асобы і канфесійную прыналежнасьць). У рэшце рэшт, чый разьліковы рахунак і юрыдычны адрас будзе стаяць... Вынікам такой блытаніны можа стаць тое, што “крайні” ў выпадку чаго, так і ня знойдзецца.

Прадмет гэтага пагадненьня таксама падаецца даволі цьмяным. Першае ўражаньне, што пагадненьне рамкавае і акрэсьлівае персьпектыўныя накірункі разьвіцьця стасункаў праваслаўнай царквы і беларускай дзяржавы. Аднак шэраг момантаў у гэтым дакуменце сьведчаць пра адваротнае.

Дамова ў першую чаргу павінна базавацца на нормах дзейснага заканадаўства. Гэта можа быць унутранае заканадаўства Рэспублікі Беларусь альбо міжнародныя дамовы, у якіх Рэспубліка Беларусь удзельнічае. Але пагадненьне ўтрымлівае тэрміны, якія мы не сустрэнем ні ў адным з нарматыўна-прававых актаў (законы, падзаконныя дакументы і г. д.): напрыклад, “кананічная тэрыторыя царквы”, “экспансія псеўдарэлігійных структураў”... Што стаіць за гэтымі словамі і дзе можна прачытаць, як раскрываюцца дадзеныя паняцьці, невядома.

Вось пачатак і першая цытата, якая адразу ж прыцягвае нашую ўвагу: “...Прызнаючы, што разьвіцьцё і ўмацаваньне супрацоўніцтва паміж Царквой і Дзяржавай адказвае інтарэсам беларускага народу”. І ніякага абгрунтаваньня, без якога за гэтымі словамі нічога, апроч пафасу, няма.

Далей яшчэ цікавей: “Улічваючы, што праваслаўе гістарычна зьяўляецца рэлігіяй большасьці беларускага народу...”. На гэты тэзіс хацелася б адказаць словамі "прафесара палітычных навук", вядомага абаронцы пазіцыяў праваслаўнай царквы Л.Землякова. Гэты "факт", па ягоных словах, вельмі адвольна выкарыстоўваюць і сьпекулююць ім. Аднак, калі пачытаць даклады Камітэту па справах рэлігіяў, дык высьвятляецца, што гэта 80 адсоткаў ад 50 адсоткаў грамадзянаў, якія лічаць сябе веруючымі. Ад агульнай колькасьці насельніцтва атрымліваецца ня больш за 35-40 адсоткаў. Гэта ўжо далёка ня большасьць. Да гэтага трэба дадаць і розныя крытэрыі, па якіх людзі да сябе прымяняюць катэгорыю “веруючы”. Паводле сацыялагічных апытаньняў, большасьць тых, хто лічаць сябе праваслаўнымі, толькі зрэдку наведваюць царкву. А тых людзей, якія сапраўды жывуць згодна вучэньню царквы, ня больш за 3-4 адсоткі.

Таксама слова “гістарычна” выклікае шэраг пытаньняў. Гэтую цытату ўвогуле неабходна аддаць навукоўцам на дапрацоўку дзеля атрыманьня сапраўдных аб’ектыўных дадзеных.

Далей пазначана, што дамова прымаецца “зыходзячы з неабходнасьці абароны праваслаўнай царквы ад экспансіі псеўдарэлігійных структураў…”. Што стаіць за гэтым тэзісам і што гэта можа спарадзіць на практыцы, мы зараз можам толькі здагадвацца. Але калі ўлічыць усе існуючыя на сёньняшні дзень фактары, то выльецца ўсё гэта ў нейкія кулуарныя інтрыгі, якія вынікаюць з нізкага ўзроўню прававой культуры, што ў рэшце рэшт можа прывесьці да таго, што адна царква “правільная”, а ўсе астатнія – гэта “псеўдарэлігійныя структуры”.

Таксама вельмі спрэчнае сьцьверджаньне аб тым, што пагадненьне базуецца на “прынцыпах пабудовы ўзаемаадносінаў Праваслаўнай царквы і сьвецкага грамадзтва, выкладзеных у кананічных нормах і асновах сацыяльнай канцэпцыі Рускай праваслаўнай царквы”. Любое пагадненьне павінна заключацца ў межах заканадаўства, як ужо было згадана, а не “кананічных нормаў” і асноваў “сацыяльнай канцэпцыі Рускай праваслаўнай царквы”. Нормы і асновы, вядома, варта ўлічваць, гэта можа праявіцца ў нейкіх пунктах дамовы, але заключацца яна павінна толькі ў межах дзейснага заканадаўства. Па-іншаму немагчыма. Да таго ж гэтай канцэпцыяй кіруецца толькі праваслаўная царква, і навязваць яе пры пабудове стасункаў з дзяржавай неправамоцна.

Вялікае месца складальнікамі дамовы адводзіцца пафасным выказваньням і беспадстаўным высновам. У арт.1, напрыклад, сьцьвярджаецца, што “царква зьяўляецца сацыяльным інстытутам, чый гістарычны досьвед, духоўны патэнцыял і

шматвекавая культурная традыцыя аказалі ў мінулым і аказваюць зараз вызначаючы ўплыў на фармаваньне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцыяў беларускага народу”. Дзе знайсьці падмурак дзеля такіх гучных заяваў, калі чалавек, просты грамадзянін, хоча ў гэтым пераканацца? Таксама міжволі ўзьнікае пытаньне: ці правамерна робіць дзяржава, як прадстаўнік інтарэсаў народу, у гэтым выпадку? Хто дэлегаваў ёй менавіта такія паўнамоцтвы? Мы што, правялі рэферэндум, дзе ўсе выказаліся “за”?

Таксама тое, што “духоўныя і культурныя каштоўнасьці, якія захоўвае царква, зьяўляюцца гістарычным здабыткам беларускага народу і асновай яго нацыянальнай ідэі”, лічу даволі спрэчным выказваньнем. Узьнікае падазраньне, што сваё ўнутранае ўладкаваньне РПЦ стараецца "прапіхнуць" у якасьці нацыянальнай ідэі, якая на сёньняшні дзень нідзе і ніяк не сфармуляваная. Тое, што датычнае толькі праваслаўнай царквы, паводле дамовы “павінна палягаць у аснове маральнага здароўя народу і паляпшэньня дэмаграфічнай сітуацыі”? На якіх скажыце падставах?

Наступнае: “Дзяржава зьяўляецца гарантам захаваньня духоўных і культурных традыцыяў беларускага народу, гістарычна сфарміраваных пад уплывам царквы”. Калі нехта зараз дакажа, што нейкія традыцыі (напрыклад п’янства, застольлі, гуляньні) сфарміраваліся пад уплывам праваслаўнай царквы, толькі тады гэты тэзіс будзе карэктным. А пакуль што нідзе не даказана, што нейкія традыцыі сфарміраваныя ў нас менавіта пад уплывам праваслаўнай царквы.

Таксама не абмінулі складальнікі і адукацыю. Калі, паводле дамовы, на сьвецкае выхаваньне будзе ўплываць праваслаўная царква, тады якое ж яно сьвецкае? Шмат якія пункты, як, напрыклад, “работа царкоўных і сьвецкіх сродкаў масавай інфармацыі” могуць пасьпяхова рэалізавацца і ў рамках сьвецкай дзяржавы. Хіба што толькі распрацоўшчыкі ня маюць на ўвазе праваслаўную цэнзуру ўсіх СМІ.

Ёсьць і некалькі зусім незразумелых момантаў. Напрыклад, задэкларавана, што “Прадстаяцель царквы карыстаецца недатыкальнасьцю” (як дэпутат, якога нельга арыштаваць?) альбо што “царква гарантуе тайну споведзі”. Няўжо каля спавядальні будзе стаяць міліцыянт? Ці спавядацца вернікі адразу будуць супрацоўнікам камітэту, каб тайну захаваць?

Ёсць таксама моманты, якія не дазваляюць кваліфікаваць дадзенае пагадненьне як рамкавае. У асноўным гэта тое, што тычыцца фінансавай дзейнасьці царквы. Напрыклад, што “дзяржава прадстаўляе юрыдычным асобам царквы права

на атрыманьне гуманітарнай дамамогі ў спрошчаным парадку”, што нідзе не прадугледжана ў заканадаўстве. Гэта дае падставу меркаваць, што пад пунктамі дамовы ёсьць рэальная глеба, і сам дакумент -- гэта проста легалізацыя існуючай дзейнасьці.

Відавочна, што праваслаўная царква ставіцца ў няроўнае становішча з іншымі канфесіямі. Адвольнае разуменьне і тлумачэньне палажэньняў гэтага пагадненьня ў бліжэйшым будучым можа прывесьці як мінімум да павелічэньня паўнамоцтваў чыноўнікаў на месцах. Апошні артыкул выглядае проста як зьдзек: “Бакі прызнаюць, што дадзенае пагадненьне заключаецца ў імя грамадзкага дабрабыту і ня мае на мэце ўціску ў правах якіх-небудзь канфесіяў ці веруючых грамадзянаў”. Уся папярэдняя практыка і шматлікія выпадкі ціску на ўсіх неправаслаўных даюць падставу меркаваць, што гэта ня больш чым дэкларацыя. Пры ўвядзеньні нормаў у жыцьцё, на думку юрыстаў, мы непазьбежна прыйдзем да гэтага ўціску. Ужо сёньня такое стаўленьне да праваслаўнай царквы нараджае ў грамадзтве напружанасьць і канфрантацыю, якія з часам будуць толькі павялічвацца.

З гэтай прычыны іншыя канфесіі, гледзячы на такія “цёплыя” стасункі РПЦ і дзяржавы, пачынаюць таксама прэтэндаваць на месца "пад сонцам". Натуральнае пытаньне: “Чым мы горш?” – выліваецца ў складаньне шматлікіх дамоваў, заяваў і пагадненьняў. Аднак іншы бок не сьпяшаецца з імі сябраваць. Дзяржава ў асобе сваіх прадстаўнікоў (Камітэту па справах рэлігіі і г.д.) заяўляе, што на такога кшталту пагадненьні могуць прэтэндаваць толькі традыцыйныя канфесіі, якія пералічаныя ў прэамбуле Закону. Так паступова фармуецца ў грамадзтве небясьпечная сітуацыя, якая ў нейкай крытычнай кропцы абавязкова ўзарвецца. Калі дзяржава параджае няроўнасьць, а такія дамовы фактычна яе і параджаюць, гэта перш за ўсё ўдарыць па ёй самой, а значыць, і адаб’ецца на кожным з нас.

# “СВАБОДЫ ВЕРАВЫЗНАНЬНЯ Ў ЯЕ НАЙПРОСТЫМ РАЗУМЕНЬНІ Ў НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ НЕ ІСНУЕ...”

Інтэрвью з Артурам Ліўшыцам,

сябрам Грамадзянскай ініцыятывы «За свабоднае веравызнаньне», юрыстам

(запісанае ў красавіку 2004 г.)

— Якія пытаньні цяпер найчасьцей абмяркоўваюцца ў рэлігійных асяродках?

— Камітэт па справах рэлігіяў вельмі зацікаўлены ў тым, каб усе рэлігійныя аб’яднаньні прайшлі перарэгістрацыю. Аднак ня ўсе хочуць прызнаваць новы закон, паводле якога праводзіцца перарэгістрацыя рэлігійных аб’яднаньняў. Некалькі пратэстанцкіх дэнамінацыяў ня пойдуць на перарэгістрацыю, бо лічаць новы закон дыскрымінацыйным.

Асноўная праблема для тых, што ідуць на рэгістрацыю, гэта рэгістрацыя юрыдычнага адрасу. Фактычна любы сход вернікаў у доме ці на кватэры падлягае забароне і штрафу. Свабоды веравызнаньня ў яе найпростым разуменьні ў нашай дзяржаве не існуе. Прасіць дазвол ва ўладаў дзеля нейкіх рэлігійных дзеяньняў у сябе дома – гэта проста абсурд. Але таго патрабуе заканадаўства.

— Ці ёсьць служба юрыдычнай дапамогі ў Камітэце па справах рэлігіяў?

— Наколькі я ведаю, там такой службы няма. Кожны раз, калі якая-небудзь з рэлігійных арганізацыяў ці суполак падае дакументы на перарэгістрацыю, у іх Статуты ўносяцца папраўкі. Часам нашыя юрысты з гэтымі праўкамі нязгодныя. Некаторыя арганізацыі, якія лічаць, што свае правы трэба адстойваць, не прымаюць гэтыя “заўвагі” Камітэту. А іншыя, якія хочуць проста і спакойна перарэгістравацца і працягваць працаваць далей, лічаць, што іх гэта ня тычыцца. Яны проста пагаджаюцца з патрабаваньнямі Камітэту. Грамадзянская ініцыятыва “За свабоднае веравызнаньне” адрозьніваецца тым, што ў яе ўваходзяць людзі розных дэнамінацыяў і рознай канфесійнай прыналежнасьці. Гэтыя людзі выступаюць не за прыярытэт нейкай рэлігіі, а проста за свабоду верыць. Свабода ад дзяржавы, неўмяшальніцтва ў рэлігійнае жыцьцё грамадзянаў, аддзяленьне царквы ад дзяржавы – гэта нашыя прынцыпы. На сёньняшні дзень гэтага ў Беларусі няма. Наадварот, стасункі дзяржавы і царквы будуюцца на вызначаных прыярытэтах. Зараз прыхільнасьць нашай дзяржавы даволі празрыстая. Ніхто не хавае, што ўлады аддаюць перавагу праваслаўнай царкве. Заключаны шэраг дамоваў РПЦ з рознымі

дзяржаўнымі ўстановамі. Аднак прапановаў і спробаў заключыць такое ж самае пагадненьне з іншымі канфесіямі няма.

— Як далей будзе працаваць Ініцыятыва?

— У нашыя планы ўваходзіць працяг працы па маніторынгу парушэньняў правоў вернікаў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Таксама мы робім маніторынг узаемаадносінаў дзяржавы і рэлігійных аб’яднаньняў. Матэрыялаў шмат. Кожны дзень нешта адбываецца.

Грамадзянская ініцыятыва «За свабоднае веравызнаньне» выступае за нераспальваньне нацыянальнай і рэлігійнай варожасьці, якое спрабуюць правакаваць некаторыя структуры. Мы бачым яскравы прыклад: кнігарня «Праваслаўная кніга», дзе на паліцах можна знайсьці антыпратэстанцкую і антыіўдэйскую літаратуру, якая скіраваная на распальваньне рэлігійнай варожасьці. Гэта кнігі ня толькі прывезеныя з Расіі, але і выдадзеныя на тэрыторыі Беларусі.

Таксама ў нашыя планы ўваходзіць арганізацыя грамадзкіх дыскусіяў з прадстаўнікамі розных рэлігійных арганізацыяў на тэму свабоды веравызнаньня.

# УНІЯ Ў БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЬЦЬ

Уладзімір Хільмановіч,

гісторык (Гродна)

Гістарычныя асьпекты

У 16 стагодзьдзі ўзьнік Маскоўскі патрыярхат, які адразу ж пачаў прэтэндаваць на ролю духоўнага цэнтру ўсходніх славянаў. Сярод рэлігійнай іерархіі на нашых землях, аднак, існавала моцнае імкненьне захаваць сувязь з заходнім хрысьціянствам. На гэта найперш мела ўплыў знаходжаньне тагачаснай беларускай дзяржавы – Вялікага Княства Літоўскага – паміж Усходам і Захадам. Уся наша культура зьяўляецца сьведчаннем гэтага.

Пачатак перманентных войнаў паміж ВКЛ і Маскоўскім Княствам стварыў неабходнасьць кансалідацыі нацыі, таму пачалі рабіцца канкрэтныя крокі да стварэньня рэальнай уніі з Рымам. Менавіта на гэтым гістарычным тле ў 1596 годзе і была падпісаная Брэсцкая царкоўная Унія. Праваслаўная царква на землях Беларусі і Украіны арганізацыйна аб'ядналася з каталіцкай царквой на ўмовах падпарадкаваньня Рымскаму Папу і прыняцьця каталіцкай дагматыкі пры захаваньні праваслаўнай абраднасьці.

Грунтоўную характарыстыку зьявы знаходзім у беларускага эміграцкага гісторыка Язэпа Найдзюка (“Беларусь учора і сёньня”): “Пашыраная царкоўная Унія ахапіла велізарную бальшыню праваслаўных беларусаў. Яна, аднак, не знайшла прызнаньня з боку каталіцкага духавенства. Каталіцкая Польшча глядзела на яе як на веру “ніжэйшую”, “хлопскую”(...), калі ж гэтая Унія набрала беларускага характару, дык палякі ставіліся да яе варожа. Уніяцкае духавенства бачыла гэта і замкнулася ў сваім собскім коле. Гэтая акалічнасьць, з аднаго боку, а славянская мова і багаслужэньні, царкоўныя абрады, беларуская мова ў казаньнях, цесная сувязь уніяцкага духавенства з народам, з другога, паступова зрабілі з Уніі сапраўды нацыянальную царкву. Але калі гэта ўжо стала фактам, Унія гвалтам нішчылася”.

Уніяцкая царква была сьведчаньнем царкоўнай еднасьці з апостальскай сталіцай і носьбітам візантыйскай традыцыі на беларускіх землях. Адначасова яна была часта адзіным сховішчам і апякункай беларускай культуры, мовы і нацыянальнай тоеснасьці. На працягу 17-18 стст. адбывалася разьвіцьцё Уніі. Напрыклад, у першай палове 17 стагодзьдзя ў горадзе Ліда дзейнічалі ажно 4 грэка-каталіцкія царквы – Сьвятога Яна, Сьвятога Мікалая, Сьвятога Спаса і царква Прачыстай Багародзіцы. Усе гэтыя цэрквы згінулі падчас вайны з Расіяй 1654-1667 гг.

Пасьля працяглай аблогі і абстрэлу з гарматаў летам 1659 году расійскае войска штурмам узяло Лідзкі замак і цалкам спаліла горад. У 1658 годзе цар загадаў свайму віленскаму ваяводу Міхайлу Шахоўскаму “из города Вилны и из иных городов и мест, которые к Вилне близко, униятов всех, кто где живёт... высылать вон тотчас, и заказ учинить крепкой, чтоб впредь униятов нигде не приймовали и высылали их вон, чтобы от них в вере каких расколов не было”. Сабраўшы ўніятаў, ваявода абвесьціў ультыматум: або яны перахрысьцяцца ў праваслаўе, або іх выганяць. Спазнаўшы такую “талеранцыю”, беларусы да канца 17 стагодзьдзя амаль цалкам перайшлі ў Унію. Напрыклад, на 1827 г. у Лідзкім павеце было 18 уніяцкіх цэркваў і адзін манастыр, якія мелі 22 496 прыхаджанаў вернікаў. Усяго было і дзейнічала 55 базыльянскіх манастыроў, якія пашыралі асьвету. Шырокую вядомасьць набылі базыльянскія школы. Ордэн выдаваў кнігі ў сваіх друкарнях у Вільні, Супрасьлі, Менску.

Палітыка кіруючых колаў Рэчы Паспалітай у дачыненьні да ўніяцкай царквы мела неадназначны, часам супярэчлівы характар і шматразова мянялася ў залежнасьці ад грамадзка-палітычных варункаў. З аднаго боку, улады падтрымлівалі Унію, бо яна адпавядала палітыцы цэнтралізацыі дзяржавы, з іншага – імкнуліся злучыць грэка-каталіцкую царкву ў адзінае з рымска-каталіцкай.

Наступ на Унію пачаўся адразу ж, як толькі землі Беларусі былі акупаваныя Расійскай імперыяй. Старыя беларускія кнігі зьбіраліся па ўсіх парафіях і паліліся. Мітрапаліт Іосіф Сямашка піша ў сваіх “Запісках”, што толькі за 3 гады было сабрана і спалена па яго загадзе больш за 2000 беларускіх старадрукаў. Замест беларускіх кніг у Расіі друкаваліся новыя, на рускай мове. У 1840 г. было забаронена прамаўляць казаньні па-беларуску, і біскупы пачалі патрабаваць ад сьвятароў, каб нават у прыватным паўсядзённым жыцьці тыя карысталіся толькі рускай мовай. Шмат вернікаў не вытрымлівала такога ціску і пераходзіла ў Рымска-каталіцкую царкву. У другой палове 1830-х пачалася перадача ўніяцкіх храмаў праваслаўнай царкве, а пасьля Полацкага сабору 1839 году ўніяцкая царква была гвалтоўна ліквідаваная.

Адным з першых асьветнікаў і адраджэнцаў Уніі зьяўляўся Кастусь Каліноўскі. Ён сапраўды быў зацятым апалагетам адраджэньня ўніяцтва. “...Ні адзін ужэ, можа, забыўся, што бацька яго быў яшчэ справядлівай уніяцкай веры і ніколі ўжэ не спомніць на тое, што перавярнулі яго на сызму (схізму – аўт.), на праваслаўе, што ён сягодня, як той сабака, жыве без веры...” (Мужыцкая праўда № 6). І далей, там жа, зьвяртаючыся да Бога: “Выжані маскаля з нашага краю, дай нам праўдзівую вольнасьць і веру нашых дзядоў і прадзедаў, а касьцёлы, што маскаль, нячыста яго

сіла, параскідаў альбо перарабіў на стайні і цэркві, зноў заясьнеюць тваёю хвалой...”. Каб зразумець Каліноўскага, трэба ўлічваць кантэкст гістарычнай эпохі. Пасьля кароткай канфесійнай адлігі, якую Беларусь зазнала за часам расійскага імператара Паўла I (1796-1801 гг.), і пэўнага лібералізму Аляксандра I, цараваньне Мікалая I (1825-1855 гг.) было часам жорсткага рэлігійнага ўціску. Калі адбылося скасаваньне Уніі, расійскія праваслаўныя цэрквы сталі асяродкамі палітычнай прапаганды імперскай палітыкі Масквы. Каліноўскі гадаваўся ў гэты час, юнак меў дапытлівы розум, пазьней атрымаў добрую адукацыю. Падчас вучобы ў Пецярбургу і Маскве Каліноўскі разам са сваім старэйшым братам Віктарам, таленавітым архівістам, меў мажлівасьць вывучаць унікальныя дакументальныя матэрыялы, якія паказвалі сутнасьць гістарычных дачыненьняў Расіі і Рэчы Паспалітай. Адсюль зыходзіў сьветапогляд правадыра паўстанцаў.

Адраджэньне Грэка-каталіцкай царквы ў Беларусі пачалося толькі ў 1920-х гадах. Актыўнымі дзеячамі на ніве адраджэньня ўніяцтва былі біскуп (пазьней, пасьля сьмерці, быў прызнаны благаслаўлёным) Юры Матулевіч, рымска-каталіцкія ксяндзы Язэп Германовіч (Вінцук Адважны), Ільдафонс Бобіч, Вінцэнт Гадлеўскі, Адам Станкевіч, Уладыслаў Талочка, асабліва шмат зрабілі сьвятары Андрэй Цікота і Леў Гарошка. Прыхільна ставіліся да ідэі ўніяцтва і многія беларускія грамадзка-палітычныя дзеячы. У Заходняй Беларусі былі створаныя місіянерскія цэнтры ў Альбярціне (зараз у межах Слоніму), Вільні, Друі, Пінску. У 1927 годзе налічвалася 14 уніяцкіх прыходаў, у 1932 – 36 прыходаў.

У 1939 годзе ўкраінскі мітрапаліт Андрэй Шаптыцкі стварыў пад сваёй юрысдыкцыяй Беларускі грэцка-каталіцкі экзархат на чале з выдатным хрысьціянскім сьвятаром-асьветнікам Антонам Неманцэвічам. У лістападзе 1941 году Папа Пій XII зацьвердзіў яго апостальскім адміністратарам для каталікоў усходняга абраду ў Беларусі. Але неўзабаве, у 1942 годзе, Неманцэвіч быў арыштаваны фашыстамі і пазьней забіты. Дзейнасьць экзархату такім чынам гвалтоўна прыпынілася, і епархіяльных структураў беларускіх уніятаў далей не было. Прыхільнікі ўніяцкай царквы былі змушаныя эміграваць альбо “растварыцца”.

Толькі з канца 1980-х, калі пачалося масавае легальнае адраджэнне ўніяцкай царквы на Украіне, у Беларусі пачаўся рух за аднаўленьне ўніяцкіх суполак. Ініцыятарамі іх стварэньня сталі моладзь і інтэлігенцыя. Напрыклад, у Гродна суполка паўстала ў 1992 годзе, з часам суполкі зарганізаваліся ў іншых гарадах. Трэба падкрэсьліць, што прыходы фармаваліся як беларускамоўныя рэлігійныя асяродкі. Важным фактарам стала і афіцыйнае зацьверджаньне Ватыканам у 1994 годзе беларускамоўнай версіі літургічных тэкстаў. Значна ўзрасла цікавасьць да

вывучэньня ўніяцкай царквы. Варта адзначыць працы і артыкулы такіх дасьледчыкаў, як Анатоль Грыцкевіч, Сьвятлана Марозава, Сямён Падокшын, Сяргей Абламейка, Уладзімір Конан, Іван Саверчанка, Леанід Лыч, Уладзімір Сосна.

Аднак апошнія гады тэма вывучэньня гісторыі ўніяцкай царквы ў акадэмічных і навуковых асяродках па зразумелых прычыных стала, што называецца, зноў “непажаданай”. А ў некаторых праваслаўных аўтараў заўважаецца празьмерная тэндэнцыйнасьць. Прыкладам, у аднаго паважанага аўтара сустракаем наступнае: “...Другой мэтай маёй працы зьяўляецца ня толькі імкненьне разьвеяць міф аб Уніі як нацыянальнай веры, а і знайсьці ў Уніі тыя фактары, што былі станоўчымі для нашага нацыянальнага адраджэньня”. Варта разьвеяць абсурднасьць самой дэфініцыі “Унія – нацыянальная вера, беларуская рэлігія”, што можна скрозь сустрэць ня толькі ў публіцыстыцы, але і ў навуковай (ці яна такой зьяўляецца?) літаратуры. Таксама такой жа ненавуковай і абсурднай зьяўляецца дэфініцыя “праваслаўе – нацыянальная вера, беларуская рэлігія”, бо ня трэба блытаць канфесійнае і нацыянальнае. Іншымі словамі, рэлігія ня можа быць нацыянальнай паводле азначэньня. Іншая рэч, што тая ці іншая канфесія, плынь можа спрыяць альбо не спрыяць нацыянальнаму адраджэньню і разьвіцьцю.

Сёньняшні стан ГКЦ у Беларусі

У адпаведнасьці з падпарадкаваньнем Грэка-каталіцкай царквы Ватыкану, гэтая канфесія падначаленая апостальскай сталіцы. Кіраваньне ажыцьцяўляецца праз апостальскага візітатара, якім зьяўляецца айцец Сяргей Гаек. На чале БГКЦ у Беларусі стаіць дэкан. Значны час на гэтай пасадзе быў сьветлай памяці айцец Ян Матусевіч. Цяпер БГКЦ кіруе Протапрэсвітар айцец Віктар Данілаў, намесьнік – манах айцец Лявонці з Полацку.

БГКЦ дзейнічае як аўтаномная абшчына. Вышэйшай “заканадаўчай” структурай зьяўляюцца дэканацкія канферэнцыі – сустрэчы сьвятароў. Трэба падкрэсьліць, што дэканат, у які структурна аб’яднаныя ўніяцкія суполкі, не зацьверджаны сьвецкай уладай. У Беларусі пакуль няма інстытуту экзархату. Патрэбнае яго юрыдычнае афармленьне і адпаведнае зацьверджаньне Рымам. Цікава, што аналагічны экзархат створаны ў Расіі, на чале яго стаіць экзарх, протапрэсьвітар айцец Сяргей Галаванаў. У Маскве зараз дзейнічаюць 3 парафіі, а на тэрыторыі ўсёй Расіі – 11. У жніўні 2004 году прайшоў сабор грэка-каталіцкіх сьвятароў Расіі (5 чалавек). У лістападзе таго ж году ў Гатчыне адбыўся сабор міранаў грэка-католікаў расіянаў. Для параўнаньня: на Украіне, дзе разьвіцьцё Уніі фактычна не перапынялася, зараз налічваецца каля 4-

4,5 млн уніятаў. Назіраецца "пасоўваньне" і пашырэньне гэтай канфесіі на ўсход краіны.

У Беларусі зараз працуе 10 сьвятароў і 13 зарэгістраваных прыходаў (плюс 2 незарэгістраваныя). Уніяцкія прыходы ёсьць у Баранавічах, Брэсьце, Віцебску, Гомелі, Гродна, Івацэвічах, Лідзе, Магілёве, Маладзечна, Менску, Полацку. Агулам яны налічваюць каля тысячы вернікаў. Зважаючы на недахоп душпастараў, каля 10 чалавек вучацца на сьвятароў, акрамя таго ёсьць два кляштары ў Полацку – мужчынскі і жаночы. Душпастарам для беларускіх вернікаў-уніятаў у замежжы зьяўляецца апостальскі візітатар Аляксандар Надсан, які жыве ў Лондане.

У 2004 годзе прайшла перарэгістрацыя БГКЦ на агульнанацыянальным узроўні. Выпрацаваны агульны адзіны Статут (раней кожная суполка мела свой статут).

Умовы разьвіцьця і зьнешнія варункі

Умовы разьвіцьця БГКЦ сёньня ў Беларусі не зьяўляюцца спрыяльнымі. Асноўныя праблемы акрэсьлім тэзісна:

- адмоўнае стаўленьне дзяржавы;
- неталеранцыя з боку праваслаўнага сьвятарства;
- мінімальная дапамога (альбо яе поўная адсутнасьць) з боку Рымска-каталіцкага касьцёлу;
- недахоп інфармацыі пра жыцьцё БГКЦ з-за ўціску на незалежныя медыі;
- востры недахоп храмаў і сьвятароў;
- неталеранцыя і слабая зацікаўленасьць навукоўцаў уніяцкай праблематыкай;
- слабая ангажаванасьць інтэлігенцыі і грамадзка-палітычнай эліты ў рэлігійнае жыцьцё.

Калі казаць пра зьнешнія фактары, то назваць іх спрыяльнымі таксама нельга. З Захаду – моцнае прапольскае лобі ў Ватыкане, з Усходу – выразна варожае стаўленьне і ўплывы РПЦ (Рускай праваслаўнай царквы). Можна сказаць, што інтарэсы гэтых бакоў у дачыненьні да БГКЦ супадаюць. Так, у 1993 годзе было падпісанае так званае Баламанскае пагадненьне. Ужо ва ўводзінах надрукаваных матэрыялаў міжнароднай багаслоўскай камісіі выразна напісана: "Яшчэ ў чэрвені 1990 году на сустрэчы ў Фрайзінгу наконт метаду, які называецца "ўніяцтвам", было заяўлена наступнае: "Мы адкідаем яго як метад пошуку адзінства, таму што ён супярэчыць агульнай традыцыі нашых Цэркваў". Далей у эклезіялагічных прынцыпах, якія выклала камісія, сама ідэя Уніі адмаўляецца: "У сувязі з тым, што

каталікі і праваслаўныя наноў разгледзелі сваё стаўленьне да таямніцы Царквы і зноў убачылі, што яны Цэрквы-сёстры, то... форма “місіянерскага апасталату”, названая “ўніяцтвам”, ня можа быць болей прынятая ні як метад, ні як мадэль адзінства, да якога імкнуцца нашыя Цэрквы”.

На жаль, назіраецца і неразуменьне большасцю сутнасьці сёньняшняй уніяцкай царквы ў Беларусі на сумежнай Беласточчыне, дзе праваслаўная канфесія ў свой час (але ня сёньня!) была значным гарантам нацыянальнай тоеснасьці. Уніяцкая царква вельмі інтэнсіўна разьвіваецца на Украіне, але падтрымка беларускіх уніятаў мінімальная.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што разглядаць уніяцкую царкву ў Беларусі можна толькі праз аналіз агульнагістарычнага разьвіцьця нашай краіны ў розныя часы, праз сёньняшнія геапалітычныя, унутраныя дзяржаўныя і канфесійныя рэаліі. А сфера ацэнкі кожнай канфесіі, рэлігійных дачыненьняў – надзвычай тонкая рэч, якая патрабуе значнай далікатнасьці і зычлівасьці на ўсіх узроўнях – пабытовым, царкоўным, навуковым.

Літаратура:

Архіў уніяцкіх мітрапалітаў. Дакументы да гісторыі царквы ў Беларусі XVI-XX стст. у фондах гістарычных архіваў Украіны. Мінск-Полацк, 2001 г.

Астапенка Анатоль. Паслухайце нацыяналіста. Vilnius, 2000 г.

Дмитрук К. Е. Униатские крестоносцы: вчера и сегодня. М., 1988 г.

З гісторыі ўніяцтва ў Беларусі (да 400-годдзя Брэсцкай уніі). Мн., 1996 г.

Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выданне. Мн., 1992 г.

Из истории униатской церкви. Гомель, 1993 г.

Кастусь Каліноўскі. За нашую вольнасьць (творы, дакументы). Мн., 1999 г.

Марозава С. Уніяцкая царква ў культурна-гістарычным разьвіцьці Беларусі (1596-1839 гг.). Гродна, 1996 г.

Найдзюк Язэп, Касяк Іван. Беларусь учора і сёньня. Мн., 1993 г.

Падокшын С. А. Унія. Дзяржаўнасьць. Культура. Філасофска-гістарычны аналіз. Мн., 1998 г., 2-е выданьне Мн., 2000 г.

Пануцэвіч Вацлаў. Сьвяты Язафат, архіяпіскап полацкі. Полацак, 2000 г.

Паўлаў Міхаіл. Забойства Іасафата Кунцэвіча. Віцебск, 1996 г.

Рэлігія і царква на Беларусі. Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001 г.

Саверчанка І. Апостал яднаньня і веры /Язэп Руцкі/. Мн., 1994 г.

“Унія”, часопіс №1-5, Мн., 1990-1995 гг.

Уніяцтва як спосаб аб’яднаньня ў мінулым і пошукі поўнага адзінства сёньня. Баламан, 1993 год. Матэрыялы міжнароднай зьмешанай багаслоўскай камісіі.

# СВАБОДА ВЕРАВЫЗНАНЬНЯ: МІЖНАРОДНЫЯ СТАНДАРТЫ І ВОПЫТ ШВЕЦЫІ

Нанна Холст,

сябра Svenska Freds

Міжнароднае заканадаўства ў галіне свободы веравызнаньня

Пачнем з Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека -- вядомага дакументу, прынятага ААН. У артыкуле 18 Дэкларацыі гаворыцца пра тое, што кожны чалавек мае права на свабоду меркаваньня, сумленьня і рэлігіі, а таксама пра права чалавека мяняць свае веравызнаньне і погляды. Далей гаворыцца пра тое, што кожны чалавек мае права адкрыта праяўляць свае рэлігійныя і іншыя перакананьні ў адукацыі, практыцы, цэрымоніях і абрадах. У адрозненьні ад Канвенцыяў і Пратаколаў, пра якія гаворка пойдзе далей, краіны, якія падпісалі Дэкларацыю, не абавязаныя выконваць яе палажэньні.

У Міжнародным пакце пра грамадзянскія і палітычныя правы гаворка таксама ідзе пра свабоду веравызнаньня. Гэта права ўключае ў сябе свабоду спавядаць і прымаць рэлігійныя і іншыя перакананьні, а таксама свабоду адкрыта праяўляць свае рэлігійныя і іншыя перакананьні ў цэрымоніях, абрадах, практыцы і адукацыі. Толькі ў выпадку наяўнасьці адпаведных законаў, а таксама неабходнасьці абараніць грамадства, грамадзкі парадак і дабрабыт, маральныя асновы ці асноўныя правы і свабоды іншых членаў грамадства, дапускаюцца абмежаваньні. Падобны падыход да абмежаваньняў уласьцівы розным канвенцыям, напрыклад, Еўрапейскай Канвенцыі правоў чалавека, якая таксама будзе разглядацца далей.

Міжнародны Пакт пра эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы абавязвае дзяржавы, якія дамаўляюцца, роўным чынам забясьпечваць выкананьне правоў, якія дэкларуюцца ў Пакце, без абумоўленых рэлігіяй адрозьненьняў.

Існуюць Камісіі, якія наглядаюць за тым, як дзяржавы выконваюць свае абавязкі па Міжнароднаму пакту пра грамадзянскія і палітычныя правы, а таксама па Міжнароднаму пакту пра эканамічныя, сацыяльныя і культурныя правы. Камісіі рыхтуюць справаздачы аб тым, як дзяржава выконвае свае абавязкі. Аднак у адносінах да дзяржаваў, якія не выконваюць абавязацельствы па Канвенцыі, нельга ўжыць санкцыі. Дадзеныя справаздачы грунтуюцца на справаздачах аб выкананьні ўказаных правоў, якія прадастаўляюцца дзяржавамі. Часам паралельная справаздача рыхтуецца няўрадавымі арганізацыямі.

Таксама існуе Дэкларацыя аб выкараненьні ўсіх формаў нецярпімасьці і дыскрымінацыі на падставе рэлігіі альбо перакананьняў. Дадзеная Дэкларацыя носіць больш практычны характар і ўключае ў сябе свабоду вырабляць, атрымліваць і выкарыстоўваць неабходныя матэрыялы, якія адносяцца да рэлігійных абрадаў і звычаяў.

Праблемай большасьці Канвенцыяў зьяўляецца адсутнасьць дакладных азначэньняў маральных асноваў, і ў якім выпадку іх парушэньне можа служыць прычынай увядзеньня абмежаваньняў у адносінах свабоды веравызнаньня. Аднак Еўрапейская Канвенцыя правоў чалавека прадугледжвае Суд, які можа выносіць рашэньні, абавязковыя для выкананьня ўсімі краінамі-ўдзельніцамі.

Удзельнічаць у Еўрапейскай Канвенцыі правоў чалавека могуць толькі краіны, якія зьяўляюцца членамі Савету Еўропы. Але для таго, каб атрымаць членства ў Савеце, краіна павінна прытрымлівацца дэмакратычных прынцыпаў, а яе жаданьне і здольнасьць абараняць правы чалавека не павінны выклікаць сумненьняў.

У выпадку немагчымасьці вырашыць спрэчную сітуацыю ў інстанцыях уласнай краіны-ўдзельніцы дадзенай Канвенцыі, бок можа зьвярнуцца з адпаведнай просьбай ў Еўрапейскі Суд. Суд разглядае зьвязаныя як з палажэньнямі Канвенцыі справы, так і ўжо вынесеныя судовыя рашэньні. Гэта азначае, што Суд можа прыцягнуць да адказнасьці дзяржаву, якая падпісала Канвенцыю, у тым выпадку, калі інстанцыі дадзенай дзяржавы не змаглі забясьпечыць гарантаваных Канвенцыяй правоў.

Свабода веравызнаньня гарантуецца артыкулам 9 названай Канвенцыі. Як ужо было сказана раней, абмежаваньні дапускаюца толькі ў выпадку наяўнасьці адпаведных законаў, а таксама адчувальнай дэмакратычным грамадзтвам неабходнасьці забясьпечыць сваю бясьпеку, абараніць грамадзкі парадак і дабрабыт, маральныя ўстоі ці асноўныя правы і свабоды іншых членаў грамадзтва.

Гэтая Канвенцыя таксама зьмяшчае артыкул, які забараняе дыскрымінацыю, абумоўленую рэлігійнымі прычынамі.

У тым выпадку, калі краіна-ўдзельніца не забясьпечвае выкананьня дэклараваных правоў, Суд мае права разглядаць дзеяньні такой дзяржавы і вынесьці рашэньне аб выплаце пацярпелым асобам кампенсацыі. У такіх сітуацыях дзяржавы надаюць Канвенцыі вялікае міжнароднае значэньне.

Канвенцыя 111, якая тычыцца дыскрымінацыі на працоўным месцы, разглядае дыскрымінацыю, абумоўленую рознымі прычынамі, у тым ліку рэлігійнымі. У ёй

разглядаюцца пытаньні найму, занятасьці і ўмовы занятасьці. У ёй гаворыцца, што краіны-ўдзельніцы абавязаныя вынішчаць усе віды дыскрымінацыі, якія адносяцца да вышэйуказанай галіны, а таксама абвяшчаецца неабходнасьць імкненьня да забесьпячэньня роўных умоваў працы.

У 2003 годзе ўсім дзяржавам-членам Еўрапейскага Союзу прыйшлося праверыць сваё заканадаўства на адпаведнасьць дырэктывам Савету 2000/43/EG і 2000/78/EG, якія забясьпечваюць рэалізацыю прынцыпу роўнага абыходжаньня, незалежна ад расавай і этнічнай прыналежнасьці, а таксама ўстанаўліваюць агульныя прынцыпы роўнага абыходжаньня на працоўным месцы, разглядаючы дыскрымінацыю на падставе рэлігійных пераканаьняў, інваліднасьці, узросту і сексуальнай арыентацыі. З гэтай прычыны многім дзяржавам прыйшлося правесьці рэвізію свайго заканадаўства.

Таксама існуе Пратакол 12-ай Еўрапейскай Канвенцыі, якая мае адносіны да пытаньняў дыскрымінацыі. Гэты Пратакол ня быў ратыфікаваны Швецыяй, у асноўным таму, што ён носіць занадта агульны і неакрэсьлены характар.

Свабода веравызнання ў Швецыі

У другой палове XIX стагодзьдзя Швецыя прыняла два законы, якія дазволілі ёй прайсьці наперад у накірунку свободы веравызнаньня, але першы сапраўдны закон аб свабодзе веравызнаньня зьявіўся толькі ў 1951 годзе.

Таксама цікавым фактам зьяўляецца тое, што першай замежнай царквою, чыя дзейнасьць была дазволеная на тэрыторыі Швецыі (1617 год), стала Руская праваслаўная царква (праўда, толькі для замежных грамадзянаў).

Швецкая царква ўяўляе сабой арганізацыю евангельска-лютэранскай накіраванасьці. Да моманту адмежаваньня Швецкай царквы ад дзяржавы ў 2000 годзе яна зьяўлялася афіцыйнай дзяржаўнай царквою. У 2000 годзе за кошт царкоўнага падатку сталі фінансавацца і іншыя рэлігійныя арганізацыі. Ужо некалькі гадоў выплата гэтага падатку носіць добраахвотны характар. Калі вы не зьяўляецеся членам рэлігійнай арганізацыі, то вам не абавязкова яго плаціць.

Дзякуючы іміграцыі, рэлігійныя погляды сур’ёзна зьмяніліся за апошнія некалькі дзесяцігодзьдзяў; але хрысьціянства застаецца самай распаўсюджанай рэлігіяй. Швецкая царква зьяўляецца пратэстанцкай, аднак многія жыхары зьяўляюцца членамі свабодных цэркваў, такіх, як рух пяцідзесятнікаў і баптызм.

Другой па колькасьці пасьлядоўнікаў рэлігіяй у Швецыі пасьля хрысьціянства зьяўляецца іслам. Многія вернікі – гэта імігранты з Ірану, Іраку, Турцыі, былой Югаславіі і Самалі.

Паколькі прыналежнасьць да пэўнай рэлігіі ў Швецыі не рэгіструецца, колькасная статыстыка адсутнічае.

У Швецыі таксама атрымалі распаўсюджаньне буддызм і індуізм, у асноўным дзякуючы іміграцыі з Індыі, Уганды, Вьетнаму, Шры-Ланкі і Тайланду.

Свабода веравызнаньня адназначна дэкларуецца як неад’емнае права чалавека. Але што такое рэлігія, у чым адрозьненьне рэлігійных традыцыяў ад культуры, дзе знаходзіцца мяжа паміж імі? Напрыклад, яшчэ два гады таму шлюбны ўзрост у Швецкім заканадаўстве вызначаўся па-рознаму для шведаў і замежных грамадзянаў. Аднак шлюбны ўзрост вызначаецца хутчэй асаблівасьцямі культуры і да свободы веравызнаньня прамых адносінаў ня мае.

А як паводзіць сябе ў сітуацыі, калі свабода веравызнаньня адных супярэчыць свабодзе веравызнаньня іншых, ці калі гвалт зьяўляецца складовым элементам рэлігіі? Няпростае пытаньне. Да прыкладу, швецкія законы забараняюць жаночае абразаньне, нават калі некаторыя спасылаюцца на свабоду веравызнаньня пры гэтым.

У 2003 годзе шырокі рэзананс атрымаў выпадак, зьвязаны са свабодай веравызнаньня ў школах: дзьве дзяўчыны-мусульманкі зьявіліся ў школе цалкам захінутыя чадрой, нават твары. Рашэньне, прынятае Дэпартаментам школьных установаў па гэтай праблеме, гаворыць: Каран прадпісвае жанчынам захінаць свае валасы, але ня твар, таму наяўнасьць чадры, якая закрывае твар, можа рэгулявацца адпаведнымі школьнымі правіламі.

Шмат спрэчак узьнікае таксама і вакол статусу рэлігійных школаў: поводле прынятага ў 1999 годзе закону, дзяржава фінансуе дзейнасьць ня толькі муніцыпальных школаў, але і ўсіх іншых.

Яшчэ адным істотным пытаньнем для абмеркаваньня, зьвязаным са свабодай веравызнаньня ў Швецыі і на Захадзе ўвогуле, зьяўляецца тэма рэлігійнай свабоды для мусульманаў у кантэксьце ўзрастаючага жаху перад ісламам. Напрыклад, часта абмяркоўваецца пытаньне існаваньня мячэцяў. У падобных выпадках у мэтах так званай барацьбы з тэрарызмам дзяржавы часта адыходзяць ад дэклараваных прынцыпаў правоў чалавека.

Швецкія законы ў галіне свабоды веравызнаньня:

У Акце аб дзяржаўным кіраваньні, адным з чатырох законаў Швецкай Канстытуцыі, дэкларуецца свабода як аднаго чалавека, так і групы людзей спавядаць рэлігію. Гэта свабода носіць абсалютны характар. Любы грамадзянін таксама абаронены ад прымусу раскрываць свой рэлігійны сьветапогляд. Таксама дэкларуецца забарона дыскрымінацыі.

Адносна міжнароднага права прымяняюць два прававых падыходы. Гаворка ідзе пра маністычную і дуалістычную сістэмы. У дуалістычных прававых сістэмах, як у Швецыі, нацыянальныя органы судовай улады не выкарыстоўваюць міжнародныя канвенцыі. Дзяржава бярэ абавязкі выконваць палажэньні канвенцый толькі ў адносінах іншых краінаў-удзельніц. Аднак канвенцыі могуць быць зьмененыя ці інкарпараваныя, і тым самым атрымаць статус нацыянальнага заканадаўства. Але нават калі падпісаныя канвенцыі і дырэктывы прыводзяць, як у Швецыі, да ўзьнікненьня толькі міжнародных абавязкаў у галіне правоў чалавека, дзяржава, якая ратыфікавала пазначаныя пагадненьні, у любым выпадку абавязаная выконваць нормы пазначаных прававых актаў. На сёньняшні час адзінай Канвенцыяй, інкарпараванай у швецкае заканадаўства, зьяўляецца Еўрапейская Канвенцыя правоў чалавека.

У Швецкім Крымінальным кодэксе ёсьць артыкул, які прадугледжвае юрыдычную адказнасьць прадпрымальніка, які дапусьціў са свайго боку факт незаконнай дыскрымінацыі ў адносінах да якой-небудзь асобы на падставе расавай, нацыянальнай ці этнічнай прыналежнасьці ці рэлігійных перакананьняў. Дзеяньне гэтага палажэньня распаўсюджваецца як на наёмных працоўных, так і на тых, хто выступае ад імя прадпрымальніка. Гэты закон дзейнічае таксама і ў адносінах да чыноўнікаў і асобаў, якія выконваюць публічна-прававыя абавязкі. Дыскрымінацыя па пазначаных вышей прычынах зьяўляецца дзеяньнем, якое караецца ў крымінальным парадку, і для арганізатараў сходаў ці мітынгаў. Незаконная дыскрымінацыя караецца штрафам ці зьняволеньнем на тэрмін да аднаго году.

У адпаведнасьці з Крымінальным кодэксам, суд, прыняўшы да ўвагі матывы правапарушальніка, можа вынесьці і больш жорсткае рашэньне. Напрыклад, у выпадку злачынства на рэлігійнай глебе, як, напрыклад, падпальваньне сінагогі. Статыстычныя дадзеныя сьведчаць пра тое, што кожны год па дадзеным артыкуле выносіцца каля 10 прысудаў. Аднак, паколькі гэтае палажэньне не заўсёды ўзгадваецца ў прысудзе, уяўленьне рэальнай сітуацыі носіць неакрэсьлены характар.

Урад у Швецыі прызначае амбудсмэна, у абавязкі якога ўваходзіць незалежнае вывучэньне фактаў дыскрымінацыі.

У адпаведнасьці з законам, амбудсмэн па пытаньнях этнічнай дыскрымінацыі разьбірае факты дыскрымінацыі, абумоўленыя этнічнай прыналежнасьцю і рэлігійнымі перакананьнямі. У абавязкі амбудсмэна ўваходзіць права на кансультацыю і іншая дапамога асобам, пацярпелым ад дыскрымінацыі, з тым, каб яны мелі магчымасьць рэалізаваць свае правы. Напрыклад, гэтая дапамога можа ўключаць у сябе прадастаўленьне інфармацыі, сустрэчы з ўладамі і працадаўцамі. Скаргі на дыскрымінацыю могуць быць пададзеныя непасрэдна амбудсмэну. Аднак у выпадку дыскрымінацыі на працоўным месцы скарга можа быць пададзеная і ў прафсаюз, сябрам якога зьяўляецца асоба.

Закон аб мерах супрацьдзеяньня этнічнай дыскрымінацыі рэгламентуе пытаньні, якія адносяцца як да галіны этнічнай дыскрымінацыі, так і да галіны дыскрымінацыі на рэлігійнай глебе. Закон абавязвае працадаўцаў і наёмных працаўнікоў імкнуцца да выкараненьня дыскрымінацыі на працоўным месцы. Працадаўцу варта актыўна садзейнічаць прасоўваньню этнічнай і рэлігійнай разнастайнасьці. Напрыклад, пры найме новых працоўных ён не павінен дапускаць прамой ці ўскоснай дыскрымінацыі на падставе этнічнай прыналежнасьці ці веравызнаньня. У адносінах да працоўных працадаўцу забараняецца ўжываць падвойныя стандарты. Больш за тое, менавіта працадаўца абавязаны даказваць адсутнасьць дыскрымінацыі. У выпадку выяўленьня ў кантракце дыскрымінацыйных абмежаваньняў ён можа быць ануляваны ці зьменены адпаведным чынам, а ў адносінах да працадаўцы могуць быць выкарыстаныя санкцыі, якія абавязваюць яго выплаціць кампенсацыю. З мэтай нагляду над выкананьнем закону ўрад прызначае ня толькі амбудсмэна па пытаньнях этнічнай дыскрымінацыі, але і фармуе Раду па пытаньнях дыскрымінацыі. Пры атрыманьні скаргі амбудсмэн спачатку робіць спробу ўпэўніць працадаўцу кіравацца нормамі закону, а Рада мае права прыняць рашэньне аб спагнаньні штрафу ў выпадку разгляду справы ў адміністратыўным судзе. У некаторых выпадках амбудсмэн мае права ініцыяваць судовы працэс, аднак у большасьці выпадкаў да гэтага справа не даходзіць. Разгледзім прыклад адной этнічнай шведкі, якая перайшла ў іслам. Па тэлефоне ёй была прапанаваная праца, аднак пры асабістай сустрэчы працадаўца, убачыўшы на ёй чадру, адмовіўся прыняць яе на працу. Амбудсмэн перадаў справу ў суд па працоўных спрэчках, які прызнаў працадаўцу вінаватым у парушэньні закону.

Таксама існуе Акт аб роўным абыходжаньні са студэнтамі ў вышэйшых навучальных установах, які быў прыняты з мэтай выкараненьня дыскрымінацыйных

абмежаваньняў у сектары вышэйшай адукацыі. За выкананьнем дадзенага закону сочаць чатыры амбудсмэны: амбудсмэн па пытаньнях этнічнай дыскрымінацыі, амбудсмэн па пытаньнях дыскрымінацыі, абумоўленай сексуальнай арыентацыяй, амбудсмэн па пытаньнях роўных магчымасьцяў і амбудсмэн па справах інвалідаў. Дадзены закон мае ў асноўным тое ж дзеяньне, што і закон, які рэгламентуе пытаньні найму і занятасьці.

Скаргі, атрыманыя амбудсмэнам па пытаньнях этнічнай дыскрымінацыі, адносяцца ў асноўным да дыскрымінацыі, абумоўленай этнічнай прыналежнасьцю, а не веравызнаньнем.

У разьвіцьцё названых вышей Дырэктываў Еўрапейскага Саюзу ў Швецыі быў прыняты новы закон. Ён пачаў дзейнічаць у 2003 годзе і носіць хутчэй рамачны характар, вызначаючы падыходы да рашэньня праблемаў у галіне дыскрымінацыі на падставе этнічнай прыналежнасьці, веравызнаньня, сексуальнай арыентацыі і інваліднасьці. Гэты закон забараняе дыскрымінацыю ў розных галінах, уключаючы сферу занятасьці, прадпрымальніцкую дзейнасьць, атрыманьне пасьведчаньняў аб прафесійнай годнасьці. Акрамя таго, забаронена ўводзіць дыскрымінацыйныя абмежаваньні ў адносінах да наведвальнікаў рэстаранаў і крамаў, а таксама адмаўляцца прадаваць кватэру па прычыне прыналежнасьці пакупніка да мусульманскай веры.

Аднак гэтыя законы рэгламентуюць ня ўсе сферы дзейнасьці. Напрыклад, адсутнічае прававое рэгуляваньне пытаньняў дыскрымінацыі ў сярэдняй школе, што часам можа стацца праблемай.

У Законе аб замежных грамадзянах Швецыя выкарыстоўвае азначэньне ўцекача, прынятае ў Канвенцыі Арганізацыяй Аб’яднаных Нацый за 1951 год, якое кажа, што любая асоба, якая абаснавана асьцерагаецца ганеньня па прычынах сваіх рэлігійных перакананьняў, можа прэтэндаваць на статус уцекача. У адпаведнасьці з Законам аб замежных грамадзянах, уцекачы могуць разьлічваць на прытулак у Швецыі.

# ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ У НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЬЦІ

Андрэй Казакевіч,

палітолаг

Сучаснае грамадзтва часта сутыкаецца з сітуацыяй, калі паводзіны людзей прыводзяць да павелічэньня напружаньня і канфліктаў. Задача дзяржавы (грамадзкіх структураў) бачыцца ў механічным пераадоленьні з выкарыстаньнем улады ня толькі супярэчнасьцяў, але і поглядаў, якія выклікаюць канфлікты. У прынцыпе, толькі гэта можа гарантаваць грамадзкі мір. Розныя сацыяльныя групы павінны навучыцца думаць па-новаму, магчыма, весьці новы лад жыцьця для ўстанаўленьня новага балансу, які павінен гарантаваць палітычны і сацыяльны спакой. Такія дзеяньні санкцыянуюцца ўладамі і шмат у чым грунтуюцца на маніпуляцыі. Але яны непазьбежныя ў сучасным грамадзтве.

Дыскусіі аб талерантнасьці (асабліва ў рамках міжнародных структураў) зьяўляюцца асобным прыкладам зьмены сьвядомасьці для павелічэньня сацыяльнай стабільнасьці. З аднаго боку, масавы прыток у краіны Захаду эмігрантаў робіць неабходным правядзеньне праграмаў па іх інтэграцыі ў новы жыцьцёвы асяродак, а таксама фармаваньне іх пазітыўнага іміджу сярод карэннага насельніцтва. З другога боку, абвастрэньне міжнацыянальных адносінаў прывяло да вострых канфліктаў у розных рэгіёнах сьвету – Балканы, Каўказ, Руанда і г.д. Урэгуляваньне гэтых канфліктаў часта зьяўляецца ня толькі прадметам нацыянальнай, але і міжнароднай бясьпекі.

Паняцьце «талерантнасьць» выкарыстоўваецца менавіта для таго, каб у агульных рысах акрэсьліць пажаданы (бесканфліктны) стан грамадзтва.

Талерантнасьць

Недаверлівае стаўленьне да «чужых» – этнічных і нацыянальных групаў – вядомая гістарычная зьява. Частка антычных аўтараў зьвязвалі падзеньне нораваў і агульны заняпад Рымскай дзяржавы з пранікненьнем «чужых» (усходніх) элементаў культуры, і таму яны самі часта выступалі супраць усходніх культаў. Старажытныя грэкі (гэта, у прыватнасьці, адзначана ў працах Арыстоцеля) наогул лічылі «ня грэкаў» (варвараў) людзьмі ніжэй за сябе і ўспрымалі іх як ідэальных рабоў.

Як фенамен і як праблема талерантнасьць зьяўляецца толькі ў сучаснасьці і найбольш выразна выступае пасьля Другой сусьветнай вайны. Талерантнасьць становіцца часткай ідэалогіі правоў чалавека і сучаснай дэмакратыі, зьвязанай, перш

за ўсё, з праблемамі нацыянальнай цярпімасьці і пазьней – з цярпімасьцю да мігрантаў. У 70-х гадах акрэсьліваюцца цярпімасьць да розных іншых групаў. Цярпімасьць – гэта катэгорыя, якая зьяўляецца ў грамадзтве, дзе ўзьнікае праблема інтэграцыі і дзе такая інтэграцыя выгодная.

Перад тым, як перайсьці да разгляду асноўнай тэмы дадзенага артыкулу – талерантнасьць у нацыянальнай супольнасьці – некалькі словаў неабходна сказаць пра азначэньне самога слова «талерантнасьць».

У большасьці еўрапейскіх моваў слова талерантнасьць (tolerancia, tolerance) азначае ня толькі цярпімасьць, але і розныя формы дапушчальнага адхіленьня ад стандартнай вагі, памеру, дапушчальнае адхіленьне ў паказаньнях прыбору і г.д.

Напрыклад, у Расійскай імперыі цалкам нармальна маглі ставіцца да існаваньня размоўнай мовы меншасьцяў, але разьвіцьцё літаратурнай мовы часта ўспрымалася як пагроза. У Францыі прымальна ставіліся да факту існаваньня брэтонскай супольнасьці, але выкарыстаньне брэтонскай мовы ў адукацыі было праблематычным. Публічная маніфестацыя брэтонскай ідэнтычнасьці таксама лічылася непажаданай.

Думаю, што такое разуменьне найбольш адэкватна адлюстроўвае сутнасьць талерантнасьці як сацыяльнага фенамену. Талерантнасьць – гэта дапушчальнае адхіленьне ад сацыяльнага стандарту, якое прымаецца грамадзтвам і лічыцца нармальным і прымальным, г.зн., тое адхіленьне, непадобнасьць, адрозьненьне, да якога грамадзтва (група) ставіцца цалкам цярпіма. Менавіта ў такім значэньні мы ўжываем гэтае слова, калі называем нейкае грамадзтва «талерантным» (гэта значыць, грамадзтвам, у якім дапушчальнае адхіленьне ад сацыяльных звычак і стандартаў дастаткова вялікае) і «неталерантным» (калі дапушчальнае несупадзеньне з усталяванымі нормамі мінімальнае). Напрыклад, у адных грамадзтвах разьвіцьцё рэгіянальных моваў – зьява цалкам нармальная, а ў другіх яно разглядаецца як пагроза суверэнітэту і цэласнасьці.

Такім чынам, талерантнасьць – гэта цярпімае стаўленьне да прадстаўнікоў розных сацыяльных групаў у праяўленьні іх «іншасьці», адрозьненьні ад «звыклага» для дадзенага грамадзтва. Таксама гэта разуменьне і павага асаблівасьцяў, традыцыяў, якія здымаюць патрэбу ў пераўтварэньні «іншых» (напрыклад, прадстаўнікоў іншай расы альбо нацыянальнасьці), іх высяленьні, асіміляцяі, сегрэгацыі, падаўленьні і ўспрыняцьці як нейкай пагрозы, чужога і г.д.

У сучаснай мове палітыкі і сродкаў масавай інфармацыі талерантнасьць часта атаясамліваюць з «барацьбой за талерантнасьць», гэта значыць актыўнай пазіцыяй асобы па адстойваньні (ці пашырэньні) рамак талерантнасьці ў грамадзкім жыцьці. Прызнаючы істотнасьць гэтага працэсу, неабходна адзначыць яго занадта ідэалагічную нагружанасьць, якая перашкаджае аналізу талерантнасьці як сацыяльнага фенамену. Актыўная сацыяльная пазіцыя па «мадэляваньні» талерантнасьці грамадзтва, як правіла, стымулюецца ўладаю ці грамадзкімі структурамі, але непасрэдна да самой талерантнасьці ніякага дачыненьня ня маюць. Далей мы будзем выкарыстоўваць паняцьце «талерантнасьць» толькі ў яго першым значэньні.

Нацыянальная супольнасьць (як і любая група) фармуецца на супрацьпастаўленьні «мы – яны», гэта значыць, на пэўнай культурнай (палітычнай, моўнай) мяжы паміж сваім і іншым (чужым). Такая мяжа зьяўляецца, відаць, фундаментальнай для грамадзтва і вядомая з самых раньніх этапаў яго ўзьнікненьня, што пацьвярджаюць шматлікія дасьледваньні ў галіне антрапалогіі, этналогіі і гісторыі. Ужо першабытныя плямёны мелі ўяўленьне пра сваё паходжаньне (гэта праявілася, у прыватнасьці, у наяўнасьці татэмных жывёлаў), рытуалах і звычаях, адрозных ад суседзяў. Гэта значыць, яны мелі тое, што мы зараз называем ідэнтычнасьцю. Такія адрозьненьні фармавалі этна-племянную сьвядомасьць, якая паступова эвалюцыянавала ў этна-палітычную (Старажытны Егіпет, Рым, Кітай) і нацыянальную.

Аднак супрацьпастаўленьне «мы – яны» можа мець рознае палітычнае і сацыяльнае значэньне, ад натуральнага імкненьня захаваць сваю ідэнтычнасьць і культуру да праяваў ксенафобіі і нецярпімасьці. Гісторыя ведае як прыклады цалкам мірнага суіснаваньня дастаткова розных нацыянальнасьцяў (шумеры і semіты, народы ў межах Вялікага Княства Літоўскага), так і крывавага супрацьстаяньня, якое можа цягнуцца стагодзьдзямі (ірландцы і англічане, туркі і грэкі).

Чаму на пэўным этапе нацыянальныя групы пачынаюць разглядацца як небясьпечныя, чужыя, і чым яны, уласна кажучы, пагражаюць?

Перш за ўсё, іншанацыянальныя групы могуць разглядацца як патэнцыяльная пагроза суверэнітэту. Напрыклад, у пачатку 90-х існаваньне сербскай аўтаноміі (Сербскай Краіны) у Харватыі разглядалася як пагроза нацыянальнай цэласнасьці. Урад імкнуўся «выдавіць» сербаў са сваёй тэрыторыі. Сербія, у сваю чаргу, разглядала дамінаваньне албанцаў у Косава як крыніцу сепаратызму, што прывяло

да ліквідацыі аўтаномнага статусу краю ў 1989 годзе і ўвядзеньня прамога праўленьня з Белграду ў 1990.

Французскія «правыя» бачаць у імігрантах з былых калоніяў пагрозу існаваньню Францыі як дзяржавы, тым больш, што частка ісламскіх арганізацыяў гэтай краіны адкрыта абвяшчаюць сваёй мэтай ісламізацыю новай радзімы. Дэмаграфічны ўціск з боку нацыянальнай групы можа яшчэ больш узмацніць напружанасьць. Напрыклад, існуюць дэмаграфічныя прагнозы, што ў Македоніі пры захаваньні існуючага ўзроўню нараджальнасьці праз 30-40 гадоў албанцы стануць большасьцю, што непазьбежна прывядзе да зьменаў у палітычнай прыродзе Македонскай дзяржавы. Як правіла, боязь за нацыянальны суверэнітэт вядзе да імкненьня ці «выселіць» непрымальную нацыянальную групу, ці яе асіміляваць. Першае, як правіла, немагчыма з-за ўціску міжнароднай супольнасьці, другое неэфектыўна, як паказвае прыклад Францыі. Відаць, краінам Еўропы ў бліжэйшы час прыйдзецца зьмірыцца з парушэньнем нацыянальнай аднароднасьці іх суверэнітэтаў. Гэта мае пад сабой аб’ектыўныя эканамічныя і дэмаграфічныя прычыны.

Нацыянальная супольнасьць (меншасьць) можа разглядацца як фактар эканамічнага ўціску, які пазбаўляе карэннае насельніцтва працоўных месцаў, больш высокай заработной платы і г.д. Эканамічныя прычыны зьяўляюцца часам галоўнай крыніцай канфліктаў (асабліва ў асяродку саміх эмігрантаў), аднак у разьвітых краінах эмігранты займаюць найменш прэстыжныя і нізкакваліфікаваныя працоўныя месцы. Найбольшую небясьпеку для захаваньня сацыяльнага міру прадстаўляе менавіта характар такой працы, які аўтаматычна ставіць цэлыя нацыянальныя групы на ніжэйшы прыступак сацыяльнай іерархіі. Гэта прадвызначае негатыўнае стаўленьне больш прывілегіяванай большасьці і рост недаверу з боку меншасьцяў. Яны – ніжэйшыя ў сацыяльнай іерархіі, малаадукаваныя і г.д. Да гэтага далучаюцца розныя гістарычныя моманты. Напрыклад, пра каўказцаў пачынаюць гаварыць як пра агрэсіўных людзей, пра славянаў – як пакорлівых, а пра цыганаў – як пра прыродных маргіналаў. Эканамічная стыгматызацыя нацыянальных групаў зьяўляецца вялікай праблемай для іх адаптацыі ў адзіны дзяржаўны арганізм, менавіта на пераадоленьне гэтай зьявы павінна быць накіраваная палітыка.

Адсутнасьць талерантнасьці вельмі часта прыводзіць да супрацьлеглых вынікаў – адраджэньня (узмацненьня) этнічнай (рэлігійнай) ідэнтычнасьці. Эмігранты могуць весьці практычна такі ж лад жыцьця – не наведваць мячэці і г.д., але грамадзтва ўсё адно не прымае іх цалкам.

Талерантнасьць грамадзтва – гэта ягоныя рамкі. Вядома, тэарэтычна можна сканструяваць грамадзтва бяз рамак, як гэта робяць анархісты і частка лібералаў, але ў лепшым выпадку гэта ўтапічная ідэя, а ў горшым – звычайная ідэалагічная схема, якая ня мае пад сабой рэальнага ўвасабленьня. У большасьці выпадкаў, калі мы гаворым пра талерантнасьць, мы маем на ўвазе межы і іх пашырэньне.

Талерантнасьць – гэта ўласьцівасьць пэўнага грамадзтва (супольнасьці), якую можна зьмяняць і мадэляваць разам са зьменамі грамадзкіх адносінаў.

Варта дастаткова асьцярожна ставіцца да азначэньняў і стэрэатыпаў кшталту «сярэднявечнае грамадзтва было неталерантным». У прынцыпе, тое грамадзтва было значна больш цярпімым, напрыклад, да вар’ятаў і жабракоў (маргіналаў), чым сучаснае, пра што падрабязна пісаў М. Фуко. Рамкі дазволенага і «нармальнага» для кожнага грамадзтва розныя, і іх механічнае ўраўніваньне можа быць дастаткова ўмоўным.

* * *

Інтэрвью з Андрэем Казакевічам:

– Кажуць, што ёсьць талерантыя і неталерантныя грамадзтвы. Але ці сапраўды так?

– Кожнае грамадзтва адначасова зьяўляецца талерантным і неталерантным. Проста ў розныя часы яно прымае адныя рэчы і не прымае нешта іншае. Напрыклад, некаторы час таму па ўсёй Еўропе і ЗША можна было піць піва і паліць на вуліцы, і гэта нікога не абражала. Зараз у некаторых гарадах гэта забаронена. Але дазволена іншае: напрыклад, дэманстрацыя сексуальнасьці, што, натуральна, не талераваліся некалькі дзясяцігодзьдзяў таму.

– З часам нешта забараняецца, нешта дазваляецца. Ці сьведчыць гэта пра тое, што грамадзтва становіцца больш вольным?

– Усё вельмі адносна. Вельмі шырокае тлумачэньне тэрміну “талерантнасьць” – гэта “цярплівасьць да іншых”. Пад “іншымі” трэба разумець прадстаўнікоў розных рэлігіяў, нацыянальнасьцяў, расаў, прыхільнікаў палітычных перакананьняў і г.д. Можна аналізаваць розныя ступені талерантнасьці ў грамадзтве ў адносінах да кожнай з гэтых групаў. Да гэтага трэба ведаць, што само разуменьне теларантнасьці і ейны ўзровень вельмі моцна залежаць ад стану грамадзтва і ад таго, на якой гістарычнай стадыі яно знаходзіцца. Бо, напрыклад, у 19 стагодзьдзі тое, што зараз належыць талераваць (напрыклад, разьвіцьцё лакальных супольнасьцяў, лакальнай

нацыянальнай ідэнтычнасьці, субэтнічнасьці альбо пытаньні, якія тычацца сексуальных і сацыяльных меншасьцяў), тады рэпрэсавалася. І гэта было цалкам натуральнай зьявай. Зараз такія рэпрэсіі лічацца ненармальнымі, і з імі змагаюцца.

– З чым зьвязаная гэтая зьмена?

-- Я ня думаю, што зьмену трэба зьвязваць з разьвіцьцём свабоды, дэмакратыі і правоў чалавека. Асноўная прычына -- эканамічныя і культурныя працэсы. Талерантнасьць патрэбная для эфектыўнага функцыянаваньня сучаснай цывілізацыі, якая ўжо зараз шмат у чым пабудаваная на прынцыпах глабалізацыі. Натуральна, што ў такой сітуацыі некаторыя праявы нацыянальнай самадастатковасьці ці выключнасьці проста пазбаўленыя магчымасьці для існаваньня. Існуе кантакт паміж народамі, таму такія праявы зьяўляюцца палітычна нямэтазгоднымі. Яны перашкаджаюць разьвіцьцю.

Сьвет становіцца ўсё больш узаемазалежным. Неабходны імпарт працоўнай сілы, інтэграцыя ўсіх магчымых рэсурсаў. Таму нейкія абмежаваньні па прыкмеце расы ці нацыянальнасьці эканамічна неэфектыўныя. Да таго ж зараз людзі маюць значна большы досьвед у зносінах паміж народамі. У 19 стагодзьдзі немец, які жыў у цэнтры Нямеччыны, мог ні разу ня бачыць француза. Таму цалкам верагодна, што ён мог мець толькі “вобраз” француза, і мець пра іх негатыўныя ўяўленьні. Зараз праца з замежнікамі – адна з неабходных умоваў жыцьця ў сучасным сьвеце, і таму зьявы, падобныя гэтай, зьніклі.

Калі аналізаваць рэальную палітычную практыку, то ў большасьці краінаў, у тым ліку і еўрапейскіх, талерантнасьць у пэўнай ступені прысутнічае. Неталернатнасьць трымаецца на тым узроўні, які дазваляе захоўваць нацыянальную ідэнтычнасьць. Я мяркую, што гэта нармальна.

– Ці можна лічыць пэўнай праявай неталерантнасьці тое, што ўсе эмігранты павінны ведаць дзяржаўную мову?

-- Акрамя мовы існуюць пэўныя нормы, зьвязаныя з культурнымі стандартамі, якія павінны прымаць і ведаць эмігранты. Гэта, напрыклад, веданьне Канстытуцыі, гісторыі краіны – усё гэта сьведчыць аб тым, што грамадзтва як сістэма патрабуе ад сваіх членаў і асабліва ад тых, хто зьбіраецца ўвайсьці ў супольнасьць, перабудовы сьвядомасьці, культурных поглядаў і мовы. Такая “неталерантнасьць”, калі дзяржава спрабуе зрабіць іншых больш падобнымі да сябе, я мяркую, непазьбежная. Так будзе, пакуль нацыя будзе прыкладаць намаганьні дзеля таго, каб захаваць хоць

нейкую нацынальнаю ідэнтычнасьць. Зараз гэта практычна ўсе дэкларуюць, хаця цяжка сказаць, што будзе праз 20 ці праз 50 гадоў.

Усё, што я казаў вышэй, тычыцца фармальных прыкметаў, якія занесеныя ў заканадаўства. У рэальным жыцьці, калі чалавек (эмігрант) трапляе ў іншае грамадзтва, у новае сацыяльнае асяродзьдзе, то непасрэдная камунікацыя з супольнасьцю патрабуе яшчэ больш жорсткіх крытэрыяў дзеля таго, каб увайсьці ў яе. Гэта – выкананьне негалосных правілаў, пэўны стыль вопраткі і іншыя рэчы, якія могуць не адпавядаць культурным звычкам чалавека. Але грамадзтва патрабуе ад яго рабіць гэта.

Напрыклад, вядомая праблема ў Францыі была зьвязаная з забаронай насіць у школах хусткі “хіджабы”. Можна лічыць гэта таксама праявай неталерантнасьці, бо насіць хусткі жанчын абавязваюць іх рэлігійныя перакананьні. Шмат хто гэты факт інтэрпрэтуе як парушэньне правоў грамадзянаў-мусульманаў французскай дзяржавай. Але з іншага боку – гэта агульнае правіла, якое тычыцца ня толькі мусульманаў, але таксама і хрысьціянаў, якія ня могуць насіць крыжы, бачныя іншым. Таму не абавязкова разглядаць гэтыя факты як рэпрэсіўныя меры. Іх можна разглядаць як намаганьні зрабіць грамадзтва больш гамагенным.

– Для Беларусі праблемы з эмігрантамі і мусульманскай меншасьцю не стаяць так востра. Ці значыць гэта, што ў нас няма праблемы нецярпімасьці?

-- Сапраўды, у нас пакуль няма вялікай праблемы з мусульманскай меншасьцю, як у Францыі. У нас няма кварталаў, дзе жывуць толькі каўказцы. Прадстаўнікі іншых нацыянальнасьцяў не складаюць нейкую крытычную меншасьць, якая жыве незаўважна і арганізавана. Але калі прааналізаваць узровень неталерантнасьці да каўказцаў, афганцаў і іншых нееўрапейцаў, то выявіцца, што ён дастаткова высокі. Большасьць людзей ставіцца да іх дрэнна менавіта таму, што яны “чужыя”. Такія праблемы, як крымінал, у дадзеным выпадку разглядаюцца не ў адносінах да канкрэтных людзей, а ў адносінах да канкрэтнай групы. Мы ставімся да іх падазрона, людзі ня хочуць жыць з імі разам, іх баяцца, кажуць, што яны злачынцы і г.д. Так праяўляецца неталерантнасьць, ксенафобія. Усё грамадзтва факусуе на асобных людзях недахопы, якія ўласьцівыя іх нацыянальнай групе. Гэта, у прынцыпе, несправядліва.

– А што ў гэтым небясьпечнага?

-- Людзей, да якіх у грамадзтве існуе такое стаўленьне, прымушаюць думаць, што яны крымінальнікі. У выніку яны ня могуць нармальна адаптавацца ў

сацыяльным асяродзьдзі. Падобная праблема была з чорнаскурымі ў Злучаных Штатах. Ня толькі тое, што яны самыя бедныя, але і сама культура падказвала грамадзтву, што чорнаскурыя з гета займаюцца толькі крыміналам, і таму да іх ставіліся адпаведным чынам. Гэта прымушала многіх людзей абіраць ня той жыцьцёвы шлях, які мог бы быць.

– Сапраўды, на асабістым узроўні несправядліва ў асобным чалавеку бачыць недахопы ўсёй ягонай сацыяльнай ці нацыянальнай групы. Але што рабіць, калі праблема мае дзяржаўнае вымярэньне?

-- Менавіта таму логіка дзяржаўных праграмаў, якія зьвязаныя са зьніжэньнем узроўню неталерантнасьці, скіраваная на тое, каб стварыць пазітыўны імідж праблемных сацыяльных групаў. Для ўладаў існаваньне такога кшталту ідэнтычнасьцяў зьяўляецца вялікай праблемай. Гэта і сацыяльная, і прававая праблема. Большасьць сучасных дэмакратычных дзяржаваў разглядаюць праявы неталерантнасьці як вельмі негатыўныя зьявы і бачаць у іх перашкоду для дэмакратычнага разьвіцьця.

– Пасьля зьмены ўлады на Ўкраіне там быў расфармаваны Камітэт па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў. Ці патрэбная такая ўстанова ў нас, на ваш погляд?

-- У большасьці краінаў такая ўстанова існуе. Думаю, што і на Ўкраіне яна захавалася, але не як самастойнае ведамства, а як частка якога-небудзь міністэрства. Функцыя Камітэту – на ўзроўні дзяржавы займацца меншасьцямі і рэлігіямі. Я думаю, што на сучасным узроўні разьвіцьця нашага грамадзтва такая структура ў Беларусі патрэбная. Пакуль нельга пакінуць гэтую праблему на ўзроўні грамадзянскай супольнасьці альбо аддаць яе вырашэньне недзяржаўным установам.

Але можна пагадзіцца з тым, што частку функцыяў Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў магло б выконваць Міністэрства культуры ці адукацыі. Бо, вядома, што больш актуальная праблема -- гэта нацыянальныя мовы і адукацыя на іх. Акрамя гэтага, ёсьць праблема адаптацыі тых, хто прыязджае. Праблема рэлігійных канфесіяў вельмі сьпецыфічная і своеасаблівая ў Беларусі, яна патрабуе пэўнай каардынацыі з боку дзяржавы. Я мяркую, што ў нас пакуль няма больш-менш акрэсьленай нацыянальнай палітыкі. Асноўны накірунак зараз – гамагенізацыя, г.зн. стварэньне больш аднароднага грамадзтва. Зараз няма ніякага спрыяньня разьвіцьцю адукацыі на мовах нацыянальных меншасьцяў альбо ўмоваў для разьвіцьця рэгіянальных моваў.

– Для беларускай мовы таксама?

-- Нельга сказаць, што беларуская мова -- гэта мова меншасьці. Усе абавязаныя яе вывучаць. Чыноўнікі, так ці інакш, абавязаныя на беларускай мове запаўняць бланкі. Людзі маюць пашпарты, дзе іх імя напісана па-беларуску. Але, сапраўды, нашая дзяржава з 1995 году праводзіць палітыку неспрыяньня разьвіцьцю беларускай мовы. Гэтая палітыка не накіраваная на зьнішчэньне мовы. Хутчэй яна накіраваная на тое, каб мову маргіналізаваць. Пэўныя функцыі ёй пакідаюць: культура, літаратура, тэатр -- там яе існаваньне дазваляецца, але не заахвочваецца. Беларуская мова выціскаецца з афіцыйнай сферы, мова не функцыянуе як мова ўлады. Акрамя таго, захоўваецца вельмі моцны лінгвістычны падзел: мова публічнай улады і чыноўнікаў – руская, а мова “апазіцыі” – беларуская, хоць гэта не зусім так. У беларускай апазіцыі сітуацыя з беларускай мовай абсалютна не такая адназначная. Але на ўзроўні дзяржаўнай рыторыкі гэты падзел адчуваецца – і гэта вельмі кепска.

Трэба памятаць, што для большасьці насельніцтва дзяржаўная легітымізацыя мовы ці культуры мае вырашальнае значэньне. Гэта значыць, што калі б моваю ўлады была б беларуская, то сітуацыя з яе выкарыстаньнем і стаўленьнем да яе ў грамадзтве была б значна лепшай.

– Наколькі ў Беларусі магчымыя праявы неталерантнасьці, якія мы назіраем зараз у Еўропе? Ці можа нас “зачапіць” гэтая хваля нецярпімасьці?

-- Я думаю, што пакуль небясьпекі няма. Для нас неталерантнасьць пакуль не зьяўляецца вялікай сацыяльнай праблемай. Напрыклад, мы ня маем палітычна арганізаваных групаў меншасьцяў. Мячэцяў у нас практычна няма, нашыя мусульмане ня схільныя дэманстраваць сваю рэлігійную прыналежнасьць. Пры гэтым я не выключаю, што ў Беларусі зьдзяйсьняюцца злачынствы на нацыянальнай глебе, але звычайна гэты “нацыянальны момант” адыходзіць на другі план.

Калі гаварыць пра маё суб’ектыўнае меркаваньне, то, ведаючы сітуацыю ў гэтай сферы, я магу сказаць, што зараз ўзровень неталерантнасьці ніжэйшы за той, што быў у 2001 годзе. Радыкальныя правыя групоўкі зараз не такія актыўныя. Інтэрнаты, дзе жывуць замежнікі, больш-менш спакойныя. Магчыма, зьмяніўся час ці далі свае вынікі высілкі праваахоўных органаў.

Калі будзе мець месца маштабны імпарт працоўнае сілы і, напрыклад, эмігранты будуць настойваць на тым, каб хадзіць у школу, на працу і дзяржаўную службу ў сваім традыцыйным адзеньні, тады праблема абвострыцца. Гэта падвысіць узровень ксенафобіі. Але цалкам верагодна, што гэтая ксенафобія ня стане

прычынай нейкіх занадаўчых ініцыятываў, а застанецца на пабытовым узроўні. Людзей проста ня будуць прымаць на працу ці неяк па-іншаму будуць прымушаць іншых быць “як усе”. Бо нашае грамадзтва на пабытовым узроўні значна менш талерантнае, чым у Францыі.

– Як чалавеку пазьбегнуць дыскрымінацыі, ня стаць ахвярай неталерантнага падыходу?

-- Лепшы сродак – гэта канфармізм, падпарадкаваньне агульнапрынятым нормам і правілам. Але, калі казаць сур’ёзна, галоўнае – гэта адстойваньне сваіх правоў. Адстаяць, даказаць, што кожны чалавек мае права. У нас ёсьць і фармальная, і юрыдычная базы для гэтага. Закон не дазваляе дыскрымінацыі, і ён працуе роўна настолькі, наколькі людзі яго выкарыстоўваюць. На жаль, ня так шмат людзей пра гэта ведаюць, і толькі адзінкі за свае правы змагаюцца.

# ФАКТАРЫ ТАЛЕРАНТНАСЬЦІ Ў КАНТЭКСЬЦЕ РАЬЗВІЦЬЦЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗТВА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГОМЕЛЬСКАГА РЭГІЁНУ)

Ірына Бязручка,

гісторык (Гомель)

На сёньняшні дзень міжнацыянальныя стасункі ў Беларусі ня носяць ярка выяўленага праблематычнага характару і не перарастаюць у адкрытыя канфлікты, але, тым ня менш, праблема разьвіцьця талерантнасьці ў большай ці меншай ступені актуальная для любога грамадзтва, у тым ліку і для Беларусі.

У перыяд існаваньня СССР манапольна пануючая камуністычная ідэалогія была пабудаваная на нецярпімасьці і класавым антаганізме. У СССР, нягледзячы на абвешчаны прынцып інтэрнацыяналізму, былі назапашаныя міжэтнічныя супярэчнасьці, якія выявіліся напярэдадні і пасьля распаду СССР.

Ідэі няцярпімасьці працягваюць уплываць на сьвядомасьць значнай часткі насельніцтва СНД, правакуючы канфлікты. Шматлікія палітычныя сілы ў постсавецкім рэгіёне паразітуюць на ідэях нецярпімасьці – фармуюць вобраз ворага – вонкавага і ўнутранага. Сацыяльныя і міжэтнічныя адносіны ў краінах СНД дэманструюць дастаткова прыкладаў нецярпімасьці па рэлігійных, палітычных ды іншых матывах.

Адным з метадаў, які дазволіць пазбыцца самых вострых праблемаў, зьяўляецца выхаваньне ў грамадзтве наогул і ў кожным яе члене талерантнага стаўленьня да сацыяльных, этнічных, рэлігійных групаў і да асобных членаў грамадзтва, чые жыцьцёвыя ўстаноўкі і мэты не зусім «упісваюцца» ва ўсталяваныя сацыяльныя адносіны. Прынцыпы талерантнасьці мусяць стаць прыярытэтнымі, каб ідэі сацыяльнай і этнічнай варожасьці былі выключаныя з грамадзтва.

Цярплівасьць і памяркоўнасьць маюць вялікае значэньне ў гісторыі народаў і ў жыцьці кожнага чалавека. Талерантнасьць садзейнічае паразуменьню паміж прадстаўнікамі розных культураў, этнічных і сацыяльных групаў, дапамагае ў папярэджаньні і ўрэгуляваньні канфліктаў. Талерантнасьць дапамагае фармаваньню правілаў паводзінаў як на ўзроўні ўчынкаў, так і на ўзроўні маральных каштоўнасьцяў.

Талерантнасьць дапамагае пераадольваць такую зьяву, як этнацэнтрызм, г.зн. ацэнку паводзінаў прадстаўнікоў іншых нацыянальнасьцяў з пункту гледжаньня

сваіх, а ня іх культурных каштоўнасьцяў і традыцыяў, што не садзейнічае ўзаемаразуменьню людзей. Талерантнасьць заахвочвае нас разглядаць і разумець паводзіны і погляды іншых з пункту гледжаньня іх традыцыяў і досьведу.

Талерантнасьць садзейнічае дыялогу і ўзаемадзеяньню культураў, зьяўляецца метадам папярэджаньня канфліктаў. Культура ня мае магчымасьці разьвіцьця без дыялогу з іншымі культурамі. Узаемныя культурныя ўплывы вельмі карысныя, асабліва калі прадстаўнікі розных этнічных групаў жывуць разам, ім неабходна выжываць.

Чаму мы бываем такія неталерантныя? Існуе адзін са старажытных механізмаў, які сягае каранямі ў першабытную эпоху, у старажытнае міфалагічнае сьветаўспрыманьне. Гэта апазіцыя “свой-чужы”. “Свой” – блізкі, зразумелы, прыгожы і добры. “Чужы” – далёкі, незразумелы -- нам не падабаецца, як ён выглядае, як ён апранаецца, як гаворыць, як паводзіць сябе. Але гэтага мала, чужы гэта той, хто нясе для нас небясьпеку. Мы ўсьвядомлена ці неўсьвядомлена бачым у чалавеку “свайго” ці “чужога”. Гэты механізм закладзены з першабытных часоў, калі ён дапамагаў выжываць. Але той самы механізм небясьпечны ў наш час. Абапіраючыся на прынцып талерантнасьці, мы можам пераадолець гэтую базавую асаблівасьць стражытнага міфалагічнага мысьленьня, якая фармуе этнічныя стэрэатыпы.

Талерантнасьць вельмі патрэбная. Што мы бачым зараз? Абвастрэньне міжнацыянальных, міжрэгіянальных, міжэтнічных і міжрэлігійных канфліктаў у сьвеце і на тэрыторыі СНД. У крызісныя часы людзі робяцца больш агрэсіўнымі. Трэба памятаць, што мы ня толькі сацыяльныя істоты, але і біялагічныя. А ў кожнай біялагічнай істоты ёсьць інстынкт агрэсіі, які можа выяўляцца па-рознаму.

Зьвернемся да беларускага гістарычнага досьведу. Як нашыя продкі вырашалі гэтыя праблемы? Беларускія мястэчкі і гарады на працягу стагодзьдзяў былі поліэтнічнымі. Так, напрыклад, у Гомелі па перапісе 1897 году склад насельніцтва быў наступны: яўрэі – 55,4%; рускія – 19,4 %; беларусы – 17,6 %; палякі – 4,3%; украінцы – 2,3%; іншыя (у тым ліку немцы) – 1,0 % . У 1897 годзе ў Гомелі толькі адна жанчына назвала сябе цыганкай (варта адзначыць, што паводле перапісу 1897 году нацыянальнасьць вызначалася па мове).

Такі склад насельніцтва зьяўляўся тыповым для гарадоў Беларусі, як вынік існаваньня з канца 18 стагодзьдзя “мяжы яўрэйскай аседласьці”. Узгадаем, калі яўрэі зьявіліся ў Беларусі? Вядома па дакументах, што ў канцы 14 стагодзьдзя, а

масавы прыток -- у 16 стагодзьдзі. Гэта зьвязана з перасьледам яўрэяў у Еўропе, у прыватнасьці, у Германіі, дзе ў 16 стагодзьдзі пачаліся яўрэйскія пагромы. У канцы 18 стагодзьдзя пасьля трох падзелаў Рэчы Паспалітай расійскім урадам была ўсталяваная так званая "мяжа яўрэйскай аседласьці", якая прымусова замацоўвала пражываньне яўрэяў на былых землях Рэчы Паспалітай. Колькасьць гамяльчанаў-яўрэяў значна павялічылася ў канцы 19 стагодзьдзя пасьля выгнаньня яўрэяў з Масквы ў 1891 годзе.

Асноўнымі заняткамі яўрэяў у Беларусі былі гандаль і рамёслы. Іх дзейнасьць забясьпечвала магчымасьць нармальнага тавараздвароту. Беларускі пісьменнік, яўрэй па паходжаньні, Зьмітрок Бядуля (Самуіл Плаўнік) наступным чынам характарызаваў узаемадзеяньне яўрэйскай і беларускай культураў, якія "шмат перанялі адна ад адной (...) у мовах, у звычаях, у легендах, у будаўніцтве, у будзённым жыцьці".

Ёсьць меркаваньне, што ў Беларусі не было яўрэйскіх пагромаў. Нават восеньню 1917 году на Усебеларускім зьездзе ў Менску прадстаўнік яўрэйскай партыі, вітаючы беларусаў, заявіў пра тое, што ў Беларусі ніколі пагромаў не было. Але, на жаль, пагромы ў Беларусі былі.

У Гомелі яўрэйскія пагромы адбыліся ў 1903 годзе (загінула 10 чалавек) і 1906 годзе (па афіцыйных дадзеных загінуў 1 чалавек, па неафіцыйных – 4). Падчас пагрому 1903 году асабліва пацярпелі раёны, заселеныя яўрэйскай беднатой, а ў 1906 годзе быў спалены і разрабаваны амаль увесь цэнтр Гомелю. Паводле дакументаў сьледзтва, якое праводзілася пасьля пагрому 13-14 студзеня 1906 году, ініцыятарамі пагрому былі члены Саюзу рускіх патрыётаў, створанага ў горадзе ў 1905 годзе. Гарадзкі галава Раманаў засьведчыў: "Усе на пажары перапіліся. Я бачыў пьяных хуліганаў, ніжніх чыноў, паліцэйскіх і пажарных. Агульнае ўражаньне такое: зроблены быў пажар, а войска і паліцыя быццам бы дапамагалі хуліганам". Сьледзтва пацьвердзіла факты ўдзелу ў пагроме вайскоўцаў. Пры гэтым вайскоўцы "былі нярвова настроеныя; на асобныя стрэлы з вокнаў і дахаў адказвалі дружным агнём па дамах, адкуль былі стрэлы, і нават увогуле па дамах, адкуль толькі глядзелі з вокнаў".

Сьледзтва таксама паказала, што карэннае насельніцтва Гомелю не прымала актыўнага ўдзелу ў пагроме 1906 году. Гомельскі доктар Захарын, дом якога быў разрабаваны падчас пагрому 1906 году, пісаў дарадцу міністра ўнутраных справаў Расіі Савічу: "Пагром у Гомелі першы ў Расіі, які здарыўся без усялякага ўдзелу натоўпу народу. Апошні зьмянілі казакі і драгуны, а таксама ніжнія чыны". Сьледзтва

пацьвердзіла факты рабаўніцтва маёмасьці пагарэльцаў ніжнімі чынамі Вышневалоцкага запаснога бальёну. Сьведкі таксама адзначылі бязьдзейнасьць і неўмяшальніцтва гарадзкіх уладаў падчас пагрому.

Даволі вялікай па колькасьці этнаканфесійнай групай на Гомельшчыне былі стараверы (стараабрадцы), якія не прынялі царкоўную рэформу 17 стагодзьдзя ў Расіі і да 1906 году перасьледваліся расійскім урадам. Іх яшчэ да нядаўняга часу называлі “маскалі” альбо ”маскоўцы”. Яшчэ ў 60-х гадах 20 стагодзьдзя гэта была шырока распаўсюджаная назва. Пасьля расколу Рускай праваслаўнай царквы яны беглі праз мяжу Рэчы Паспалітай ад перасьледу расійскага ўраду. Тут яны атрымлівалі землі. І што для нас важна адзначыць, яны атрымлівалі свабоду веравызнаньня. Яны маглі быць тут старавeрамі.

Стараверы стварылі шэраг слабодаў, якія і зараз бачныя ў нашай тапаграфіі. У Гомелі – Вялікая Спасава слабада -- адразу за паркам, дзе стаіць прыгожая драўляная царква. Беліца некалі таксама была ў асноўным стараверскаю. Ветка – таксама слабада, якая стала буйным цэнтрам старавераў. У сярэдзіне 19 стагодзьдзя старавераў у Гомелі – 11 % насельніцтва. Чым займаліся стараверы? Некаторыя займаліся земляробствам, агародніцтвам, але ў асноўным – гандлем. На пачатку 20 стагодзьдзя на гомельскім рынку “старовер с окладистой бородой” -- прыкметная постаць. Веткаўскія стараверы кантралявалі ўвесь гандаль. Дакументы не фіксуюць канфліктных сітуацыяў беларускага насельніцтва са старaверамі, бо існаваў эканамічны падзел – беларусы ў той час былі пераважна сялянамі.

Граф Мікалай Румянцаў (1754-1826 гг.), які фактычна зьяўляўся ўладальнікам Гомелю, вельмі падтрымліваў старавераў, яны для яго былі “свае” на тле мясцовых уніятаў і каталікоў. Як піша расійскі пісьменьнік Мельнікаў-Пячэрскі, “под покровительством Румянцева гомельские старообрядческие монастыри достигли цветущего состояния”. Стараабрадцы выконвалі гандлёвыя даручэньні графа, кіравалі ягонымі фальваркамі.

Такім чынам, побач з беларускай культурай існавала культура перасяленцаў з Расіі. Характэрным было тое, што культуры гэтыя мірна суіснавалі, але ня зьмешваліся, хаця існавалі ўзаемныя культурныя ўплывы. Яскравым прыкладам уплыву культуры Беларусі на субкультуру старавераў зяўляецца “веткаўскі іканапіс”, у якім бачны адыход ад канонаў візантыйскага канону пад уплывам барочнага мастацтва Беларусі. У 18 стагодзьдзі, калі ў Беларусі панавала барочаная культура, на абразах веткаўскіх стараабрадцаў зьяўляюцца элементы інтэр’еру, касьцюму, некаторыя пабытовыя рэаліі, больш жывымі робяцца выявы. Уплыў Веткаўскай

школы іканапісу пайшоў на Украіну, у Малдову, дзе таксама жылі стараверы. Мовазнаўцы адзначаюць уплыў палескіх гаворак на мову стараабрадцаў, якія жылі на Гомельшчыне. У побыце беларускія стараверы таксама адступалі ад традыцыяў, якія яны прынесьлі з сабой з Расіі. Напрыклад, паводле традыцыі, стараверам забаранялася мець самавар і карыстацца ім. Беларускія стараверы абыйшлі гэтую забарону, прыдумалі, што яны будуць ставіць самавар не на стол, а на лаву – тады можна карыстацца.

Чарнобыльская катастрофа ўдарыла і па апошніх вёсках старавераў. Тых вёсак, дзе яшчэ зусім нядаўна можна было знайсьці цікавыя праявы жыцьця старавераў, цяпер проста няма. Вёскі выселеныя, і такім чынам самабытная культура адыйшла. Хаця на сёньняшні дзень у Рэспубліцы Беларусь налічваецца каля 20 тысячаў асобаў, якія называюць сябе старaверамі, зарэгістраваныя 33 суполкі.

З цягам часу на Гомельшчыне адбываюцца значныя этнічныя і канфесійныя зьмены ў складзе насельніцтва, але грамадзтва ня робіцца больш аднародным, не зьнікае праблема суіснаваньня прастаўнікоў розных культураў і магчымых канфліктаў.

## “НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕНШАСЬЦІ ПАВІННЫЯ ЎЗБАГАЧАЦЬ КУЛЬТУРУ КРАІНЫ..”

Тадэвуш ГАВІН,

ганаровы старшыня “Саюзу палякаў на Беларусі”,

вядомы польскі і беларускі грамадзкі дзеяч

— Якую працу зараз вядзе “Саюз палякаў на Беларусі”?

— Асноўная мэта, якую мы ставілі падчас стварэньня арганізацыі, — гэта адраджэньне польскамоўнага навучаньня і польскай культуры ў Беларусі. Гэтыя мэты актуальныя для арганізацыі і зараз.

— Колькі актывістаў налічвае арганізацыя?

— Зараз у Саюзе зарэгістравана каля 25 тысячаў сяброў.

— У які перыяд існаваньня вашая праца была найбольш пасьпяховай?

— Пачынаючы з 1991 году, калі Беларусь атрымала незалежнасьць, цэнтральнае і мясцовае кіраўніцтва краіны давала нам зразумець, што беларуская дзяржава ў сваім далейшым разьвіцьці абірае дэмакратычны шлях. У новай Беларусі правы асобы і правы нацыянальных меншасьцяў абараняліся дзяржавай. Беларускія ўлады выконвалі гэтае абяцаньне і прытрымліваліся прынцыпаў, што запісаныя ў Канстытуцыі і ў беларускіх законах.

Гэта быў момант адраджэньня, калі польская нацыянальная меншасьць актыўна разьвівалася.

З 1989 году пачала выходзіць польскамоўная газета “Голас з-над Нёману”. Дзяржава фінансава падтрымлівала нашае выданьне. З дапамогай дзяржавы былі ўтвораныя польскія калектывы мастацкай самадзейнасьці. Мы атрымалі дазвол на адкрыцьцё класаў з польскай мовай навучаньня, якія сталі падмуркам для будучых польскіх школаў у Гародні і Ваўкавыску. Гэта ўсё было тады, калі Беларусьсю кіравалі людзі з дэмакратычнымі поглядамі. Яны былі перакананыя, што ў дэмакратычнай краіне павінныя захоўвацца правы нацыянальных меншасьцяў. Час росквіту працягваўся да 1994 году.

Многія з этнічных палякаў сталі дэпутатамі раённых, абласных і гарадзкіх Саветаў. Мы вылучалі сваіх прадстаўнікоў у парламент і мелі сваіх дэпутатаў.

Напрыклад, дэпутат Аляксандр Паўлоўскі працаваў у Вярхоўным Савеце 12 скліканьня. Ён быў абраны па Гарадзенскай сельскай акрузе.

— Калі пачаўся заняпад?

— У 1995 годзе быў праведзены першы рэферэндум. Паступова пачала вынішчацца беларуская мова. Зьявілася зусім іншае стаўленьне да дзейнасьці Саюзу палякаў. Калі нешта і было зробленае на нашую карысьць пасьля 1995 году, то я лічу, гэта адбылося толькі таму, што новае кіраўніцтва Беларусі было абавязанае выконваць дамовы, заключаныя з польскай меншасьцю папярэднім дэмакратычным урадам.

— Вы неяк выказалі думку, што раней ці пазьней дзяржаўнай мовай у нас усё роўна будзе беларуская…

— Гэта абавязкова адбудзецца, пытаньне толькі калі — праз два, тры, пяць ці дзесяць гадоў. Я мяркую, што дзяржаўнасьць беларускай мовы — і ў інтарэсах рускай нацыянальнай меншасьці. Бо прыйдзе час, і беларусы будуць мець прэтэнзіі да расіянаў, якія тут фактычна ў меншасьці, а іх мове нададзены такі вялікі аўтарытэт. Таму ў іх інтарэсах падтрымаць беларусаў у тым, каб дзяржаўнай мовай была беларуская.

— Як зараз наладжаная сістэма польскамоўнай адукацыі ў Беларусі?

— Зараз польскія школы ў Беларусі функцыянуюць у агульнай сістэме адукацыі. За тое дзякуй, але мы ня лічым гэта нечым выключным. Мы зьяўляемся грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, плоцім падаткі, таму абавязак беларускай дзяржавы -- даць нашым дзецям магчымасьць вучыцца на роднай мове. Гэтае права гарантуе Канстытуцыя. Польскі бок прымае нашую моладзь на вучобу ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, ладзіць адпачынак для дзяцей. Таксама Польшча падтрымлівае дзейнасьць польскіх грамадзкіх арганізацыяў.

— Ці прадпрымаюцца нейкія спробы асіміляцыі польскай нацыянальнай меншасьці?

— Кожная дзяржава спрабуе асімiляваць нацыянальныя меншасьці. Гэта мае выгляд “большай інтэграцыі ў грамадства”. Але я мяркую, што нацыянальная меншасьць — ці гэта беларусы ў Польшчы, ці палякі ў Беларусі — павінна сваёй культурай узбагачаць культуру нацыянальнай большасьці. Нацыянальныя меншасьці ў нармальнай дзяржаве — гэта скарб. Я ведаю вельмі шмат здольных і

разумных людзей, якія гатовыя дапамагчы Беларусі ў разьвіцьці добрых кантактаў з суседняй краінай.

— Якія асноўныя задачы зараз намагаецца вырашыць польская супольнасьць у Беларусі?

— Я ўжо казаў пра дзьве буйныя падзеі: 1996 год – адкрыцьцё польскай школы ў Гародні, 1999 – адкрыцьцё польскай школы ў Ваўкавыску. Усё. Больш ніякіх значных падзеяў не адбылося. Я лічу, што за апошнія 5 гадоў палякі нічога не здабылі. У 1999 годзе беларускі бок спыніў фінансаваньне газеты “Голас з-над Нёману”. Наклад газеты зьменшыўся на 40%. Зараз выданьню дапамагае толькі польскі бок.

Каб захаваць сваю нацыянальную тоеснасьць, мы і ўтварылі “Саюз палякаў на Беларусі”. Але мы грамадзяне Беларусі, мы павінны інтэгравацца ў гэтую супольнасьць і актыўна ўдзельнічаць у жыцьці краіны.

— У адным з інтэрвью вы зазначылі, што сёньняшняя сітуацыя — гэта магчымасьць для нацыянальных меншасьцяў змагацца разам з беларусамі за дэмакратыю. Вы і зараз так думаеце?

— Яшчэ раз магу пацьвердзіць, што гісторыя і сам Бог далі нам такі шанец. Мы павінны яго выкарыстаць, стаць побач з беларусамі ў іх змаганьні за беларускасьць, за мову і дэмакратыю. Калі мы падтрымаем іх у гэтым змаганьні, то і беларусы падтрымаюць нас ў нашым змаганьні за нашыя правы. Толькі разам можна вырашыць гэтыя пытаньні.

Магчыма, нашая дапамога і ня будзе такой вялікай, бо нас ня так шмат, але такая падтрымка Беларусі патрэбная, і супольная дзейнасьць дапаможа і нам, прадстаўнікам нацыянальных меншасьцяў. Мы, са свайго боку, гаворым, што ў гэты складаны момант мы хочам і змагацца разам, бо Беларусь і беларускасьць – гэта нашая супольная справа.

# “ЗВАЦЦА БЕЛАРУСАМ У ПОЛЬШЧЫ СЁНЬНЯ НЕБЯСЬПЕЧНА…”

Беластоцкая раённая пракуратура ўвосень 2004 году перадала ў суд крымінальную справу ў адносінах да сяброў праўленьня Праграмнай Рады тыднёвіка «Ніва», што выдае беларуская супольнасьць Польшчы. Этнічныя беларусы -- грамадзяне Польшчы -- не прызнаюць сябе вінаватымі і лічаць, што гэткім чынам дзяржава спрабуе ўстрашыць беларускае асяродзьдзе, каб людзі перасталі беларусамі звацца.

Сітуацыю каментуе Яўген Мірановіч,

былы старшыня праўленьня Праграмнай Рады тыднёвіка «Ніва»,

прафесар універсітэту Беластоку, кіраўнік кафедры беларускай культуры

— Спадар Яўген, з чаго пачаліся непрыемнасьці?

— Усе пачалося з кантролю Беластоцкага аддзяленьня Найвышэйшай кантрольнай палаты Польшчы за расходваньнем дзяржаўнай датацыі тыднёвікам «Ніва». Кожны год Міністэрства культуры Польшчы дае датацыю памерам 300 тысячаў злотых на выданьне тыднёвіка: на зарплату журналістам, юрысту і бухгалтару і на аплату паслугаў друкарні. Усе тыднёвікі нацыянальных меншасьцяў маюць прыкладна такую ж датацыю. Праверка паказала, што ў нас ёсьць недахопы ў рахункаводзтве, хаця ранейшы кантроль не паказваў, што ў нас нешта не ў парадку.

Вось адзін з эпізодаў. Датацыя нам даецца на ўвесь год. Аднак у 2002 годзе грошы прыйшлі ў красавіку, а патраціць іх мы павінны да 30 кастрычніка. Мы разумелі, што наступная датацыя таксама ня прыйдзе 1 студзеня, а зноў недзе ў сакавіку-красавіку. А як выдаваць газету ад кастрычніка да красавіка? І мы расклалі гэтыя грошы такім чынам, каб нам хапіла на ўвесь год. Каб не спыняць выдавецкага цыклу. Каб кожны тыдзень выходзіла «Ніва».

— Ці ведалі пра гэта ў Міністэрстве культуры?

— Так, ведалі. І заплюшчвалі на гэта вочы, бо мы па сутнасьці цярпелі з-за недапрацоўкі чыноўнікаў, якія так позна пералічылі грошы. За паўгода мы не маглі патраціць гадавы памер датацыі, бо немагчыма наперад выплаціць заробак і разьлічыцца з друкарняй. А каб атрымаць афіцыйны дазвол на выкарыстаньне грошай такім чынам, як мы рабілі, трэба шмат пабегаць. Механізм такі: мы павінны вярнуць міністэрству непатрачаную частку датацыі, усё растлумачыць, атрымаць

дазвол і чакаць вяртаньня нашых грошай. Справа складаная, і ў міністэрстве гэта таксама разумелі. І не чапалі нас. Але ніхто ня думаў, што кантралёры скажуць, што грошы гэтыя нелегальныя. А грошы засталіся немалыя – 174 тысячы злотых.

І з гэтай сітуацыі пачалі рабіць шоу. Газеты пісалі так, што ў чытачоў складалася ўражаньне, што гэтыя грошы наогул скрадзеныя ці зьніклі. Потым сталі пісаць, што «Ніва» перастала існаваць. А калі сканала газета, якой больш за 50 гадоў, гэта значыць, што там было вялікае злачынства.

— Інакш кажучы, пачалася прапаганда?

— Па «Ніве» і ўсім беларускім асяродзьдзі быў нанесены такі моцны інфармацыйны ўдар, што іншага слова як прапаганда знайсьці цяжка. І па радыё, і па тэлебачаньні часта гаварылі, што нешта там не ў парадку, а ўсе выдаўцы – група падазраваных. А што не ў парадку, у чым падазраюцца – канкрэтна ня кажуць. Журналісты пісалі пра нейкія злачынствы, пра якія не ўзгадвала ні кантрольная палата, ні пракуратура. Складалася ўражаньне, што проста трэба паказаць беларускае асяродзьдзе як крымінагеннае, злачыннае, што фінансаваць тыднёвік «Ніва» – гэта значыць зруйнаваць фінансы ўсёй Польшчы, давесьці краіну да банкруцтва.

У канцы 2003 году мы атрымалі ліст, што справа накіраваная ў пракуратуру. Хаця Міністэрства культуры, якое выступала як пакрыўджаны бок, казала сьледчым, што ўхваляе дзеяньні «Нівы». Праз год і пракурор пацьвердзіў журналістам, што ніякія грошы не прапалі.

— Атрымліваецца, у гэтай крымінальнай справе няма пацярпелага?

— Атрымліваецца. Але гэтая «дробязь» справу не спыняе. Як на працу, мы хадзім у пракуратуру, тлумачым кожны квіток, кожную паперку. Вясной 2004 году расьсьледваньне спынілі. І раптам у кастрычніку ўсе сябры Праграмнай Рады атрымалі з паліцыі позву прыйсьці ў ролі падазраваных. І нам паведамілі, што мы ўчынілі такія злачынствы ў рахункаводзтве, што нам пагражае па 2 гады зьняволеньня.

А потым пачалі ва ўсіх сяброў Праграмнай Рады здымаць адбіткі пальцаў, фатаграфаваць нас з трох бакоў з нумарамі, як злачынцаў. Потым паехалі па хатах з вобыскамі. Гэта бачылі суседзі. А што людзі перш за ўсё думаюць? Вядома, што жывуць побач са злачынцамі.

Усе гэтыя дзеяньні пракурораў і паліцыі выглядалі як танная дэманстрацыя сілы. Ніхто з нас ня мог зарыентавацца: што адбываецца?

Адзін з сяброў Праграмнай Рады пасьля гэтага казаў: «Я ўжо баюся ісьці ў лес па грыбы з ножыкам, бо скажуць, што я гэтым ножыкам пілаваў дрэвы ў Белавежскай пушчы». А другі – вядомы ў Еўропе журналіст Юрый Каліна – пайшоў у Найвышэйшую кантрольную палату, каб даведацца, што адбываецца. І не ўлічыў, што ён сам сябра Праграмнай Рады. А там яму кажуць: «Ага, вы ж таксама ў ліку падазраваных». Вось так чалавек даведаўся аб сваёй ролі ў гэтай справе.

Потым высьветлілася, што да адказнасьці прыцягнуты чалавек, які ў той час ня быў сябрам Праграмнай Рады. Вось гэтая акалічнасьць крыху зьбіла з польскіх журналістаў апломб, а іншым дала магчымасьць паразважаць, ці ўсё ў гэтай справе так, як распавядаюць пракуроры.

— Менавіта Вы якую бачыце прычыну таго, што адбываецца?

— На мой погляд, справа ў тым, што апошні перапіс насельніцтва Польшчы паказаў, што больш за 50 тысячаў чалавек лічаць сябе беларусамі. Падаецца, што польскія ўлады разьлічвалі на больш сьціплую лічбу. Таму і былі ўжытыя захады па кампраментацыі самага сэрца беларускага асяродзьдзя – Праграмнай Рады тыднёвіка «Ніва». Каго абвінавацілі?! Навукоўцаў, пісьменьнікаў, журналістаў – тую інтэлігенцыю, якую людзі паважалі, каму верылі, вакол каго аб'ядноўваліся. Зараз уся Праграмная Рада запэцканая чорным колерам. Ды і пракурор апошні раз сказаў, што нам пагражае па 8 гадоў няволі. Столькі ж гадоў далі шэфу варшаўскай мафіі, якога неяк судзілі ў Беластоку. Дык той гандляваў дзяўчатамі і наркотыкамі. Страшна падумаць, аднак атрымліваецца, што звацца беларусамі і быць у наркамафіі па складзе злачынства – гэта адно і тое ж.

Усяго абвінавацілі 11 чалавек, абвінавачаныя ёсьць ва ўсіх 8 грамадзкіх арганізацыях, якія ўваходзяць у Праграмную Раду. Гэта значыць, што лідэры гэтых арганізацыяў ня могуць балатавацца ў дэпутаты парламенту.

Рэха пра гэты факт разышлося далёка па ўсёй краіне. Цяпер адбываюцца перавыбары ў грамадзкіх суполках, і людзі ня хочуць уваходзіць у ніякае праўленьне ці абірацца кіраўнікамі. Людзі наогул сталі баяцца любой грамадзкай дзейнасьці. Калі раней з такім натхненьнем мы ладзілі нашую грамадзкую і культурніцкую справу, то зараз людзі нават баяцца публічна паказацца як беларусы. Асабліва гэта заўважна сярод моладзі. Мы разьлічвалі, што нашыя дзеці працягнуць нашую справу. Але маральны тэрор аказаўся мацней за бацькоўскае слова.

Беларускія мусульмане

З Ібрагімам Канапацкім,

старшынёй мусульманскай абшчыны гораду Менску

гутарыць Тацяна Сьнітко

-- Прынясіце ёй хустку і правядзіце ў жаночую палову...

Я пакорліва абвязала свае растрапаныя валасы. “Магчыма, ня сьлед было прыходзіць у мусульманскі храм у джынсах у абліпку...” Як тыповая беларуска, я аказалася прыкладам талерантнасьці.

Праз пару хвілінаў скрозь рэдкія жалюзі, што аддзялялі жаночую палову, мяне ўбачыла мусульманка Зарына. На ёй таксама былі вузкія джынсы. Я адразу супакоілася.

-- А чаго гэта вы сядзіце тут?

-- Напэўна, мушу акліматызавацца...

Зарына расьсьмяялася.

Мы знаходзіліся ў часовым будынку менскай мячэці. Сама мячэць будуецца тут жа, на вуліцы Грыбаедава. Беларускія ўлады ня проста так выдзелілі ўчастак для яе будаўніцтва: на гэтым месцы былі закінутыя татарскія могілкі. Надмагільлі з выбітымі паўмесяцамі, надпісамі арабскай вязьзю... Некаторыя арабскія літары перамяжоўваюцца з кірыліцай.

За сваё гістарычнае месца татарскай абшчыне даводзіцца плаціць падатак у 700 тысячаў беларускіх рублёў на месяц. Татары ня хочуць, каб пра гэта пісалі журналісты, бо ў такіх выпадках узьнікаюць праблемы, і дзякуюць Алаху: раней дзяржава брала з іх утрая болей грошай.

Між тым, мячэць задуманая як дакладная копія старой, разбуранай у 60-я гады. Знаходзілася яна там, дзе зараз месьціцца рэстаран гатэлю “Юбілейны”. І калі вам давядзецца там частавацца, магчыма, вы згадаеце, што мусульманскія храмы ў савецкі час пацярпелі гэтаксама, як і ўсе астатнія. Напрыклад, у мястэчку Узда мячэць спалілі невядомыя яшчэ ў 1935-м.

Але вернемся ў Менск. “Затачэньне” ў жаночай палове зьмянілася ўсходняй гасьціннасьцю. Пакідаючы мячэць, я ледзь не сышла ў хустцы...

Ібрагім Канапацкі, старшыня мусульманскай абшчыны Менску, часта прамаўляе як сьвятар. Бо ён і ёсьць сьвятар – намесьнік муфція храму, у якім мы размаўляем.

-- У 90-м годзе вось на гэтых разбураных могілках мы праводзілі акцыю, патрабавалі вяртаньня гэтай сьвятой для нас зямлі. Тут меркавалася збудаваць спачатку музычную школу, потым тэнісны корт... Я, уласна кажучы, не чакаў, што будзе лёгка. Але мячэць – не самамэта. Мячэць – гэта дом для мусульманаў, дом Алаха. Тут чалавек адчувае ўзаемасувязь і з Космасам, і з той сілай, якая дае нам магчымасьць (альбо не дае магчымасьці) існаваць у сьвеце.

Калі б мы жылі па гэтых вечных і сьвятых Кнігах і чыталі, глядзелі, задумваліся, вядома, меней узьнікала б сёньня пытаньняў. А як толькі мы забыліся пра гэта, адразу няўхільна пайшлі пакараньні за нашыя дзеі. І за дзеі пакаленьняў. І мы, як кажуць нашыя браты хрысьціяне, павінныя несьці гэты крыж – гэтак жа, як прарок Іса, Іісус. Наступае момант ісьціны: што ж далей, што рабіць, як жыць?

Мусульманаў у Беларусі няшмат. Ды іх шмат і не было ніколі. Згодна з перапісам насельніцтва 1999 году, жыве ў краіне 10 089 беларускіх татараў, і гэта амаль палова ўсіх мусульманаў, што зараз тут жывуць.

-- Ібрагім Барысавіч, наколькі цярпіма ў Беларусі ставяцца да мусульманаў?

-- Татары-мусульмане зьявіліся на нашых землях больш за 600 гадоў таму. У 1397 годзе па дамове вялікага князя літоўскага Вітаўта і хана Тахтамыша некалькі тысячаў татараў накіраваліся з сем’ямі з Прычарнаморья і Крыму ў Вялікае Княства. Яны пасяліліся паблізу Вільні, Навагрудку, Ліды, Брэсту, Гродна, Менску. Вітаўт гарантаваў перасяленцам свабоду веравызнаньня. І талерантнасьць, што панавала ў Княстве, стала прычынай перасяленьня сюды многіх татараў з Залатой Арды, а пазьней – і з Крымскага ханства. Гэтыя людзі беглі ад міжусобіц і знаходзілі тут прытулак. У 1591 годзе на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, куды ўваходзіла і ВКЛ, жылі каля 200 тысячаў татараў, якія мелі блізу 400 мячэцяў. Ужо вякамі склалася так, што мірна ўжываліся ў суседзтве. Бо ў горы і радасьці, без перабольшаньня, былі разам. Вось паедзьце ў Іўе, паглядзіце: там ідзе вуліца, на ёй жывуць і праваслаўныя, і каталікі, і мусульмане – і ўсе працуюць на зямлі, паліваючы яе потам. Няма ніякай розьніцы. Праблема ўзьнікае тады, калі ёсьць сацыяльная няроўнасьць. Калі чалавек адной нацыянальнасьці багаты, знакаміты, гэта можа пераплятацца з нацыянальнай і канфесійнай праблемамі.

Так, бывалі праблемы паміж праваслаўнымі і каталікамі ў Рэчы Паспалітай. Потым яны памяняліся месцамі ўжо ў Расійскай імперыі... Але да нас было

стаўленьне роўнае. Калі не лічыць XVП стагодзьдзе, калі быў перыяд рэфармацыі, і 20-30-я гады мінулага стагодзьдзя. Але тады ўсім дасталося. У нас былі страшэнныя страты. Генафонд быў разбураны, эліта нацыянальная зьнікла. І праблема ня ў тым, што няма мячэці – мячэць тут пабудуем. А хто будзе ў гэтай мячэці? Да чаго ён будзе заклікаць? Што ён будзе прапаведаваць? Нам усё гэта неабыякава. Трэба б моладзь адукаваць, ды няма ў нас у краіне адмысловых навучальных установаў. Ёсьць тэалагічны інстытут у БДУ, але там рыхтуюць выключна праваслаўных сьвятароў. Зразумела, адразу не ахопіш усіх. Мяркую, дзяржава прыйдзе да высновы, што трэба надаваць увагі гэтым пытаньням.

Мы не ўяўляем пагрозы ніякім іншым канфесіям, нікому не пераходзім дарогу. Наша галоўная задача – захаваць свой твар, традыцыі татараў-мусульманаў.

-- Тое, што стаўленьне да іслама ў сьвеце ў апошнія гады пагоршылася, адбілася на жыцьці беларускіх татараў-мусульманаў?

-- Вядома. Адбілася, магчыма, не на дзяржаўным узроўні, таму што ў законе прапісана, што іслам – традыцыйная рэлігія, яна знаходзіцца нараўне з хрысьціянствам і іўдаізмам. Гэта разумелі тыя, хто займаўся распрацоўкай закону на навуковым узроўні. Гэта ведаюць і вучоныя, і палітыкі. Пра гэта пішуць дзяржаўныя газеты. Але на побытовым узроўні ў нас было ўсё. Мы ўжо гэта праходзілі: “Бі жыдоў, ратуй Расію!” Правільна, недзе нехта некаму не спадабаўся, паглядзеў на экране “карцінку”: вось нашых б’юць (рэжуць яшчэ, барані Божа, – тое, што ў Расіі адбывалася і адбываецца). Пачынаецца пошук “асобаў каўказкай нацыянальнасьці” без разбору... Гэта вельмі страшна – тое, што было ў Босьніі, у Косаве, разьня гэтая... Я ўпэўнены, што тут не будзе такога, таму што беларусы іншыя. Пакуль яго не чапаюць, калі нешта яго ня тычыцца, беларуса мала чым закранеш: “Бульба е, вада радам, дроў прывезьлі – і парадак, мая хата з краю, нічога ня знаю...” Не хачу крыўдзіць беларускі народ. Можа, гэта недзе і добра, што мы такія мірныя, спакойныя. Ну так, па п’янцы хто-небудзь можа сказаць: “Ты, татарская морда” ці яшчэ што, але ці мала што бывае... А па вялікім рахунку – няма такіх праблемаў.

Уся гісторыя беларускіх татараў (гэта не высокія словы) была высакароднай. Мусульмане займалі годную нішу ў гэтым грамадзтве, служылі яму верай і праўдай, а калі трэба, і жыцьцё адавалі сваё. У нас быў вялікі слой інтэлігенцыі, у нас было шмат вайскоўцаў: каля 50 генералаў было з ліку беларуска-літоўскіх татараў! 13 тысячаў татараў -- і каля 50 генералаў: які народ яшчэ можа пахваліцца гэтым? Ня проста ж так давалі генерала! У нас у Клецку ёсьць кіраўнік абшчыны Якуб Ждановіч,

дык яго бацька, Ібрагім Ждановіч, атрымаў чатыры “Гяоргіі”! І ні разу ня быў паранены. Значыць, умеў ваяваць...

-- А як складаюцца адносіны з прыезджымі мусульманамі?

-- У Менску жыве шмат азербайджанцаў. У нас нармальныя, цёплыя стасункі з імі. Мы, татары і азербайджанцы, – аднаго кораня: цюркскія народы. Нягледзячы нават на тое, што яны трохі іншага напрамку ў веры: яны – шыіты. У ісламе ж існуе два напрамкі: суніты і шыіты. Шыіты іначай называлі сябе “ахл аль бэйт” – “сваякі прарока”. Шыіцкая абшчына ў Менску таксама існуе пад такой назвай. Узначальвае яе Мірзахан Міхрабаў, ён уваходзіць у склад праўленьня мусульманскага аб’яднаньня. У нас няма праблемаў паміж людзьмі. У нас ёсьць праблемы, магчыма, ад недастатковага разуменьня значнасьці некаторых пытаньняў. Для гэтага трэба працаваць над сабой кіраўнікам, а калі людзі ім давяраюць, трэба думаць, апраўдваць гэты давер. А ня проста: адзеў ты шапку і прыгожы халат і будзеш сядзець важна, надзімаць шчокі.

-- Прыезджыя мусульмане прыходзяць памаліцца ў мячэць?

-- Так, вядома, і іх большасьць тут. У мячэць прыходзіць татараў меней. Здавалася б, вось татарскія могілкі, татарскія традыцыі...

Мы ведаем традыцыі, але такога вопыту ня маем. Гэта нярэдка стварае дыскамфорт. Хоць я на роднай мове чытаю пропаведзі ў мячэці, але ў іх прынята чытаць на арабскай. Гэта дае падставу папракнуць нас у няведаньні арабскай, нават прыгадаць нашае камуністычнае мінулае... Усё разам стварае ўражаньне, што ты нявартым. Тое, што быў твой дзед, прадзед імамам, нікога не хвалюе, а вось яны прыехалі, і дай ім паруліць... Мы раней да пары да часу давалі, і ў дарадцы прыезджых запрашалі, закон дазваляў. Але потым мы ўбачылі вялікую небясьпеку ў тым, што гэта – іншая культура. Хоць нават не ў культуры справа, а ў тым, хто прапаведуе гэтую культуру. Рэлігія тут ні пры чым. Адыгрывае ролю неадукаванасьць: даваць парады часам спрабуюць людзі, якія самі не атрымалі рэлігійнай адукацыі, хіба толькі што ў сям’і. І потым, Радзіму ж пакідаюць ня лепшыя! Узьнікае праблема, калі чалавек прыязджае з іншай краіны і пачынае мне нешта даказваць. Плюс яшчэ сустракаецца недахоп выхаваньня... Не, гэта не каўказцы. Каўказцы вытрыманыя, цярпімыя, выхаваныя ў павазе да старых. Гэта госьці з краінаў Бліжняга і Сярэдняга Усходу.

Тут узьнікае яшчэ адна праблема. Для таго, каб тут застацца, яны легалізуюць сваё становішча – жэняцца з тутэйшымі дзяўчатамі. Вось нашыя жанчыны не

разумеюць... Раз ты гэткую сваю станоўчую традыцыю сюды нясеш, дык ты ж павінен плаціць махр (“калым” на татарскай мове), які б стварыў умовы для бязьбеднага існаваньня тваёй жонкі, маці, сястры. У некаторых усходніх краінах, каб ажаніцца, трэба заплаціць такія вялікія грошы, што некаторыя так і ня жэняцца. А тут, аказваецца, можна, і не адзін раз, можна яшчэ і другі раз сям’ю кінуць! А потым прыходзяць гэтыя жанчыны з іх праблемамі да нас у абшчыну...

-- Гэтыя хлопцы прывозяць з Усходу толькі тыя традыцыі, якія ім выгадныя?

-- Так. І мы гаворым апошнім часам: ці не патрэбна жорсткасьць? Вядома, я – чалавек па натуры не жорсткі, я схільны прабачаць гэта ўсё… Аднаму чалавеку мы давяралі, а потым аказалася, што ён ня годна сябе паводзіць. Як можна за такім чалавекам станавіцца на малітву? Прыйшлі да нас арабы, убачылі гэтага чалавека ў мячэці ды кажуць, што яны ня будуць за ім стаяць. А гэта людзі, якія праз сумленную працу займелі сваё месца ў грамадзтве...

-- У Беларусі з Расіяй – адзіная інфармацыйная прастора. Моцна ўплывае вайна ў Чачні на жыцьцё нашых мусульманаў?

-- У нас быў і застаецца цесны кантакт з Расіяй, жыць па прынцыпе “мая хата з краю” не выпадае. Мы заўсёды памяталі, што там, у Расіі – 20 мільёнаў мусульманаў. Там Татарстан – наша гістарычная радзіма, дзе ёсьць Ісламскі расійскі ўніверсітэт (хочам нашу моладзь туды пасылаць на вучобу).

У Чачні, па вялікім рахунку, праблема палягае ў экстрэмізме і радыкалізме. Я размаўляў з рознымі людзьмі на канферэнцыях, і ў Менску ў нас таксама чачэнцы жывуць – навошта гэта? На Каўказе заўсёды ўладжвалі справы ў працэсе перамоваў. Я ні ў якім разе не хачу абвінавачваць чачэнцаў альбо расіянаў. Як гэта магла дазволіць дзяржава – гэта ж грамадзяне адной краіны забіваюць адзін аднаго!

Забіваць людзей -- увогуле вялікі грэх. У Бібліі сказана пра гэта, і ў Каране гаворыцца, што забіць адну душу – гэта як забіць увесь сьвет. Гэта нязмыўны, недаравальны грэх. У мінулым годзе я быў у Маскве на канферэнцыі “Мусульмане за мір і згоду”, былі прадстаўнікі розных канфесіяў з тае ж Чачні. Ішла вельмі добрая размова. Але гэта размова, вядома, пачынаць жа трэба рабіць нешта... Сьвет узаемазьвязаны: калі там ліецца кроў, то ёсьць верагоднасьць, што вайна прыйдзе і сюды. Гэта вельмі страшна.

-- Замежнікі не спрабуюць прышчапіць экстрэмізм?

-- Не хачу сказаць, што прышчапіць, але праявы радыкалізму ёсьць у моладзевым асяродзьдзі, і мы гэтага не хаваем. Калі чалавек ведае месца ў грамадзтве, сваю традыцыю, бацьку і маці сваіх паважае, жыве тут – усё правільна. Калі ён адрываецца ад зямлі і сыходзіць некуды ў нябёсы... Ад зямлі адарваўся, да неба не дастаў – і вось недзе паміж небам і зямлёй вісіць. Набіраецца вось гэтых думак... Цяжка моладзі. Каму ня цяжка? Кідаецца ў крайнасьці, нармальна ня можа сябе вызначыць у сувязі са зьявамі, што адбываюцца ў грамадзтве. “Вось гэта няверныя, гэта яны не даюць нам...” Але пры чым тут канкрэтныя людзі, якія жывуць у гэтай краіне? Змагайся са сваімі недахопамі, не вынось іх на суседа!

Экстрэмізм небясьпечны. Трызьняць ідэямі Халіфату, вяртаньня да таго, што некалі было... Але ж тое было ў мусульманскай дзяржаве! А вы дзе жывяцё? Ты ствары рай у сваёй сям’і, працуй, як чорны вол, дзеля сваіх блізкіх. Тады суседзі цябе будуць паважаць.

Экстрэмісты кажуць: усе Кнігі адмяняюцца, а вось нашая самая-самая. Але ж нельга так. Яны забываюцца на самае асноўнае палажэньне ў Каране, дзе сказана: няма прымусу ў рэлігіі! Гвалтам верыць ня будзеш, чалавек павінен сам прыйсьці, разабрацца. Ты можаш дапамагчы. А калі хто ня хоча – што ж ты зробіш? Такая яго доля.

Мы маем апасеньне, што ў нашае мірнае жыцьцё могуць занесьці гэты вірус. Ёсьць такая небясьпека. Ёсьць такая спакуса ці, можа быць, ёсьць такая нават замова. У Еўропе існуюць цэнтры, якія працуюць у гэтым напрамку. Але я ўжо шмат гадоў працую ў ВНУ, трохі чытаю, разумею, разважаю, ужо маю нейкі жыцьцёвы досьвед: я бачу, што калі ёсьць замова, знойдзецца і выканаўца – такія “адмарозкі”, якія зьдзейсьнілі тэракты ў Злучаных Штатах Амерыкі. І мы гэтага баімся. Мы – людзі, мы вельмі датклівыя, я баюся за сваю сям’ю, баюся за свой народ, па вялікім рахунку... Я малю Усявышняга Творцу, каб ён даў усім людзям мір і шчасьце ў гэтым і наступным жыцьці.

# “ПРАЯВЫ АНТЫСЕМІТЫЗМУ НЕЛЬГА ЗАМОЎЧВАЦЬ...”

Беларускае прадстаўніцтва Аб’яднаньня камітэтаў у падтрымку габрэяў былога СССР у жніўні 2004 году распаўсюдзіла інфармацыйны ліст, які ўтрымлівае шматлікія факты ўціску габрэйскай нацыянальнай меншасьці. У лютым 2004 году быў ліквідаваны Міжнародны гуманітарны інстытут, створаны пры падтрымцы міжнародных габрэйскіх арганізацыяў. Пастаянна ўзьнікаюць канфлікты з нагоды ўшанаваньня памяці ахвяраў Халакосту. Улады адмаўляюцца забясьпечыць сацыяльную абарону беларускіх габрэяў ад небясьпекі, якая паходзіць ад неанацысцкіх груповак...

Сітуацыю аналізуе Якаў Басін,

дырэктар прадстаўніцтва Міжнароднага аб’яднаньня камітэтаў

у падтрымку габрэяў былога СССР

— Што прымусіла габрэйскія супольнасьці зьвярнуцца з лістом да грамадзкасьці?

— Факты, якія ўтрымліваюцца ў інфармацыйным лісьце, шырока вядомыя. Але ў гэтых фактах ніхто ня хоча разьбірацца. У пракуратуры ўжо дзевяць месяцаў «вісіць» справа аб выданьні антысеміцкай літаратуры. А за гэты час выдавецтва «Праваслаўная ініцыятыва» надрукавала яшчэ дзьве кнігі падобнага зьместу. Атрымліваецца, што выдаўцы ведаюць – іх учынкі застануцца непакаранымі. Прадстаўнікі праваслаўнай епархіі ў прыватных размовах кажуць нам пра тых, хто выпускае падобную літаратуру: «гэта адмарозкі», «яны ня маюць да нас ніякага дачыненьня». Але афіцыйнай заявы на гэты конт не прымаюць. А між тым менавіта з «групкі адмарозкаў» некалі пачыналіся вялікія трагедыі, што забіралі мільёны жыцьцяў.

— Беларусы – талерантны народ. Гэта ўсе адзначаюць. Чаму ж у апошнія гады ў нас абвастраюцца праблемы міжнацыянальных і міжрэлігійных стасункаў?

— Яны не абвастраюцца. Існуюць звычайныя, можна сказаць, працэсы, але ня больш за тое. Усюды, дзе жылі і будуць жыць габрэі, узьнікаюць складаныя эканамічныя, рэлігійныя і палітычная стасункі. Гэта абсалютна нармальна. Паміж людзьмі вострага канфлікту няма.

Мы робім акцэнт на тых праблемах, узьнікненьне і рашэньне якіх залежыць ад дзяржавы. Мы ніколі ня кажам, что беларускі народ выказвае нейкае сваё асаблівае

стаўленьне да габрэяў. Але як толькі мы пачынаем адчуваць, што прыцясьненьне паходзіць ад чыноўнікаў, з дзяржаўных колаў – гэта для нас трывожны знак і нагода дзеля хваляваньня. Мы нічога ня кажам пра праваслаўных веруючых, але лічым, што епархія магла б супрацьстаяць шмат якім фактам распальваньня варожасьці. Як толькі антысемітызм становіцца элементам палітыкі – узьнікае сур'ёзная небясьпека.

Неанацысцкія групоўкі ёсьць ва ўсім сьвеце. Вядома, яны будуць і ў нас таксама. Але калі кіраўнік краіны заяўляе, что нічога «падобнага» ў нас няма – гэта прымушае чыноўнікаў і ўсіх астатніх заплюшчваць вочы на відавочныя факты. Дзяржаве хочацца захаваць свой добры імідж.

— Ці можа ўзмацненьне гэтых настрояў сьведчыць аб нейкіх ментальных, ідэалагічных зьменах у беларускім грамадзтве?

— Каб адказаць на гэтае пытаньне, неабходныя сур'ёзныя сацыялагічныя дасьледваньні. Пакуль што небясьпека паходзіць толькі ад тых, хто распаўсюджвае гэтую заразу. Мне і іншым габрэям вельмі не падабаецца, што праваслаўная епархія глядзіць на гэта «скрозь пальцы». Выдавецтва «Праваслаўная ініцыятыва» за апошнія пяць гадоў выдала кнігі, дзе ўтрымліваюцца абразьлівыя для ўсяго габрэйскага народу матэрыялы. Епархія і сам мітрапаліт Філарэт наконт гэтых фактаў не выказваюцца. Маўчыць і пракуратура, і Міністэрства інфармацыі, якое адмовілася прымаць меры…

Да крымінальнага антысемітызму ў Беларусі ня дойдзе. Але ідэалагічны антысемітызм квітнее ўжо зараз. У Беларусі заўсёды існавала шматнацыянальнае асяродзьдзе, але ніколі ў гісторыі не атрымлівалася падштурхнуць беларусаў да антыгабрэйскіх настрояў. Талерантнасьць і павага рэлігійных перакананьняў нарадзілася яшчэ ў Вялікім Княстве Літоўскім – вялікай шматнацыянальнай краіне. У Міры, невялікім беларускім мястэчку, на адной плошчы месьцяцца касьцёл, праваслаўная царква, былая сінагога і мусульманская мячэць. Некалі тут усе жылі ў згодзе. Гэта паказвае, што ў беларускай традыцыі няма месца для варожасьці. Аднак гэтая варожасьць выяўляецца ў пазіцыі некаторых палітычных сілаў. Вельмі проста ў палітычных мэтах заяўляць: «Мы добрыя, а яны кепскія»…

— Вы зьвярталіся ў суд па факце выданьня антысеміцкай літаратуры?

— Напрыклад, кніга, у якой габрэі-партызаны абвінавачваюцца ў генацыдзе мірнага славянскага насельніцтва, выйшла накладам у 100 асобнікаў. Уздымаць гэты факт на ўзровень судовых працэсаў мы ня схільныя. Гэта справа ўласнага сумленьня

аўтараў. Але гэтыя людзі парушаюць яшчэ адзін закон – Крымінальны кодэкс, які прадугледжвае пакараньне за распальваньне міжнацыянальнай варожасьці. Мы былі б зацікаўленыя ў тым, каб пракуратура нас падтрымала. Але там «спускаюць справу на тармазах». За дзевяць месяцаў разьбіральніцтва антысеміцкія выданьні нават не прайшлі эксьпертызу.

— Ці ёсьць падобныя праблемы ў краінах СНД і Еўропе?

— Вядома. Але ў суседніх краінах ідуць актыўныя судовыя працэсы. У мінулым годзе ў Расіі пасьля суда была пазбаўленая рэгістрацыі прафашысцкая партыя. Гэта гаворыць пра тое, што праблемы не замоўчваюцца. У Кіеве зараз ідзе судовы працэс супраць антысеміцкага часопісу.

Мы проста хочам, каб нашая дзяржава прызнала і заявіла пра свой намер змагацца з неанацысцкімі групоўкамі. Прынамсі, на словах. Ідэалізацыя беларускага грамадзкага жыцьця, якая існуе зараз і прапагандуецца асабліва ў сродках масавай інфармацыі – гэта замоўчваньне хваравітых момантаў нашага жыцьця.

У Беларусі, як і ў любой іншай еўрапейская краіне, ёсьць як станоўчыя, так і адмоўныя зьявы. Ёсьць антысемітызм сярод чыноўнікаў, вядомыя і праявы вандалізму на габрэйскіх могілках. Такія праблемы не вырашаюцца за адзін дзень. Яны назапашваліся стагодзьдзямі. Існуюць стэрэатыпы грамадзкай сьвядомасьці, і мы, габрэі, гэта добра разумеем. Мы толькі хочам, каб улады нейкім чынам паказалі, што яны гатовыя абараняць нас. Сёньня ж ніякай сацыяльнай абароны мы не адчуваем.

Праблемай антысемітызму зараз заклапочаная ўся сусьветная грамадзкасьць. І ніхто не хавае, што выпадкі міжнацыянальнае нcraлерантнасьці ёсьць. Еўрапейская супольнасьць, да прыкладу, прымае ў зьвязку з гэтым адпаведныя захады.

— Як такая сітуацыя ў Беларусі можа паўплываць на міжнародны імідж нашай краіны?

— Зьнешні імідж Беларусі і без таго ня самы лепшы. А гэтыя факты могуць толькі яго пагоршыць. Іншая справа, што мы свайму іміджу надаем вельмі шмат увагі. За мяжой нас звычайна распытваюць пра рэлігійную сітуацыю ў Беларусі, спачуваюць нам. Але, тым ня менш, нам заўсёды даюць зразумець, што гэтыя праблемы – наша ўнутраная справа.

# “УЛАДЫ ПРОСТА ІГНАРУЮЦЬ ПРАБЛЕМЫ РОМАЎ…”

Мікалай Калінін,

абаронца правоў цыганаў, юрыст

— Чым адрозьніваюцца цыганы, якія жывуць у Беларусі, ад цыганскіх супольнасьцяў іншых краінаў?

— У Беларусі жывуць тры асноўныя групы цыганаў. Адну з іх складаюць цыганы, што называюць сябе руска-рома. Большасьць з іх жыве на тэрыторыі Віцебскай вобласьці, у Полацку і Віцебску. Абшчына там налічвае каля 3 тысячаў чалавек. Яны крэўна зьвязаныя з ромамі, якія жывуць на паўночным захадзе Расіі. Я сам прадстаўляю гэтую групу. Мае сваякі жывуць у Пскове і Санкт-Пецярбургу. Гэтае перасяленьне адбылося пасьля вайны.

Другая этнічная група — цыганы, крэўна зьвязаныя з польска-прыбалтыйскім рэгіёнам. Яны жывуць у Менску, называюць сябе халадыт-рома. Яны маюць сваякоў у Польшчы, Прыбалтыцы, Чэхіі.

Трэцяя этнічная група – гэта цыганы, зьвязаныя з Украінай і Малдовай: сэрвы. Яны жывуць на тэрыторыі Гомельскай і Магілёўскай абласьцях.

Трэба адзначыць, што гэтыя этнічныя групы настолькі розныя, што паміж імі нават шлюбаў не бывае. Яны маюць зусім розную культуру. Руска-рома па менталітэце бліжэйшыя да рускага народу. Яны маюць больш суровы нораў, больш ваяўнічыя, калі так можна сказаць. Цыганы, якія жывуць у Менску, даволі багатыя людзі. Яны -- самыя багатыя цыганы, якія па матэрыяльным дабрабыце могуць параўнацца толькі з маскоўскімі. Што тычыцца сэрваў – яны вялікія аматары музыкі і сьпеваў, як і ўся малдаўска-украінская этнічная група. У мове, на якой размаўляюць гэтыя групы, вялікай розьніцы няма.

— Ці існуюць нейкія ўнутраныя правілы ў гэтых групах?

— Гэтыя этнічныя супольнасьці вельмі закрытыя. Асаблівая закрытасьць існуе для нацыянальнай большасьці. Яе можна назваць надзвычайнай. Гэта мэтазгодна, бо калі б было па-іншаму, цыганы даўно зьніклі б як народ. Асіміляцыя і інтэграцыя ў грамадства цыганам на карысьць ня пойдзе.

Міжнацыянальныя шлюбы існуюць, аднак яны ніколі не віталіся. У цыганскай абшчыны адразу ўзьнікае пытаньне, да якой нацыянальнасьці будуць належаць дзеці ў такой сям’і і які спосаб жыцьця абярэ малады чалавек, што ажаніўся з

нецыганкай. У гэтым сэнсе адбываецца непрыняцьце самога факту міжэтнічнага шлюбу. Але такія выпадкі ёсьць, і гэта даволі моцныя сем’і.

Існуе вельмі цікавы момант. Напалову цыганам быць нельга. Можна быць напалову ўкраінцам, напалову рускім. А цыганам напалову быць нельга. Такая сьпецыфіка. Некаторыя сыходзяць з абшчыны, жывуць сярод беларусаў, але не перастаюць быць цыганамі.

— Існуе даволі шмат стэрэатыпаў пра цыганаў. Напрыклад, адзін з іх — “цыганы-качэўнікі”. Ці праўда, што людзі гэтай нацыянальнасьці не затрымліваюцца доўга на адным месцы?

— Цыганаў-качэўнікаў, якія пераязджаюць з месца на месца, засталася толькі невялікая група. Яны жывуць у Закарпацьці, ва Украіне і на прылеглых тэрыторыях Польшчы, Венгрыі, Румыніі. Гэтыя цыганы сапраўды не жывуць стала на адным месцы, і, што самае цікавае, пры гэтым цудоўна сябе адчуваюць. Сярод цыганаў, якія аселі ў Беларусі, качэўнікаў няма. Адзін час сюды была вельмі актыўная іміграцыя прадстаўнікоў таджыкскай цыганскай дыяспары. Яны называюць сябе “люлі” і размаўляюць на фарсі (мова Ірану). Сваю мову страцілі. Беларусь не была для іх канчатковым пунктам. Наколькі я ведаю, зараз яны аселі недзе ў Заходняй Еўропе, здаецца, у Скандынавіі.

— Чым цыганы адрозьніваюцца ад іншых нацыянальных меншасьцяў?

— Як мне падаецца, цыганы бліжэй да мусульманскіх народаў. Асноўнай прыкметай гэтага зьяўляецца шанаваньне старэйшых. У доме для састарэлых вы ніколі ня знойдзеце старога цыгана. Да таго ж, у нас вельмі сьпецыфічныя шлюбна-сямейная стасункі. Яны практычна ідэнтычныя тым, якія прад’яўляе Каран для мусульманаў. Гэта асаблівы статус мужчыны ў стасунках паміж мужчынам і жанчынай у сям’і. Шлюбна-сямейны Кодэкс, які існуе ў Рэспубліцы Беларусь, для цыганаў увогуле непрымальны. Мы маем зусім іншы ўклад. Напрыклад, тое, што называецца рэгістрацыяй шлюбу, ці “росьпіс”, для нас ня мае ніякага значэньня...

— Колькі чалавек налічвае цыганская абшчына ў Беларусі?

— Зараз цяжка сказаць, бо колькасьць вельмі сур’ёзна вагаецца. Некалькі гадоў таму гэтая лічба даходзіла да 65 тысячаў...

— — Якія праблемы для прадстаўнікоў вашай нацыянальнасьці ў Беларусі зараз стаяць найбольш востра?

— Дыскрымінацыя цыганаў ёсьць усюды, не выключэньне і Беларусь. Шмат у якіх краінах цыганы ня могуць знайсьці працу. У Фінляндыі, напрыклад, штогод цыганскія грамадзкія арганізацыі прад’яўляюць да 200 зыскаў аб дыскрымінацыі.

У Беларусі прыкладна такая ж сітуацыя. Дастаткова назваць адну толькі лічбу: 93% цыганаў у Беларусі ня маюць працы. Гэтую лічбу ў мінулым годзе прывёў Камітэт па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў. Гэта значыць, што цэлы народ беспрацоўны... Для прыкладу, у Германіі гэтая лічба складае толькі 15%. Там існуе дзяржаўная праграма ліквідацыі непісьменнасьці і беспрацоўя сярод цыганаў.

На пабытовым узроўні дыскрымінацыі няма. Беларусы вельмі талерантныя. З гэтага пункту погляду цыганы тут сябе вельмі камфортна адчуваюць. Але нават маючы адукацыю і рэкамендацыі, практычна немагчыма атрымаць працу. Я сам на сабе гэта адчуў. Я юрыст, і мне адмаўляюць выключна па нацыянальнай прыкмеце. Цыганам цяжка паступіць і ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Пра цыганаў вядома вельмі мала, а калі і ведаюць, то збольшага негатыўную інфармацыю. Гэта жыве ў сьвядомасьці простых людзей. Трэба працаваць дзеля таго, каб разьбіць гэтыя стэрэатыпы. Самае негатыўнае – гэта калі паміж словам “цыган” і “правапарушальнік” ставяць знак роўнасьці. На жаль, менавіта ў такім сьвятле нас выстаўляюць афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі і так да нас ставяцца прадстаўнікі органаў улады.

Вельмі шмат людзей да нас зьвяртаецца з Віцебскай вобласьці, у прыватнасьці з Полацку. Людзі сутыкаюцца з неабгрунтаванай адмовай у прыёме на працу. Гэтая праблема вельмі істотная. Другое – гэта свавольства супрацоўнікаў міліцыі ў адносінах да цыганаў. Сьледчыя мерапрыемствы праводзяцца з найгрубейшымі парушэньнямі ўсіх правоў. Напрыклад, калі ёсьць дазвол на вобыск толькі ў адным доме, абшукваецца ледзь ні паўвуліцы, і выключна цыганскія хаты. Даводзіцца сутыкацца і з так званымі “судовымі памылкамі”, якія былі і раней адносна цыганаў. Працуе толькі адзін прынцып – калі ты цыган, значыць, хоць у нечым ты вінаваты. Людзі безабаронныя, шукаюць падтрымкі. Ніводзін адвакат ня стане пісаць скаргу сьледчаму і ўскладняць з ім свае стасункі дзеля цыганаў. Нашыя звароты ігнаруюць.

У жніўні 2004 году быў накіраваны зварот у Міністэрства адукацыі з прозьбай адкрыць цыганскую школу ў горадзе Менску; у верасьні – зварот у Міністэрства культуры з прозьбай арганізаваць выставу па культуры і гісторыі цыганаў; у кастрычніку – у Міністэрства працы з прозьбай распрацаваць праграму па ліквідацыі беспрацоўя сярод цыганаў. На першыя два звароты адказаў так і не атрымана, на трэці прыйшоў пісьмовы адказ, што “выдзяленьне дадзенай праблемы дастатковых

падставаў ня мае”. У Беларусі афіцыйныя ўлады робяць выгляд, што такога народу ўвогуле няма, што ў ромаў няма ніякіх праблемаў. У Беларусі ўлада проста ігнаруе гэтыя праблемы.

— Можа, кіраўніцтва проста ня ведае пра існаваньне такіх праблемаў?

— Каб не заўважыць гэтых праблемаў, трэба вельмі пастарацца. Дыскрымінацыя ў адносінах да ромскага народу існуе ва ўсёй Еўропе. Яна ёсьць нават у Германіі, Нарвегіі і Вялікабрытаніі. Ромы – народ гнаны. Фізічна немагчыма ўявіць, каб дыскрымінацыя ў адносінах да ромаў была ў Расіі, Украіне, Прыбалтыцы, а ў Беларусі – не.

Калі казаць пра сітуацыю з правамі ромаў у краіне, то тут нельга разглядаць ромскі народ асобна ад астатніх грамадзянаў Рэспублікі Беларусь. Ромы адчуваюць на сабе ўвесь аб’ём парушэньняў правоў чалавека, якім падвяргаюцца ўсе грамадзяне рэспублікі, і ў дадатак – дыскрымінацыю па нацыяльнай прыкмеце. Проста нашыя суседзі адкрыта прызнаюць гэты факт і спрабуюць нешта зрабіць. Асабіста я неаднаразова накіроўваў лісты ў Камітэт па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў, але адказу не атрымаў ні на адзін са сваіх зваротаў.

— Дык можа быць, праблема менавіта ў працы асобных установаў?

— Не, я так ня думаю. Я ўпэўнены, што органы ўлады, міністэрствы і ведамствы маюць поўны аб’ём інфармацыі пра становішча ромаў у Беларусі. Але пытаньне ў тым, чаму з іх боку няма ніякіх дзеяньняў, накіраваных на паляпшэньне становішча ромскага народу. На сёньняшні дзень можна гаварыць пра тое, што ў краіне няма распрацаванай праграмы па інтэграцыі нацыянальных меншасьцяў. Разам з тым, Рэспубліка Беларусь ратыфікавала ўсе міжнародныя канвенцыі па абароне правоў нацыянальных меншасьцяў.

— Ці існуюць ромскія арганізацыі і якая іх роля ў жыцьці цыганаў?

— Існуе Міжнародны ромскі саюз, які аб’ядноўвае практычна ўсіх ромаў. Апошнія некалькі гадоў гэты саюз абсалютна бязьдзейнічаў. Эфектыўней за ўсіх па праблемах ромаў працуюць такія арганізацыі, як Рада Еўропы, Еўрапейская Камісія і АБСЕ. Апошнім часам у Еўрапарламент была абраная прадстаўніца ромаў Лівія Ярока, якая пачала актыўна абараняць інтарэсы ромаў. Вялікую карысьць ромам прынесьлі такія палітычныя партыі, як брытанскія і швецкія ліберал-дэмакраты, сацыял-дэмакраты Усходняй Еўропы і, вядома ж, фракцыя “зялёных”.

— Ці існуюць у Беларусі ромскія арганізацыі?

— На дадзены момант такія арганізацыі ёсьць, але якой-небудзь грамадзка-палітычнай ініцыятывы яны не праяўляюць. Зьвязана гэта, па-першае, з тым, што яны цалкам падкантрольныя дзеючай уладзе, па-другое, сярод іх сябраў вельмі мала высокаадукаваных людзей. Для лідэраў гэтых арганізацыяў значная праблема – проста сфармуляваць сваю грамадзянскую пазіцыю па тым ці іншым пытаньні. Уся дзейнасьць лідэраў арганізацыяў зводзіцца да абвяшчэньня сябе цыганскім баронам, нягледзячы на тое, што на самой справе ніхто з іх не валодае такім тытулам. Безумоўна, гэта адмоўна адбіваецца ў прынцыпе на адносінах да ромаў. Ромскія арганізацыі сваім бязьдзеяньнем толькі ўскладняюць становішча сваіх жа супляменьнікаў. Іх праца па фондзе Халакосту таксама пакідае жадаць лепшага.

— Ці робіцца нешта дзеля паляпшэньня становішча ромаў?

— З боку беларускіх уладаў ня робіцца абсалютна нічога. З боку ромскіх арганізацыяў ніякіх канструктыўных ініцыятываў таксама не было. Праводзіцца пэўная праца з боку праваабарончых арганізацыяў. У прынцыпе, мае месца інфармацыйны вакуум, які актыўна падтрымліваецца ўладамі.

Ромам неабходная ўвага з боку дзяржаўнай улады. Іх праблемы не павінны заставацца латэнтнымі. Ігнараваньне праблемаў не прывядзе да іх вырашэньня, і таму неабходна весьці дыялог з ромамі. Палітычныя партыі таксама не павінныя забывацца, што адзін з асноўных прынцыпаў пабудовы дэмакратычнага грамадзтва – прынцып талерантнасьці ў адносінах да нацыянальных меншасьцяў. З боку праваабарончага руху таксама б хацелася больш актыўнай працы з ромамі, хоць я ведаю, што праваабаронцы ў краіне пастаўленыя ў вельмі цяжкае становішча.

# “НІХТО НЯ МОЖА ТРАПЛЯЦЬ ПАД ДЫСКРЫМІНАЦЫЮ ПАВОДЛЕ СЕКСУАЛЬНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ…”

Пэр Ролінг,

сябра Швецкага таварыства па сексуальным раўнапраўі,

па прафесіі – сямейны доктар

— Спадар Ролінг, распавядзіце, калі ласка, пра вашую арганізацыю.

— Швецкае таварыства па сексуальным раўнапраўі мае 28 лакальных прадстаўніцтваў і было ўтворанае ў 1951 годзе пераважна дзеля таго, каб лабіраваць інтарэсы геяў у прадстаўнічых органах і сферы школьнай адукацыі. Я таксама зьяўляюся сябрам арганізацыі «Лагер геяў», якая ладзіць сьпецыяльныя летнікі. Такі летнік мы арганізоўвалі з латышскімі арганізацыямі, і я спадзяюся, што ў будучым мы зможам таксама наладзіць такі лагер і з беларускімі арганізацыямі.

-- Якім на сёньняшні дзень зьяўляецца стаўленьне да геяў у Швецыі?

— Урад разглядаў нас як крымінальнікаў да 1944 году. Калі была адмененая крымінальная адказнасьць, нас пачалі разглядаць як хворых людзей, трактаваць гомасексуалізм як хваробу. Аднак мы змаглі гэта пераадолець у 1979 годзе — нас ужо ня лічаць хворымі людзьмі. Мы дамагліся права заключаць шлюбы паміж геямі і права гейскім сем'ям ўсынаўляць дзяцей. Адзіная мэта, якой нам засталося дасягнуць -- каб нас прызнала царква і мы маглі заключаць шлюбы і вянчацца ў царкве.

Яшчэ адно дасягненьне, якім я ганаруся, -- гэта тое, што паводле закону забаронена дыскрымінаваць геяў. Зараз ніхто ня можа дыскрымінавацца як паводле полу, рэлігіі, так і паводле сексуальнай арыентацыі.

— Якім чынам разьвіваліся стасункі паміж сексуальнымі меншасьцямі і дзяржавай?

— Каб адказаць на гэтае пытаньне, трэба зазірнуць у нашую гісторыю. У 1870-х гадах Швецыя была лідзіруючай краінай у Еўропе па венерычных захворваньнях. Галоўнымі прычынамі зьяўлялася тое, што краіна была вельмі бедная, з вельмі цяжкімі жыльлёвымі ўмовамі, распаўсюджанай прастытуцыяй і сітуацыяй, калі часткова заробкі выплочваліся алкаголем. І тады ў Швецыі пачаліся вялікія дэбаты,

галоўным прадметам якіх стала тое, што неабходна паменшыць сем'і, палепшыць узровень жыцьця і такім чынам пазьбегнуць як галечы, так і хваробаў.

Былі дасягнутыя некаторыя вынікі, якія найперш зьвязаныя з інфармацыяй, зараз ня вельмі вядомай. У Германіі ў 1920-х гадах існаваў інстытут доктара Гішвельда, які рабіў дасьледваньні ў галіне сексу. У яго была распрацаваная тэорыя наконт існаваньня трох палоў: мужчыны, жанчыны і гомасексуалісты. Ён спрабаваў шляхам інфармаваньня паспрыяць таму, каб у грамадзтве прынялі гэтую версію існаваньня трэцяга полу. Калі прыйшоў да ўлады Гітлер, гэты інстытут быў зьнішчаны.

У гэтай установе навучаліся 3 ці 4 швецкіх дактары, і калі яны вярнуліся з Германіі, то зрабілі вялікую справу ў інфармаваньні насельніцтва наконт існаваньня гомасексуальнасьці. Іх працу можна разглядаць як гераічную, таму што яны інфармавалі людзей пра рэчы, пра якія ў той час размаўляць і абмяркоўваць было забаронена. Падчас іх паездак адна з жанчын-навукоўцаў прапаведвала Евангельле і акцэнтавала ўвагу на тым, што кожнае дзіця мае права зьявіцца на сьвет, але яно павінна быць жаданым, чаканым. Падчас сустрэчаў яна таксама распаўсюджвала жаночыя кантрацэптывы. Менавіта гэтая жанчына-прафесар стала першым прэзідэнтам арганізацыі па сексуальным інфармаваньні. Пры гэтым ня трэба забываць, што толькі ў 1921 годзе швецкія жанчыны атрымалі права голасу.

У 1930-х гадах у краіне пачалася кампанія падачы петыцыяў да ўраду ў мэтах дэкрыміналізацыі гомасексуалістаў, і такі закон быў прыняты ў 1944 годзе, адначасова, калі Гітлер забіваў кожнага гомасексуаліста.

— Як грамадзтва ўспрымала гэтыя перамены?

— Было некалькі рухаў, у тым ліку Ліберальная партыя, якія таксама спрыялі таму, каб у грамадзтве адкрыта загаварылі пра секс. У Швецыі першы выпадак, калі пачалі падымаць пытаньні сексу ў школах, адносіцца да 1950-х гадоў. Быў вялікі скандал, нават прыехалі японскія кінематаграфісты і зьнялі некалькі фільмаў, адзін з якіх называўся «Швецкі грэх». Гэты фільм паказваўся па ўсёй планеце.

У гэты час у Швецыі адбыліся два вельмі вялікія скандалы. Першы пачаўся з-за таго, што зьявіўся мужчына, які сказаў, што ён займаўся сексам з каралём і што яму заплацілі грошы, каб ён маўчаў і не распавядаў нікому пра гэта. Другі скандал быў з-за таго, што адзін урадавы чыноўнік ішоў у тры гадзіны ночы і заўважыў сьвятара, што вяртаўся з дзіцячага прытулку. У хуткім часе стала вядома, што гэты дзіцячы дом быў ператвораны ў публічны дом для гомасексуалістаў. Гэтыя скандалы захапілі

думкі людзей на дзесяцігодзьдзе, стварылі гістэрыю ў грамадзтве і замацавалі меркаваньне, што гомасексуалісты -- гэта невялікія сакрэтныя групы, якія зьбіраюцца ў сакрэтных месцах і распрацоўваюць планы захопу швецкага грамадзтва.

Гэтая старонка гісторыі вельмі цёмная для гомасексуалістаў. Фактычна адбывалася паляваньне на іх: арышты, шматлікія суды. Можна прывесьці такі прыклад, калі вядомы швецкі пісьменьнік пісаў сваёй маці ў вёску, каб яна не адпускала сваіх сыноў у Стакгольм, бо там з іх зробяць гомасексуалістаў.

І ўсё ж час не стаяў на месцы, і ў 1976 годзе быў прыняты закон, які дазваляў гомасексуалістам займацца сексам з партнёрам такога ж самага ўзросту. Раней гэта было дазволена з 21 году, а гэты закон ураўняў гомасексуалістаў у правах з гетэрасексуаламі і дазволіў уступаць у сувязі з партнёрамі такога ж узросту з 15 гадоў. У 1980-х гадах урад дазволіў гомасексуальныя шлюбы.

Усе гэтыя дасягненьні былі толькі дзякуючы інфармаваньню, інфармаваньню і яшчэ раз інфармаваньню. Дзякуючы таму, што ў школах пачалі распавядаць пра роўныя правы мужчынаў і жанчын, што роўнымі зьяўляюцца гомасексуалісты і гетэрасексуалы, мы здолелі дасягнуць такога паляпшэньня сітуацыі з роўнасьцю полоў.

Хаця гэта толькі на паперы справы выглядаюць такімі добрымі, насамрэч усё ня так ружова, як можа здацца. У Швецыі і зараз кожны год адзін ці два гомасексуалісты зьбіваюцца толькі таму, што яны гомасексуалісты. Але мы здолелі знайсьці інструмент, каб надалей паляпшаць сітуацыю.

— Наколькі гомасексуалісты сацыялізаваныя ў швецкім грамадзтве? Ці могуць яны нараўне займаць дзяржаўныя пасады і атрымліваць працу?

— За апошнія гады адбыліся вельмі добрыя дасягненьні ў плане сацыялізацыі гомасексуалістаў. Я не магу сказаць, што ёсьць праблемы з гэтым, і ўсё ж адно пытаньне выклікае ў мяне сумнеў. Пасьля працы ў арганізацыі геяў я шукаў працу і рассылаў сваё рэзюме па розных установах, дзе пісаў, чым займаўся. Я амаль што ўпэўнены, што працу я не атрымаў і таму, што, прачытаўшы пра мяне, маё рэзюме адкладалі ў іншы бок. Гэта такая ў некаторым родзе замоўчаная перадузятасьць. Яна існуе, і праблема палягае ў тым, як яе пераадолець.

Такія праблемы існуюць і з жанчынамі. Напрыклад, падчас прыёму на працу іх пытаюць, ці яны маюць ці зьбіраюцца мець дзяцей, ці цяжарныя, хаця гэта забаронена, паколькі жанчын нельга дыскрымінаваць з-за таго, што ў іх ёсьць дзеці.

— Ці ёсьць нейкія грамадзкія сілы, групоўкі, якія супрацьстаяць гомасексуалістам?

— Існуюць два тыпы такіх групаў. Першыя -- гэта так званыя неанацысты ці скінхэды. Гэта правыя радыкалы, якія заўсёды выступалі і выступаюць супраць гомасексуалістаў і нярэдка іх зьбіваюць. Другая група — царква. Гэта вельмі кансерватыўная сіла, якая заўсёды імкнецца галасаваць супраць нейкіх рэформаў, накіраваных на паляпшэньне ўмоваў існаваньня гомасексуалістаў.

Вядома, з кожнага правіла ёсьць выключэньне. Сярод неанацыстаў існуе групоўка гомасексуалістаў-фашыстаў. Я не магу дакладна патлумачыць іх ідэалогію, але яны ёсьць. Што тычыцца царквы, тут таксама ёсьць выключэньне. Напрыклад, у цэнтры Стакгольму ёсьць такое рэлігійнае хрысьціянскае асяродзьдзе «Вясёлка», якое падтрымлівае гомасексуалістаў.

— Ці патрабуецца абавязковая афіцыйная рэгістрацыя суполак сексуальных меншасьцяў?

— У Швецыі рэгістрацыя для арганізацыі патрабуецца толькі ў выпадку, калі яна хоча атрымаць фінансавую падтрымку з боку дзяржавы.

З самага пачатку геі былі вельмі зьяднаныя, бо ў іх была адзіная мэта -- замацаваньне права шлюбу. Раней для нас зусім няважна было, ці ты зьяўляешся камуністам, кансерватарам ці ліберaлам -- у нас была адзіная мэта. Зараз, калі нам дазволілі шлюбы, мы ўжо не зьяўляемся такімі аб'яднанымі, бо няма агульнай ідэі. Пасьля атрыманьня права на шлюбы пачалі ўзьнікаць цалкам розныя ідэалогіі, агульны рух падзяліўся на розныя групоўкі па інтарэсах. Калі вы любіце хадзіць у оперу, у вас ёсьць адна арганізацыя, калі нешта іншае любіце -- таксама аб'ядноўваецеся ў зусім іншую арганізацыю. Такім чынам, у Швецыі зараз можна налічыць 80 ці 90 розных гейскіх арганізацыяў у залежнасьці ад тых тэмаў, якія яны дыскутуюць, альбо інтарэсаў.

# ГОМАСЕКСУАЛІЗМ У ШВЕЦЫІ І СЬВЕЦЕ

Раланд Ларсан

(пры дапамозе RFSU – Швецкага таварыства па распаўсюдзе сексуальнай інфармацыі)

Гісторыя

1850-1860 гг. Зьяўленьне тэрмінаў гомасексуаліст і гетэрасексуал. І адно і другое слова называюць сексуальную ненармальнасьць – гомасексуаліст мае палавы кантакт з асобай таго ж полу, гетэрасексуал мае палавы кантакт, не зьвязаны з жаданьнем зачацьця дзіцяці. На працягу доўгіх гадоў слова гетэрасексуальнасьць мяняла значэньне ад "ненармальныя палавыя зносіны паміж людзьмі розных палоў" да "нармальная сексуальнасьць", але слова “гомасексуальнасьць” працягвае апісваць нешта ненармальнае і злачыннае.

1933 г. Эліз Аттасэн Джэнсан з Нарвегіі засноўвае Швецкае таварыства па распаўсюдзе сексуальнай інфармацыі. Адной з задачаў Таварыства зьяўляецца інфармаваньне насельніцтва Швецыі пра спосабы засьцярогі ад непажаданай цяжарнасьці. Эліз таксама дапамагае гомасексуальным мужчынам і жанчынам знайсьці партнёра.

1944 г. Згодна прынятаму ў Швецыі закону, гомасексуалізм перастае лічыцца злачынствам. Гэта адбылося ў асноўным дзякуючы тэорыі псіхааналізу Фрэйда, якая зьмяніла сьветапогляд грамадства: людзі сталі ўспрымаць гомасексуалізм як псіхічнае расстройства, а не як злачынства. А паколькі чалавек ня можа несьці адказнасьці за сваё захворваньне, было б няправільна караць яго за праявы гомасексуалізму.

1950 г. Створана Швецкае таварыства сексуальнай роўнасьці, якое ўзьнікла як філія падобнага таварыства ў Даніі. Праз два гады швецкая філія адасобілася ад першаснай арганізацыі. У той жа час гомасексуалісты падвяргаюцца перасьледу ў шмат якіх краінах. У ЗША гомасексуалістаў адносілі да камуністаў, а ў Швецыі іх абвінавачвалі ў "гей-непатызме" з мэтай атрыманьня важкага становішча ў грамадстве.

1969 г. Гэты год вельмі важны для руху геяў. Усё здарылася ў бары для гомасексуалістаў пад назвай Stonewall у раёне Грынвіч Нью-Йорку, ЗША. Паліцыя перасьледавала наведвальнікаў бару, пастаянна ладзіла рэйды. Але наведвальнікам гэта хутка надакучыла, і яны далі адпор, што стала пачаткам масавых хваляваньняў,

калі геі, лесьбіянкі і трансвеставы выступалі супраць паліцыі да таго часу, пакуль не перамаглі. Пасьля гэтага гомасексуалісты перасталі хавацца самі і хаваць сваю сексуальную арыентацыю. На працягу 1970-х гадоў грамадзтва многіх заходніх краінаў прыняло факт існаваньня гомасексуалістаў.

1979 г. Нягледзячы на тое, што большасьць людзей не лічыла гомасексуальнасьць псіхічным расстройствам, Нацыянальны савет здароўя і сацыяльнага забесьпячэньня афіцыйна ўключыў гомасексуалізм у сьпіс псіхічных расстройстваў. Швецкае таварыства сексуальнай роўнасьці змагло прымусіць Нацыянальны савет здароўя і сацыяльнага забесьпячэньня прыбраць гомасексуалізм з гэтага сьпісу шляхам лабіяваньня і розных акцыяў пратэсту. Напрыклад, некаторыя гомасексуалісты адмаўляліся выходзіць на працу, спасылаючыся на хваробу, група гей-актывістаў наладзіла сядзячую забастоўку на прыступках Нацыянальнага савету здароўя і сацыяльнага забесьпячэньня.

1987 г. Закон аб сумесным пражываньні абноўлены так, што гомасексуальныя пары, якія жывуць разам, маюць такія ж юрыдычныя правы, як і тыя гетэрасексуальныя пары, што жывуць па-за шлюбам.

1995 г. Прыняты закон аб рэгістрацыі партнёрскіх адносінаў. Гэта падобна на шлюб паміж двума аднаполымі людзьмі. Адрозьненьне паміж гетэрасексуальным шлюбам і зарэгістраванымі партнёрскімі адносінамі заключаецца ў тым, што гомасексуальныя пары не вянчаюцца ў царкве і ня могуць усынаўляць дзяцей.

2003 г. Прынятыя два новыя законы. Першы закон забараняе дыскрымінацыю людзей па іх палавых перавагах. Другі закон дазваляе гомасексуалістам усынаўленьне на такіх самых падставах, як і гетэрасексуалам.

Цяпер ідзе праца над законам пра шлюб без палавых абмежаваньняў, каб не было розьніцы паміж гомасексуальным і гетэрасексуальным шлюбам.

Швецыя сёньня

Закон супраць дыскрымінацыі

Закон супраць радыкальных выступленьняў быў пашыраны і ўключыў таксама сексуальныя меньшасьці. Гэта азначае, што перасьлед гомасексуалістаў і бісексуалаў на словах, у пісьмовым выглядзе ці дзеяньнямі зьяўляецца незаконным, таксама як і перасьлед рэлігійных і этнічных меншасьцяў.

Амбудсмэн Парламенту Швецыі па пытаньнях дыскрымінацыі па палавых перавагах, Амбудсмэн па пытаньнях гомасексуальных адносінаў назіраюць за трыма галоўнымі сферамі:

-- працоўныя адносіны;

-- вышэйшыя навучальныя ўстановы;

-- грамадзтва Швецыі ў цэлым.

Амбудсмэны разглядаюць выпадкі дыскрымінацыі ці перасьледу наймальнікамі ці іншымі работнікамі на працоўных месцах (ці пры прыёме на працу), а таксама настаўнікамі ці студэнтамі ва ўніверсітэтах.

У грамадзтве існуе даволі шмат галінаў, у якіх гомасексуалісты і бісексуалы могуць быць аб’ектамі дыскрымінацыі. Яна можа зьдзяйсьняцца прадстаўнікамі органаў дзяржаўнай улады, такімі як паліцыя, калі яна замоўчвае факты зьбіцьця геяў, ці рознымі кампаніямі, якія прадаюць тавары і паслугі, як, напрыклад, турыстычныя агенцтвы, дзе сямейная скідка не прадстаўляецца гомасексуальным сем’ям.

Дыскрымінацыя транссексуалаў ня ўключаная ў абавязкі Амбудсмэна па пытаньнях гомасексуальных адносінаў. Транссексуалізм хутчэй тычыцца полу, чым сексуальных адносінаў і таму ўключаны ў абавязкі Амбудсмэна па роўных правах, якія ўключаюць дыскрымінацыю па прыкмеце полу як такога.

Зразумела, яшчэ вельмі шмат трэба зрабіць, каб спыніць дыскрымінацыю гомасексуалістаў і бісексуалаў. Напрыклад, мужчыны, якія маюць палавыя кантакты з іншымі мужчынамы, ня могуць быць донарамі крыві ў Швецыі. Гэта адбываецца з-за небясьпекі перад ВІЧ, які зьявіўся ў 1980-х. Лічыцца, што сярод гомасексуалістаў большая верагоднасьць зараженьня ВІЧ па прычыне распаўсюджанасьці сярод іх анальнага палавога акту. Але гетэрасексуальныя мужчыны і жанчыны з той самай верагоднасьцю могуць быць носьбітамі ВІЧ. Гэта хутчэй зьвязана з выкарыстаньнем прэзерватываў, чым з гомасексуалізмам.

Дзеці

Сёньня ў Швецыі каля 40 000 -- 60 000 дзяцей, якія маюць, па меншай меры, аднаго з бацькоў гомасексуаліста ці бісексуала. Большасьць такіх дзяцей зьявіліся ад ранейшых гетэрасексуальных адносінаў, але ўсё больш і больш гомасексуалістаў заводзяць дзяцей пасьля таго, як усьвядомілі, што яны гомасексуалісты. Найбольш

распаўсюджаны спосаб – гэта калі лесьбіянка зьвяртаецца да знаёмага гомасексуаліста (ці гетэрасексуала) з просьбай аб зачацьці дзіцяці шляхам апладненьня ў хатніх умовах. Паколькі закон Швецыі не дазваляе лесьбіянкам зацяжарыць шляхам апладненьня ў клініках Швецыі, многія лесьбійскія сем’і ці адзінокія гомасексуалісты і лесьбіянкі едуць у Данію для правядзеньня гэтай працэдуры.

З 2003 году гомасексуальныя пары ў Швецыі маюць права ўсынаўляць дзяцей, як і гетэрасексуальныя пары. На самой справе гэта ня значыць, што агенцтвы па ўсынаўленьні займаюцца гомасексуальнымі парамі, якія хочуць усынавіць дзяцей. Галоўная функцыя новага закону заключаецца ў тым, каб партнёр гомасексуаліста мог усынавіць дзіця свайго партнёра. У выпадку сьмерці біялагічнага бацькі дзіця можа без праблемаў застацца са сваім прыёмным бацькам, бо апякунства над дзіцем было сумесным.

Сітуацыя ў сьвеце

Гомасексуалізм усё яшчэ забаронены ў шмат якіх краінах. Самымі неспрыяльнымі рэгіёнамі ў гэтых адносінах зьяўляюцца Афрыка і поўдзень Азіі, дзе гомасексуалізм у ісламскім грамадзтве, якое жыве па законах шарыяту, караецца вышэйшай мерай. У Саудаўскай Аравіі гомасексуалізм караецца здыманьнем галавы. Астатнія рэгіёны Азіі ня маюць ніякіх законаў адносна гомасексуалізму, якія выконваюць карную ці абарончую функцыі. На Афрыканскім кантыненце толькі Паўднёвая Афрыка мае законы, якія абараняюць гомасексуалістаў. Там гомасексуалісты абароненыя Канстытуцыяй, і гомасексуальныя пары могуць усынаўляць дзяцей.

У Еўропе каля паловы дзяржаваў маюць ліберальныя законы адносна гомасексуалізму, другая ж палова такіх законаў ня мае зусім. У Нідэрландах гомасексуалісты і гетэрасексуалы цалкам роўныя, а ў Партугаліі, напрыклад, гомасексуалісты ня могуць служыць у войску ці паліцыі. У Вялікабрытаніі гомасексуальныя пары могуць усынаўляць дзяцей, але разважаць пра гомасексуалізм у пазітыўным ключы ў межах школьнага курсу палавога выхаваньня забаронена.

У ЗША гомасексуальныя адносіны зьяўляюцца незаконнымі ў 22 з 50 штатаў, дыскрымінацыя гомасексуалістаў забароненая ў 15 штатах, а гомасексуальныя шлюбы дазволеныя толькі ў некалькіх штатах.

Забабоны

У гомасексуальных адносінах адзін партнёр іграе ролю жанчыны, а другі партнёр -- мужчыны.

-- У гомасексуальных адносінах няма замацаваных роляў.

Гомасексуалісты зьяўляюцца педафіламі.

-- У прапарцыйных адносінах сярод гомасексуалістаў зьява педафіліі распаўсюджаная менш, чым сярод гетэрасексуалаў.

Дзеці з гомасексуальных сем’яў таксама становяцца гомасексуалістамі.

-- Прыналежнасьць бацькоў да гомасексуалістаў не ўплывае на арыентацыю дзяцей. Аднак дзеці гомасексуалістаў часта больш цярпімыя да многіх сацыяльных меншасьцяў.

Гомасексуалістаў можа прывабіць любы прадстаўнік того ж полу.

-- Гомасексуалісты прад’яўляюць партнёру такія ж высокія патрабаваньні, як і гетэрасексуалы.

Людзі становяцца гомасексуалістамі па прычыне сваёй непрывабнасьці для прадстаўнікоў супрацьлеглага полу.

-- Гомасексуалізм – гэта імкненьне да таго ж полу, а не непрывабнасьць для супрацьлеглага полу.

Гомасексуалізм – гэта вынік траўмы, атрыманай у дзяцінстве.

-- Ніхто ня ведае, чаму некаторыя людзі гомасексуальныя. Існуюць тэорыі як пра біялагічныя, так і пра фізіялагічныя прычыны гомасексуальнасьці, але пакуль застаюцца нявысьветленымі адрозьненьні (фізіялагічныя ці біялагічныя) паміж гетэрасексуаламі і гомасексуалістамі.

Станоўчая інфармацыя пра гомасексуалізм садзейнічае заахвочваньню ўсё большай колькасьці людзей да гомасексуальных адносінаў.

-- Інфармацыя ня можа зрабіць людзей гомасексуалістамі, але яна сапраўды дапамагае барацьбе з забабонамі, што дае палёгку жыцьцю гомасексуальных мужчынаў і жанчын.

# “ПРАБЛЕМА АДНОСІНАЎ ДА ГОМАСЕКСУАЛІЗМУ ЗАЙМАЕ АДНО З ПЕРШЫХ МЕСЦАЎ ПА НЕТАЛЕРАНТНАСЬЦІ…”

Эдвард Тарлецкі,

старшыня Рады Лігі сексуальнага раўнапраўя “Лямбда”

-- Эдвард, наколькі талерантна, на твой погляд, ставяцца беларусы да геяў і лесьбіянак?

-- Нашая арганізацыя праводзіла апытаньне сярод розных прадстаўнікоў беларускага грамадзтва, і атрымалася, што недзе каля 80 адсоткаў апытаных беларусаў ставяцца вельмі адмоўна. Прычым апытаныя былі толькі менчукі, гэта не былі людзі з іншых рэгіёнаў (насельніцтва сталіцы лічыцца менш кансерватыўным). Каля 80 адсоткаў людзей ставяцца вельмі адмоўна да гомасексуалістаў, у меншай ступені – да лесьбіянак.

-- Да лесьбіянак ставяцца лепей. Чаму?

-- Людзі лічаць, што лесьбіянкі – гэта быццам бы гэткая “жаночая дурнота”. У беларускім грамадзтве ўвогуле жанчына не разглядаецца сур’ёзна. Жанчына ня можа быць, напрыклад, добрым кіраўніком, добрым дэпутатам... Ня можа быць нечым добрым, акрамя хатняй гаспадыні і прыслужніцы. Гэта дакладнае капіраваньне фундаменталісцкага, магчыма, якога-небудзь мусульманскага жыцьця. Таму да лесьбіянак ставяцца ня тое каб больш цярпіма, а проста ня лічаць гэта за сур’ёзную праблему, бо гэта жаночая праблема. Да хлопцаў жа ставяцца найгорш, таму што мужчына ў беларускім грамадзстве павінен адыгрываць нейкую іншую ролю. Кахаць іншага мужчыну – гэта не ўпісваецца ў сьветапогляд сучаснага беларуса. Таму праблема адносінаў да гомасексуалізму займае адно з першых месцаў па неталерантнасьці.

-- Ці існуе адрозьненьне ў стаўленьні да сексуальных меншасьцяў з боку прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў?

-- Вядома! Чым больш чалавек адукаваны, а таксама чым больш ён зарабляе грошай, тым больш талерантна ставіцца ён да любых праяваў неаднолькавасьці. Гэта ня толькі ў Беларусі, гэта ўсюды так. Таму што людзі бедныя хацелі б, каб усе былі такія ж, як яны, і ня толькі ў беднасьці, а і ў сьветапоглядзе.

-- Ці можаш ты прывесьці прыклады праяваў нецярпімасьці да цябе альбо сябраў арганізацыі?

-- Такіх прыкладаў можна многа прыводзіць. Кагосьці звальняюць з працы. Вельмі часта здараюцца выпадкі, калі ўзьнікаюць жыльлёвыя праблемы. Напрыклад, ёсьць хлопцы, якія фактычна ствараюць аднаполую сям’ю: каб жыць разам, яны пачынаюць здымаць кватэру. Гэта нярэдкая зьява: гадаваліся разам з бацькамі, бацькі жывыя, свайго асобнага жыльля няма. Інстытут крэдыту на кватэры ў нас пакуль што слаба разьвіты. Вось і даводзіцца моладзі жыльлё здымаць. Калі суседзі неўзабаве даведваюцца, чаму гэта два хлопцы здымаюць кватэру, пачынаецца цкваньне. Яно пачынаецца нават ня з гэтых людзей, а з гаспадароў, якія гэтую кватэру хлопцам здаюць. Гаспадар адмаўляе гэтым хлопцам-кватарантам, і яны вымушаныя шукаць сабе іншы прытулак. Дарэчы, немагчымасьць жыць разам зьяўляецца дастаткова моцнай праблемай, падставай для таго, каб геям з Беларусі далі прытулак заходнія краіны. Яны прызнаюць гэтую праблему – немагчымасьці для людзей жыць разам.

-- Настолькі ўважліва ставяцца да чалавечых пачуцьцяў?

-- Так. Людзі хочуць жыць разам, і яны маюць на гэта права, нават нягледзячы на тое, што немагчыма афіцыйна заключыць аднаполы шлюб. Але ўсё роўна чалавек мае права на сумеснае пражываньне з кім хоча! Што да нашай арганізацыі, то цяжка сказаць, колькі людзей і дзе шукае прытулак, але, напрыклад, два сябры “Лямбды” летась атрымалі прытулак у Францыі. Яны хацелі жыць разам, але тут гэта было немагчыма, і яны зьехалі.

Як бачна з маніторынгу, які мы вядзем, вельмі цяжка давесьці, што чалавека звольнілі з працы таму, што ён – гомасексуаліст. Альбо з вучобы “папрасілі”... кудынебудзь перавесьціся. Могуць сказаць, што не пасьпявае чалавек вучыцца ці кепска працуе. Сапраўды, гэта вельмі цяжка давесьці!

-- Ніхто чалавеку наўпрост такое ня скажа?

-- Вядома, ня скажа. Хоць не, можа хто і скажа! Асабліва ў нашым такім бесцырымонным грамадзтве дык могуць і сказаць у твар. Тут не Захад, дзе кіраўнікі дбаюць пра нейкую паліткарэктнасьць!

Вось, напрыклад, ёсьць такі Першы музычны тэлеканал у Беларусі, і там ёсьць унізе экрану бягучы радок – “піпл-чат” называецца. І гэты музычны канал вывесіў на сваім сайце правілы разьмяшчэньня аб’яваў у гэтым піпл-чаце. Там так і напісана:

забароненыя абвесткі накшталт “хлопец пазнаёміцца з хлопцам”, “дзяўчына пазнаёміцца з дзяўчынай”, “пара пазнаёміцца з парай”. Ну вось гэта і ёсьць сьведчаньне таго, наколькі беларусы талерантна ставяцца да сексуальных меншасьцяў.

-- А як ты мяркуеш, ці гэта ня ёсьць яшчэ і сьведчаньнем нашага вяртаньня ў мінулае? З вучобы маглі адлічыць за “амаралку”, па сутнасьці, ні за што. Дзяўчына і хлопец размаўляюць пад келіх чырвонага віна, больш нікога няма, і тут у пакой заходзіць камендант інтэрнату. Іх выключаюць з ВНУ за амаральныя паводзіны. “Амаралка” вяртаецца? Палітычны асьпект жыцьця ўплывае на прыватнае жыцьцё?

-- Вядома, усё ўплывае, таму што ідзе прапаганда з тэлебачаньня, з радыё, што ўсе павінны думаць аднолькава і паводзіць сябе аднолькава: быць прыхільнікамі беларускай дзяржавы -- такой, якой яна зараз ёсьць. Увогуле, стаўленьне да іншадумства ў грамадзтве (у любым грамадзтве, да любога іншадумства) вельмі цесна зьвязанае з маёмаснымі пытаньнямі. Чым больш у грамадзтве разьвіваецца інстытут прыватнай уласнасьці, тым больш гэтае грамадзтва цярпімае. Напрыклад, я назіраў, што адбываецца ў Польшчы, каталіцкай краіне, якая, здавалася б, павінна быць яшчэ больш гамафобнай за Беларусь. У адрозьненьні ад Беларусі, там людзі сапраўды ходзяць у касьцёлы і ў цэрквы, бо вераць, а ня проста штучна прыходзяць. Там я назіраў “круглыя сталы”, дзе за адным сталом сядзяць ксёндз і прадстаўнік арганізацыі гомасексуалістаў. Яны проста абмяркоўваюць праблемы, якія ў іх узьнікаюць: аднаполых саюзаў ці, скажам, усынаўленьня дзяцей. У Беларусі гэта немагчыма.

-- А калі б зараз, уявім, у Беларусі стала так вольна, свабодна, дэмакратычна, што дзяржава дазволіла б аднаполыя шлюбы і ўсынаўленьне дзяцей? Ці гатовыя да такога нашыя геі ды лесьбіянкі? Шмат людзей з гэтай магчымасьці скарысталіся б?

-- Ня ведаю, наколькі шмат людзей да гэтага зьвярталася б, але шлюб – гэта ж можа быць ня толькі афіцыйна афармленае сумеснае жыцьцё. Можа быць, у нашым грамадзтве ўвогуле несур’ёзна ставяцца да любых падпісаных пагадненьняў, таму што бачаць, што нават прадстаўнікі ўлады не выконваюць сваіх абавязкаў? Гэта значыць, можна не выконваць сваіх абавязкаў і калі ты шлюбуешся... У некаторых краінах Еўропы вельмі папулярна зараз прымаць адмысловыя акты пра такую зьяву, якая называецца “зарэгістраванае партнёрства”. Партнёрства не ў такім разуменьні, як шлюб, як мы ведаем у Беларусі, а ў такім, што калі людзі жывуць разам (незалежна ад таго, ці яны зьяўляюцца сексуальнымі партнёрамі, ці не – дзьве сястры, напрыклад, жывуць разам), яны могуць таксама пайсьці і зарэгістраваць

гэтае сваё партнёрства. Адзін з асьпектаў – людзі нейкі дабрабыт нажываюць разам, а потым разыходзяцца, і вось як яго дзяліць? Гэта абараняе правы кожнага з іх на сумесна нажытую маёмасьць. Альбо, напрыклад, жывуць два чалавекі разам, скажам, гадоў дзесяць, і кожны з іх траціў свае высілкі – матэрыяльныя, духоўныя – на свайго партнёра. А потым гэты партнёр гаворыць, што ня хоча з ім жыць. Вядома, другі чалавек пацярпеў і мае права на нейкую матэрыяльную кампенсацыю. У выніку таго, што іхняе партнёрства было зарэгістраванае, засьведчанае дзяржавай, гэты партнёр мае права высунуць нейкія патрабаваньні да таго, хто, кажучы проста, яго кідае.

Часта праціўнікі аднаполых саюзаў гавораць: навошта гэта ўсё рэгістраваць як і ўсім астатнім людзям, калі вы можаце проста пайсьці ў натарыяльную кантору і скласьці там дамову пра супрацоўніцтва? Але ж гэтая дамова ня мае ні грамадзкага, ні законнага сэнсу. Дапусьцім, памёр адзін з партнёраў, і як яго пахаваць? Выдадуць цела толькі сваякам. А вы жылі з гэтым чалавекам вельмі доўга... І гэта тычыцца, дарэчы, ня толькі аднаполых саюзаў – тое самае з грамадзянскімі шлюбамі, калі людзі жывуць разам і не рэгіструюць свае адносіны ў загсе. І ты ня маеш тады ніякіх правоў! Вельмі цікавая ў дачыненьні да гэтых грамадзянскіх шлюбаў французкая мадэль. Дзесьці ў годзе 2002-м быў прыняты “Пакт грамадзянскай салідарнасьці”, якім былі прызнаныя законнымі ўсе грамадзянскія шлюбы ў краіне. Незалежна ад таго, якія яны – аднаполыя, рознаполыя, галоўнае -- разам людзі жывуць. Яны былі прызнаныя ўсе і зраўняныя з усімі астатнімі шлюбамі. Французкае грамадзтва ізноў паказала Еўропе, у якім накірунку можна рухацца. Яны проста прызналі ўсе шлюбы!..

-- Давай паразважаем: чаму ўсё ж нашыя людзі баяцца менавіта гомасексуалізму? Вядома, трэба яшчэ разьбірацца, віна гэта ці бяда для саміх геяў; вядома, можна ставіцца дастаткова лаяльна да праяваў непадобнасьці людзей і разумець, што ў кожнага з нас могуць быць розныя стасункі са сьветам. Але пакуль растуць дзеці, пакуль яны не сфармаваныя як асобы, бацькам ня хочацца, каб яны ведалі пра сексменшасьці. Ці інфармацыя пра іх павінна ўплываць на фармаваньне моладзі? Людзі баяцца разбэшчваньня падрастаючага пакаленьня сексуальнымі меншасьцямі?

-- Людзі баяцца ад таго, што ў іх няма інфармацыі. Бо любы страх заснаваны на няпэўнасьці: баяцца таго, чаго ня ведаюць. Чалавек ня ведае, што з ім будзе заўтра, і ён баіцца заўтрашняга дня. Ніхто ніколі ня змог даказаць, што гомасексуальнасьць можа неяк “прышчапіцца” ад аднаго чалавека да другога, калі ў таго няма да гэтага

схільнасьцяў. Для нашай арганізацыі дык усё роўна: нарадзіўся чалавек геем, стаў ён такім... Мы не разьбіраемся ў гэтым, гэта праблема для навукоўцаў – зразумець, адкуль такія людзі бяруцца. А для нас важна, каб людзям тлумачылі, што ёсьць такія праявы сексуальнасьці чалавека, і чым раней гэта будзе адбывацца, тым будзе лепш для ўсіх. Ва ўсіх краінах, разьвітых у плане сексуальнага выхаваньня, дзецям пачынаюць тлумачыць з трэцяга класу, што ёсьць розныя праявы сексуальнасьці чалавека, і што гэта нармальна. І калі дзецям, падлеткам гэта гаварыць, яны будуць больш талерантна ставіцца да розных праяваў у сваіх сяброў, калі будуць заўважаць такія рэчы. А пра што гаварыць, калі ў Беларусі палавое выхаваньне пачынаецца з універсітэту? Вось мая сяброўка вучыцца ў БДУ, і ім выкладаюць палавое выхаваньне. А ў школе ў нас забаронена гаварыць пра гомасексуалізм і ўвогуле пра секс. І таму, што ў Беларусі няма культуры палавога выхаваньня дзяцей, яны спасьцігаюць усё на ўласным вопыце. Гэта ўсё ад таго, што ім не тлумачаць, а ў сем’ях тэма сексу па-ранейшаму застаецца табу. Добра, што паказваюць хоць серыял “Секс у вялікім горадзе”, яны хоць пра нешта даведаюцца! У адной маёй сяброўкі ёсьць дачка, якой 12 гадоў. І праз тое, што мы сябруем з яе маці, яна ведае вельмі шмат пра гомасексуалістаў і лесьбіянак, яна нават чытала часопіс, які мы выдавалі. Ні я, ні яе маці не заўважалі ў яе нейкіх праяваў лесьбійства з-за таго, што яна прачытала гэтыя часопісы. Я нават чуў, як гэтая дзяўчынка казала, што перастала размаўляць з адным хлопцам, які вельмі непаважна выказваўся пра гомасексуалістаў.

-- Дэпутат Кучынскі выказаў прапанову зноў увесьці крымінальную адказнасьць за аднаполыя сексуальныя сувязі, як гэта было ў Савецкім Саюзе. Гэта рэальная пагроза ці проста эмацыйныя словы?

-- Я ўвогуле не разумею, чаму Кучынскі так зрабіў. Ён дэпутат ужо некалькіх скліканьняў, тым больш, здаецца, быў у камісіі па замежнай палітыцы, павінен ведаць, што Беларусь ратыфікавала шмат міжнародных пагадненьняў, паводле якіх яна не можа ўвесьці такую адказнасьць за аднаполыя сувязі. Гэта несур’ёзна. Гэта проста можна разглядаць як адну з праяваў гомафобнасьці беларускага грамадзтва. Вярнуцца ў савецкія часы настолькі Беларусь ужо ня зможа. Ужо шмат чаго зьмянілася, і гэта паказала стаўленьне да прапановы Кучынскага іншых дэпутатаў, якія не падтрымалі яго. Можна было па-рознаму ставіцца да міністра ўнутраных справаў Навумава, але ён сам прапанаваў не кранаць гэтую тэму. Я разумею чаму. Таму што ўвогуле тэма гомасексуалізму для беларускай дзяржавы не існуе, як калісьці не існавала тэма сексу ў савецкай дзяржаве. Але Навумаў зрабіў гэта, хутчэй,

не як дзяржаўны дзеяч, а як юрыст. Таму гэта можна разглядаць толькі як праяву гомафобнасьці асабіста Кучынскага.

-- Акцыі "Лямбды" – зьнешне вельмі тэатральныя. Хлопцы, пераапранутыя ў сексапільных дзяўчат, у многіх староньніх назіральнікаў асацыююцца з усёй дзейнасьцю вашай арганізацыі. Хоць вы супраць СНІДУ змагаліся, але і разьвесялілі народ "альтэрнатыўным конкурсам прыгажосьці"...

-- Любая акцыя можа мець розныя формы, галоўнае – прыцягнуць увагу да сябе і сваіх праблемаў. Калі людзі заўважаюць, што нешта там адбываецца дзіўнае, то потым яны пачынаюць унікаць у сутнасьць. Таму любая акцыя павінна быць эпатажнай, незвычайнай. Калі мы нешта праводзілі і нехта пераапранаўся, то гэта сьпецыяльна рабілася для таго, каб усё выглядала незвычайна і прыцягвала ўвагу. Каб людзі задумаліся, што гэта такое, і пачалі цікавіцца.

-- Табе, напэўна ж, запомніўся выпадак, калі вашая арганізацыя была правакацыйна скарыстаная ўладамі. Падчас выбараў прайшлі шэсьцем, а прапаганда правяла паралель паміж сексуальнымі і палітычнымі " меншасьцямі"... Скарыстаная нецярпімасьць грамадзства -- гэта аддзяляе геяў ад палітыкі?

-- Я ня ведаю, што было там выкарыстана і чаму гэта было выкарыстана... Больш зьдзіўляе іншае: пераважная большасьць беларускіх праваабарончых арганізацыяў моцна цураюцца праблемы гомасексуалізму. А тым часам гэтая праблема Еўропу і Амерыку цяпер вельмі моцна цікавіць. Замежнікі, вядома ж, пытаюцца пра гэта ў беларускіх праваабаронцаў. І там, за мяжой, яны ўсе падтрымліваюць нашыя правы, але калі прыязджаюць, хуценька забываюцца. І прадстаўнікі апазіцыйных рухаў лічаць, што калі яны адкрыта падтрымаюць гомасексуалістаў у барацьбе за свае правы, то дзяржаўная прапаганда выкарыстае гэта – і ўсё, і ўжо ніхто ня будзе за іх галасаваць, ня будзе іх падтрымліваць. Менавіта такая праблема была ў Югаславіі перад падзеньнем рэжыму Мілошавіча. Апазіцыйныя лідэры ў Югаславіі адкрыта сказалі: так, мы падтрымліваем і гомасексуалістаў у тым, што яны дамагаюцца сваіх правоў. І дзяржаўная прапаганда ўжо не магла гэта выкарыстаць супраць іх, таму што яны самі адкрыта сказалі пра гэта.

-- Ты лічыш, такое магчыма ў Беларусі?

-- Я ня ведаю ўвогуле... Тут цяжка сабе ўявіць, што можа быць праз пэўны час, немагчыма ўвогуле нешта прагназаваць і ўяўляць. Раней мы былі больш актыўнымі. Быў Кангрэс моладзі Беларусі, мы так намагаліся туды патрапіць... Ці нейкія іншыя мерапрыемствы: мы ў іх удзельнічалі, цяпер – ня ўдзельнічаем. Як і ў акцыях

апазіцыі.... Тут, у гэтай краіне, даволі шмат людзей разумных, людзей, якія думаюць і мысьляць нармальна! Проста апазіцыі альбо нейкаму апазіцыйнаму руху трэба перастаць цурацца і гэтай праблемы. Калі б нехта з іх сказаў, што нас падтрымлівае, нічога б страшнага не адбылося. Але гэта адабрала б зброю ў дзяржаўнай прапаганды.

# ГАНДАЛЬ ЗБРОЯЙ – ЗЛАЧЫННЫ ГЕНАЦЫД

Рольф Ліндаль,

Швецкая арганізацыя Міру і Арбітражу (SPAS)

Міжнародная перспьектыва

Ваенная прамысловасьць, якая мае дзяржаўную падтрымку і садзейнічае гандлю зброяй, зьяўляецца прычынай нестабільнасьці, крывавых канфліктаў і войнаў. Нам ўсім вядомыя пакуты ўцекачоў, галеча і парушэньне правоў чалавека. Штогод на ваенныя расходы ў сьвеце ідзе звыш 800 мільярдаў даляраў. Гэта больш за 130 даляраў на кожнага жыхара планеты. У той самы час каля 30 000 дзяцей паміраюць ад хваробаў, выкліканых галечай. Пры наяўнасьці палітычнай волі гэтых дзяцей можна было б выратаваць. У сьвеце, дзе штогод з прычыны голаду паміраюць мільёны, гандаль зброяй – гэта злачынны маўклівы генацыд, за які нясуць адказнасьць усе дзяржавы-вытворцы, імпарцёры і экспарцёры зброі. Гэта пытаньне прынцыпаў і палітычнага волевыяўленьня.

Большасьць заможных краінаў сьвету зьяўляюцца пастаўшчыкамі зброі, а бедныя краіны – пакупнікамі. 97 % зброі экспартуецца з заможных краінаў. Сярод бедных краінаў пакупнікамі выступаюць дзьве трэція краінаў. Гэта відаць з графіку, дзе асноўныя экспартныя плыні ідуць з поўначы на поўдзень. Калі дадаць графік канфліктаў, абедзьве схемы практычна цалкам супадуць, бо большасьць канфліктаў на сёньняшні дзень адбываецца ў паўднёвым паўшар’і.

10 самых буйных пастаўшчыкоў зброі за 1997-2001 гг. (у далярах ЗША па коштах 1990 году. Дадзеныя Гадавой справаздачы Sipri за 2002 год (працэнты акругленыя)).

1. ЗША 44821 (44%)
2. Расія 17354 (17%)
3. Францыя 9808 (10%)
4. Вялікабрытанія 6699 (7%)
5. Германія 4821 (5%)
6. Украіна 2627 (3%)
7. Нідэрланды 1862 (2%)
8. Італія 1671 (2%)
9. Кітай 1555 (2%)
10. Беларусь 1518 (2%)

Паказальна, што чатыры дзяржавы з пяці, якія ствараюць Савет Бясьпекі ААН, зьяўляюцца чатырма буйнейшымі пастаўшчыкамі зброі ў сьвеце. Дзяржавы-члены НАТА экспартуюць каля 80 % ад ўсёй колькасьці экспарту зброі, а на долю дзяржаваў-членаў Еўрасаюзу прыходзіцца 30 % ад усяго аб'ёму экспарту.

10 самых буйных імпарцёраў зброі за 1997-2001 гг. (у далярах ЗША па коштах 1990 году. Дадзеныя Гадавой справаздачы Sipri за 2002 год (працэнты акругленыя)).

1. Тайвань 11 397 (11%)
2. Кітай 7117 (7%)
3. Саудаўская Аравія 6717 (7%)
4. Турцыя 5028 (5%)
5. Індыя 4710 (5%)
6. Грэцыя 4436 (4%)
7. Паўночная Карэя 3931 (4%)
8. Егіпет 3250 (3%)
9. Японія 3203 (3%)
10. Пакістан 2931 (3%)

Нягледзячы на тое, што большасьць пастаўшчыкоў зброі, такія, як Швецыя, маюць сур'ёзныя абмежаваньні ў адносінах экспарту ўзбраеньняў, на практыцы гэтыя абмежаваньні не такія суровыя. Некаторыя з гэтых краінаў уцягнутыя ў ваенныя дзеяньні і адносяцца да неспрыльных рэгіёнаў, у іншых ідуць грамадзянскія войны. У большасьці гэтых краінаў правы чалавека не выконваюцца.

Беларускі прыклад

Давайце паглядзім на Беларусь як на пастаўшчыка зброі. “Беларусь іграе актыўную ролю ў замацаваньні міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне разьвіцьця эфектыўнага кантролю экспарту і павелічэньні празрыстасьці працэсаў у гэтай галіне”. Гэта цытата з дакладу ўраду Беларусі аб экспарце ўзбраеньняў. Гучыць аптымістычна.

Але што тоіцца за гэтымі словамі? На практыцы Беларусь зьяўляецца адной з тых краінаў, якія пры дапамозе экспарту зброі падтрымліваюць самых жорсткіх дыктатараў, самыя мілітарызаваныя дзяржавы і краіны, якія найбольш злосным чынам парушаюць правы чалавека. Давайце разгледзім некалькі прыкладаў экспарту ўзбраеньня Беларусьсю за апошні час. Такім чынам, я прывяду параўнаньне з дакладам Міжнароднай Амністыі за 2001 год для таго, каб высьветліць, ці падтрымлівае Беларусь краіны, дзе парушаюцца правы чалавека.

Экспарт беларускіх узбраенняў у краіны, дзе парушаюцца правы чалавека (У 2001 годзе беларускі экспарт узбраеньня перавысіў 500 мільёнаў даляраў. Крыніца: Польскі цэнтр усходніх даследваньняў).

Йемен. 9000 аўтаматаў Калашнікава пастаўленыя ў 1995 годзе. Крыніца: Den Daily 16/5 2002 г.

Амністыя 2001: Стала вядома пра катаваньні і сьмерці тых, хто знаходзіцца за кратамі. Працягвае існаваць практыка цялесных пакараньняў. Па меншай меры, 13 чалавек былі пакараныя сьмерцю і сотні чалавек знаходзяцца ў чаканьні сьмяротнага прысуду на канец 2000 году.

Уганда купіла ў 1997 годзе ў Беларусі чатыры верталёты MI-24 на суму 6,5 мільёнаў даляраў. Крыніца: 12 сьнежня 2002 году газета Monitor гораду Кампала надрукавала сакрэтны даклад, у якім рэкамендавана было ўзбудзіць крымінальную справу супраць аднаго з вядучых генералаў Арміі Абароны Народу Уганды (UPDF), малодшага брата прэзідэнта Йоверы Мусевені (Yoweri Museveni). У 1999 годзе ва Уганду было дастаўлена 10 000 адзінак дробнага ўзбраеньня. Крыніца: Den Daily 16/5 2002 г.

Амністыя 2001: Асноўныя парушэньні правоў чалавека былі зьдзейсьненыя ўзброенымі апазіцыйнымі групоўкамі, якія займаліся забойствамі і выкраданьнем людзей на працягу ўсяго 2000 году. Паведамлялася пра катаваньні і правядзеньні пакараньняў сьмерцю сакрэтнымі службамі без прысудаў.

Перу. У Беларусі купленыя 18 зьнішчальнікаў МІГ-29 і 15 бамбардзіроўшчыкаў СУ-25 у 1998 годзе. Крыніца: Financial Times, 22 верасьня 2002 году.

Амністыя 2001: Катаваньні і кепскае абыходжаньне зьяўляюцца паўсюднай зьявай.

Алжыр. 28 самалётаў МІГ дастаўленыя ў 1999-2001 гадах (транспартаваліся з Расіі праз Беларусь). Крыніца: Гадавая справаздача Sipri 2002 г.

Амністыя 2001: Больш за 2500 чалавек, уключаючы жанчын і дзяцей, былі забітыя ўзброенымі групоўкамі, якія называлі сябе “Ісламісцкімі групоўкамі”, а таксама сакрэтнымі службамі і ваенізаванымі фармаваньнямі.

Ангола. 20 бамбардзіроўшчыкаў СУ-25 дастаўленыя ў 2000-2001 гадах. Крыніца: Гадавая справаздача Sipri 2002 г.

Амністыя 2001: Урадавае войска зьдзяйсьняла грубае парушэньне правоў чалавека, уключаючы забойства мірных грамадзянаў. Урад праводзіў палітыку абмежаваньня свабоды самавыяўленьня.

Акрамя таго, Беларусь была абвінавачаная ў ваенным супрацоўніцтве з такімі дзяржавамі, як Ірак, Іран і Судан.

Швецкі прыклад

Адразу за Беларусьсю – на адзінаццатым месцы – у сьпісе буйнейшых экспарцёраў (згодна справаздачы SIPRI) ідзе Швецыя. У Швецыі добрая рэпутацыя, калі справа тычыцца дэмакратыі і становішча з правамі чалавека ўнутры краіны. Але ці такая ж справа з экспартам узбраеньня? Праўда заключаецца ў тым, што Швецыя таксама падтрымлівае многія тэрарыстычныя рэжымы праз гандаль зброяй.

“У Швецыі самыя строгія правілы адносна экспарту зброі”. Працяглы час гэта было аксіёмай для Швецыі. Але пасьля таго, як SPAS на працягу 20 гадоў сістэматычна правярала дадзеныя аб экспарце зброі Швецыяй, вынікі аказаліся зусім іншымі.

Кантрабанда

У сярэдзіне 80-х SPAS змагла высьветліць, што Швецыя падтрымлівае жорсткія дыктатарскія рэжымы пры дапамозе кантрабанды зброі. У 1984 годзе SPAS атрымала скаргу на швецкага вытворцу ўзбраеньня Bofors. Кампанія паслала так званых Робатаў 70 у Сінгапур, адкуль яны былі нелегальна экспартаваныя ў забароненыя краіны Дубай і Бахрэйн.

З гэтай інфармацыі пачаўся скандал, зьвязаны з Bofors, які стаў адным з самых буйных скандалаў у гісторыі Швецыі. Вялікая колькасьць журналістаў, палітыкаў і арганізацыяў пачалі расьследваньне кантрабанды зброі. І ў хуткім часе высьветлілася, што кантрабанда была хутчэй правілам, чым выключным выпадкам.

SPAS высьветліла, што швецкая ваенная тэхніка выкарыстоўвалася двума бакамі ў Ірана-Іракскай вайне. Напрыклад, Bofors адпраўляла выбуховыя рэчывы для 1,3 мільёнаў супрацьпяхотных мінаў праз італьянскую кампанію ў Іракскі Курдыстан.

Карупцыя

SPAS таксама высьветліла высокую ступень карумпаванасьці ваеннай прамысловасьці. У 1986 годзе паміж Швецыяй і Індыяй быў заключаны самы буйны кантракт на пастаўку зброі. Швецыя павінна была паставіць у Індыю гаўбіцы. Але ў

хуткім часе пасьля падпісаньня кантракту зьявілася інфармацыя пра тое, што Bofors выкарыстала подкуп для заключэньня пагадненьня. Гэта выклікала абурэньне ў Індыі і паклала пачатак расьследваньню аб атрыманьні хабару. Гэтая справа зьяўляецца адной з самых буйных справаў аб карупцыі ў Індыі, і нават сёньня ў індыйскіх газетах можна прачытаць пра скандал з кампаніяй Bofors. Скандал таксама закрануў тых, хто стаяў за заключэньнем пагадненьня, напрыклад, былога прэм’ер-міністра Індыі Раджыва Гандзі. Ён выйграў выбары дзякуючы сваёй праграме барацьбы з карупцыяй. Інфармацыя пра хабары і далучанасьць да справы адносна карупцыі Гандзі стала прычынай таго, што ён прайграў наступныя выбары. Вядома, грамадзяне Індыі былі расчараваныя. Bofors не плаціў хабару са сваёй уласнай кішэні. Яны проста павялічылі кошт кантракту. Такім чынам, у выніку хабар аплочвалі індыйскія падаткаплацельшчыкі.

Пастаўкі ўзбраеньняў у краіны, якія вядуць ваенныя дзеяньні, а таксама ў дзяржавы, якія парушаюць правы чалавека

У канцы 90-х былыя дырэктары кампаніі Bofors былі прыцягнутыя да суду за кантрабанду. З таго часу SPAS пачала назіраць за экспартам узбраеньняў, якія зьдзяйсьняў урад. У Швецыі існуе два крытэрыі таго, чаму ўзбраеньне не павінна экспартавацца: краіна-імпарцёр знаходзіцца ў стане вайны альбо груба парушае правы чалавека. І той, і другі крытэрыі былі парушаныя ўрадам.

У 1995 годзе быў надрукаваны даклад пра тое, што Швецыя экспартавала ўзбраеньні на 33 вайны за перыяд паміж 1980 і 1994 гадамі. З гэтай лічбы 27 войнаў былі спансіраваныя ўрадам. Прывяду два прыклады:

У 1975 годзе Інданэзія акупавала Усходні Цімор, які ня так даўно вызваліўся з-пад каланіяльнага кантролю. Акупацыя прывяла да генацыду 200 000 чалавек – адна трэць насельніцтва была зьнішчаная. Тры гады аж да 1986 году кампанія Bofors паставіла зброі і рабатызаванай тэхнікі на суму 600 мільёнаў швецкіх кронаў.

Другім прыкладам можна назваць экспарт у 1983 годзе гранатамётаў Карл Густаў на суму 33 мільёны швецкіх кронаў у Бірму, дзе з 1948 году ішла грамадзянская вайна.

Хаця крытэрый, зьвязаны з правамі чалавека, зьяўляецца самым істотным у Швецыі, SPAS таксама высьветліла, што ўрад адступае ад сваіх уласных правілаў. У 2001 годзе SPAS надрукавала даклад пра тое, што Швецыя прадавала камплектуючыя да ваеннага ўзбраеньня 10 краінам, у якіх парушэньні правоў чалавека былі распаўсюджанай зьявай. Напрыклад, Швецыя прадавала

камплектуючыя такім краінам, як Бразілія, Туніс і Малазія. SPAS таксама высьветліла, што на працягу 90-х Швецыя прадавала ўзбраеньне 14 з 69 краінаў, якія не падпісалі міжнародную канвенцыю пра катаваньні. Сярод іх -- Індыя, Аман і Пакістан.

Магчымасьці няўрадавых арганізацыяў

Экспарт узбраеньня і правы чалавека – гэта ўраўненьне, якое немагчыма вырашыць. Немагчыма аб'яднаць намаганьні ў імя міру і разам з тым прадаваць зброю дыктатарам, краінам, якія ваююць і парушаюць правы чалавека.

Па трагічнай іроніі, самыя буйныя пастаўшчыкі зброі ў сьвеце зьяўляюцца пастаяннымі членамі Савету Бясьпекі ААН і павінныя забясьпечваць мір і бясьпеку. Гэта адзін з самых вялікіх парадоксаў. Як паказала практыка, калі справа тычыцца ўзбраеньня, грошы замяняюць правілы і законы, а міжнародныя пагадненьні ня маюць вялікага значэньня. Ваенная прамысловасьць – гэта сур'ёзная і найбольш карумпаваная галіна эканомікі.

Але, як паказвае гісторыя, нават такія невялікія няўрадавыя арганізацыі як SPAS, могуць дабіцца сур'ёзных зьменаў. Мы дасягнулі пэўных вынікаў. Вось некалькі міжнародных прыкладаў і прыкладаў са Швецыі.

Міжнародныя кампаніі

У пачатку 90-х міжнародная кааліцыя няўрадавых арганізацыяў пачала пасьпяховую кампанію па забароне супрацьпяхотных мінаў, якая ў 1997 годзе завяршылася падпісаньнем міжнароднай канвенцыі. У тым жа 1997 годзе кампанія атрымала Нобелеўскую прэмію.

У 1998 годзе Еўрапейская кааліцыя няўрадавых арганізацыяў прымусіла ўрады еўрапейскіх краінаў прыняць жорсткі кодэкс паводзінаў у адносінах да перадачы ўзбраеньняў. Гэты кодэкс паводзінаў садзейнічаў павышэньню празрыстасьці гэтай сферы ў краінах-членах Еўрасаюзу і краінах-кандыдатах ў члены ЕС.

Кампанія за кантролем дробнага ўзбраеньня пад назвай Internacional Action Network on Small Arms, IANSA пачалася ў 1998 годзе і завяршылася ў 2001 правядзеньнем канферэнцыі пад эгідай ААН, на якой быў прыняты план дзеяньняў па кантролі над распаўсюджаньнем узбраеньня.

Мы змаглі ўпэўніцца, што прагрэсіўна настроеныя ўрады змогуць дапамагчы ў барацьбе супраць распаўсюджаньня ўзбраеньняў. Канадзкі ўрад узначаліў гэты сьпіс. Еўрасаюз зьяўляецца адным з самых прагрэсіўных удзельнікаў перамоваў ААН па ажыцьцяўленьні плану дзеяньняў па кантролі над дробным узбраеньнем.

Намаганьні, прыкладзеныя асобнымі грамадзянамі і ўстановамі, таксама могуць зьмяніць становішча ў краіне і пашырыць межы кантролю над узбраеньнямі, як гэта адбылося ў Беларусі. У кастрычніку 2002 году Беларусь упершыню прадставіла гадавы даклад ураду адносна экспарту ўзбраеньня. І хаця ў гэтым невялікім дакладзе не прысутнічаюць канкрэтныя лічбы, гэта ўсё ж першы і доўгачаканы крок наперад.

Кампаніі ў Швецыі

У Швецыі таксама ёсьць свае посьпехі.

• Кампанія SPAS па выяўленьні кантрабанды ўзбраеньня прымусіла ўрад – мы першая такая краіна ў Еўропе – прадставіць у 1985 годзе гадавы ўрадавы даклад адносна экспарту ўзбраеньня са Швецыі.

• Кампанія SPAS прывяла да стварэньня ў 1985 годзе парламенцкага савету, які мае права на дэталёвае азнаямленьне з усімі дамовамі па пастаўцы ўзбраеньня са Швецыі.

• Кампанія SPAS дапамагла ліквідаваць такую зьяву, як кантрабанда ўзбраеньня, што азначае зьмяншэньне экспарту ўзбраеньня на 30 %.

• Кампанія SPAS прывяла да таго, што Швецыя стала краінай з самымі жорсткімі правіламі кантролю над экспартам узбраеньня.

Аднак я не магу сказаць, што кампанія SPAS зрабіла дастатковы ўнёсак для поўнага спыненьня экспарту ўзбраеньня. Але важна адзначыць, што нашая кампанія, магчыма, устрымала ўлады ад выдачы ліцэнзіяў відавочным парушальнікам правоў чалавека і ў пэўнай ступені зьнізіла экспарт узбраеньня суседніх краінаў.

Мы ганарымся, прыводзячы гэтыя прыклады са Швецыі і іншых краінаў. Гэтыя перамогі натхняюць нас – і мы спадзяемся, што і астатніх – на працяг нашай справы ў імя міру і дэмакратыі.

# ЗЬМЕСТ

ПЫТАНЬНІ ТАЛЕРАНТНАСЬЦІ: ГІСТОРЫЯ, СУЧАСНАСЬЦЬ, ПЕРСЬПЕКТЫВЫ .................. 1

ТОМАШУ ВАЦКУ ПРЫСЬВЯЧАЕЦЦА .................................................................... 2

УСТУП .............................................................................................................. 4

“ЛЮБІШ СВАЁ, ПАВАЖАЙ І ЧУЖОЕ. ЛЮБІШ ЧУЖОЕ, ШАНУЙ І СВАЁ…” .......................... 6

ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ = ЦЯРПІМАСЬЦЬ = ЦЯРПЛІВАСЬЦЬ? ............................................. 11

ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ БЕЛАРУСАЎ: АБЫЯКАВАСЬЦЬ ЦІ ДУХОЎНАЕ ЗАПАТРАБАВАНЬНЕ? 24

ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ У КУЛЬТУРЫ І КУЛЬТУРА ТАЛЕРАНТНАСЬЦІ .................................. 34

“У ЛЮДЗЕЙ НЯМА ЎПЭЎНЕНАСЬЦІ, ШТО ЗАЎТРА БУДЗЕ СПАКОЙНЫМ…” ................. 37

“ДЗЯРЖАВА ПАРАДЖАЕ НЯРОЎНАСЬЦЬ…” ............................................................ 43

“СВАБОДЫ ВЕРАВЫЗНАНЬНЯ Ў ЯЕ НАЙПРОСТЫМ РАЗУМЕНЬНІ Ў НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ НЕ ІСНУЕ…” ..................................................................................................... 47

УНІЯ Ў БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЬЦЬ.......................................................... 49

СВАБОДА ВЕРАВЫЗНАНЬНЯ: МІЖНАРОДНЫЯ СТАНДАРТЫ І ВОПЫТ ШВЕЦЫІ............ 56

ТАЛЕРАНТНАСЬЦЬ У НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СУПОЛЬНАСЬЦІ ............................................ 63

ФАКТАРЫ ТАЛЕРАНТНАСЬЦІ Ў КАНТЭКСЬЦЕ РАЬЗВІЦЬЦЯ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗТВА (НА ПРЫКЛАДЗЕ ГОМЕЛЬСКАГА РЭГІЁНУ) ............................................................ 73

“НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МЕНШАСЬЦІ ПАВІННЫЯ ЎЗБАГАЧАЦЬ КУЛЬТУРУ КРАІНЫ..” ......... 78

“ЗВАЦЦА БЕЛАРУСАМ У ПОЛЬШЧЫ СЁНЬНЯ НЕБЯСЬПЕЧНА…”.................................. 81

“ПРАЯВЫ АНТЫСЕМІТЫЗМУ НЕЛЬГА ЗАМОЎЧВАЦЬ…”............................................. 90

“УЛАДЫ ПРОСТА ІГНАРУЮЦЬ ПРАБЛЕМЫ РОМАЎ…” ................................................ 93

“НІХТО НЯ МОЖА ТРАПЛЯЦЬ ПАД ДЫСКРЫМІНАЦЫЮ ПАВОДЛЕ СЕКСУАЛЬНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ…” ................................................................................................ 98

ГОМАСЕКСУАЛІЗМ У ШВЕЦЫІ І СЬВЕЦЕ ................................................................ 102

“ПРАБЛЕМА АДНОСІНАЎ ДА ГОМАСЕКСУАЛІЗМУ ЗАЙМАЕ АДНО З ПЕРШЫХ МЕСЦАЎ ПА НЕТАЛЕРАНТНАСЬЦІ…” ............................................................................. 107

ГАНДАЛЬ ЗБРОЯЙ – ЗЛАЧЫННЫ ГЕНАЦЫД ............................................................. 114

ЗЬМЕСТ.......................................................................................................... 121